Голубеў В. Ф., Кітурка І. Ф.

# Гісторыя Беларусі
## ад старажытнасці да канца XVIII ст.

Санкт-Пецярбург
«Неўскі прастор»
2014

УДК 947.6(075)
ББК 63.3(4Беи)
Г62

ISBN 978-5-94716-256-1

© Голубеў В. Ф., Кітурка І. Ф., 2014.
© Афармленне. «Неўскі прастор», 2014.

# ТЭМА 1. УВОДЗІНЫ Ў ГІСТОРЫЮ БЕЛАРУСІ

Старажытнае лацінскае выслоўе гаворыць: «Historia est magistra vitae», што ў перакладзе азначае: «Гісторыя ёсць настаўніца жыцця». Сапраўды, гісторыя, асноўная задача якой заключаецца ў вывучэнні мінулага, на самой справе з'яўляецца не толькі «памяццю пра тое, што было». Гісторыя – гэта спадчына, падмурак і вопыт, абапіраючыся на якія, народы будуюць сваё далейшае жыццё.

Кожны народ павінен ведаць сваю гісторыю. Яна дазваляе чалавеку ўсвядоміць, што ён – не «рэч у сабе», а прадстаўнік пэўнага этнасу са сваімі традыцыямі, асаблівасцямі матэрыяльнай і духоўнай культуры. Менавіта гісторыя фармуе чалавека як грамадзяніна і патрыёта, выхоўвае пачуццё прыналежнасці да сваёй краіны, адказнасці за яе будучыню. Веданне і шанаванне мінуўшчыны свайго народа заўсёды з'яўлялася паказчыкам цывілізаванасці, а гістарычнае бяспамяцтва было прыкметай варварства і неразвітасці духа.

У свеце з'яўляецца натуральным, што кожны чалавек можа ацэньваць любую падзею так, як ён яе бачыць, з уласнага пункту погляду. Так і ў гісторыі – кожны народ мае права ацэньваць тое, што было раней, з пункту погляду карыснасці ці шкоднасці гэтых падзей для яго самога і яго дзяржавы.

На жаль, беларусы на працягу доўгага часу не мелі магчымасці пісаць і вывучаць гісторыю Беларусі так, як яе бачылі і адчувалі самі жыхары нашай краіны. Доўгі час нават адсутнічала паняцце «беларуская гістарыяграфія гісторыі Беларусі». Пра нас пісалі нашыя суседзі – палякі, літоўцы, рускія з якімі мы па тых ці іншых прычынах пэўны час жылі ў супольных дзяржавах. Пра Беларусь пісалі савецкія гісторыкі, якія звычайна выконвалі сацыяльны заказ пануючай партыі і пры апісанні гістарычных падзей ужывалі прынцып «сацыялістычнага рэалізму», пры якім адкідалася ўсё, што не адпавядала палітычным установкам камуністычнай партыі.

Разам з тым, вядома, што любую падзею можна апісаць так, каб яна не шкодзіла нацыянальнаму гонару, а наадварот, умацоўвала імкненне да свабоды і незалежнасці, да росту дабрабыту і паляпшэння жыцця людзей. Найлепш гэта можна зрабіць у суверэннай дзяржаве, якая валодае ўсёй паўнатой улады як ва ўнутрыпалітычнай палітыцы, так і ў знешнепалітычнай дзейнасці. Гэта разумеюць і менавіта так робяць у Еўропе і ва ўсім свеце. Беларусь таксама належыць да еўрапейскай цывілізацыі. Беларускі народ у сваім развіцці карыстаўся яе асноўнымі дасягненнямі і зрабіў свой эканамічны, палітычны і культурны ўнёсак у агульнаеўрапейскую спадчыну, і гэта мы павінны памятаць і ўлічваць як у штодзённым жыцці, так і вывучэнні сваёй гісторыі.

У сярэдзіне – канцы 1990-х гадоў, падчас другой спробы беларусізацыі ўсіх галін жыцця, у Беларусі з'явіліся працы па гісторыі краіны, аўтары якіх апісваюць гісторыю Бацькаўшчыны з пункту погляду беларусаў і імкнуцца дапамагчы чытачам разабрацца ў шматлікіх праблемах нашай мінуўшчыны. Штогод паляпшаюцца школьныя падручнікі, з якіх пастулова знікае камуністычная ідэалогія, а гістарычныя падзеі ўсё больш і больш пачынаюць асвятляцца з беларускага нацыянальнага пункту погляду.

Беларусь не малая краіна. Яна займае плошчу 207 600 кв. км. На ўсходзе Беларусь мяжуе з Расійскай Федэрацыяй, на захадзе – з Польшчай, на поўдні – з Украінай, на паўночным захадзе – з Літвой, на поўначы – з Латвіяй. Клімат на тэрыторыі Беларусі кантынентальны. Ландшафт раўнінны, прыблізна трэцяя частка тэрыторыі Беларусі пакрытая лясамі. Найвялікшыя рэкі – Дняпро, Нёман, Прыпяць, Заходняя Дзвіна.

У старажытнасці этнічная тэрыторыя, на якой жылі беларусы, была значна большая за плошчу цяперашняй Рэспублікі Беларусь. Не на ўсіх этапах гістарычнага развіцця наша краіна валодала ўсёй паўнатой дзяржаўнага суверэнітэту. Землі Беларусі ўваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі.

9 сакавіка 1918 г. было абвешчана аб стварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). У Трэцяй Устаўной грамаце Рады БНР, прынятай 25 сакавіка 1918 г. дэкларавалася, што Беларуская На-

родная Рэспубліка з'яўляецца незалежнай дзяржавай. Аднак гэтую спробу пабудовы незалежнай беларускай дзяржавы ў поўнай меры рэалізаваць не ўдалося.

1 студзеня 1919 г. была створана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР). БССР 30 снежня 1922 г. увайшла ў склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР) і знаходзілася ў складзе гэтай дзяржавы да 8 снежня 1991 г.

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце, якая паклала пачатак руху нашай краіны па шляху незалежнага развіцця. 25 жніўня 1991 г. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце быў нададзены статус Канстытуцыйнага закона.

19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет Беларускай ССР зацвердзіў назву нашай дзяржавы – Рэспубліка Беларусь, а герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг у якасці дзяржаўных сімвалаў. 14 мая 1995 г. дзяржаўная сімволіка на рэферэндуме была заменена на тую, якая існуе цяпер. Але герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг засталіся сімваламі нацыянальнымі, якія кожны беларус паважае і шануе.

Гісторыя Беларусі – навука, якая вывучае развіццё грамадства, жыццё людзей у мінулым на тэрыторыі нашай краіны.

У старажытнасці людзі жылі пры *першабытнаабшчынным* (да VIII ст. н. э.) ладзе і з яго апісання пачынаецца выкладанне матэрыялу ў вучэбным дапаможніку. У гістарычнай літаратуры першабытны лад прынята падзяляць на тры перыяды ў адпаведнасці з матэрыялам, з якога старажытныя людзі выраблялі прылады працы:

*каменны век* – 100–3 тыс. гадоў да н. э.;
*бронзавы век* – 2 тыс. да н. э. – VIII ст. да н. э.;
*жалезны век* – VII ст. да н. э. – VII ст. н. э.

Наступны перыяд мае назву Сярэднявечча (перыяд Сярэдніх вякоў). У Еўропе ў гэты час склаўся і развіваўся феадалізм.

Сярэднявечча ў Еўропе падзяляюць на тры адрэзкі часу:

VI – IX стст. – ранняе Сярэднявечча;
X – XIII стст. – высокае Сярэднявечча;
XIV – XV стст. – позняе Сярэднявечча.

На тэрыторыі Беларусі таксама вылучаюць тры перыяды Сярэднявечча:

VI (VII) – IX стст. – перыяд дафеадальнага грамадства;
X – XIII стст. – час устанаўлення феадальных адносін;
XIV – XV стст. – час росквіту феадальных адносін у Вялікім Княстве Літоўскім.

Перыяд, які пачынаецца ў Еўропе пасля Сярэднявечча называюць *Новым часам.*

Разам з тым, аўтары вучэбнага дапаможніка шырока выкарыстоўваюць перыядызацыю гісторыі Беларусі па стагоддзям. Таму перыяд пачатку Новага часу на тэрыторыі Беларусі, калі феадалізм тут дасягнуў найвышэйшага развіцця і пачаліся праяўляцца прыкметы разлажэння гэтага грамадскага ладу, вызначаны як «Беларусь у XVII–XVIII стст.»

Дадзены вучэбны дапаможнік «Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.» прызначаны для навучэнцаў пачатковых курсаў грамадскага Беларускага гуманітарнага ліцэя. У ім сцісла і паслядоўна выкладзены асноўныя моманты гісторыі Беларусі ад старажытнасці да падзелаў Рэчы Паспалітай, да ўключэння беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі. У канцы кожнай тэмы раскрываюцца асноўныя тэрміны, даецца храналогія падзей, вызначаюцца кантрольныя пытанні і заданні. Дапаможнікам могуць карыстацца ўсе, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

# ТЭМА 2. ПЕРШАБЫТНАЯ ЭПОХА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (100–35 ТЫС. ГАДОЎ ДА Н. Э. – VIII СТ. Н. Э.)

1. *Пачатак засялення чалавекам тэрыторыі Беларусі. Гаспадарчае жыццё людзей у першабытную эпоху.*
2. *Асаблівасці разлажэння першабытнага грамадства на беларускіх землях.*
3. *Духоўная культура людзей у першабытным грамадстве.*
4. *Праблема этнагенезу беларусаў.*

***1. Пачатак засялення чалавекам тэрыторыі Беларусі. Гаспадарчае жыццё людзей у першабытную эпоху.*** Першабытнае грамадства аб’ектыўна застаецца найбольш складаным перыядам у вывучэнні гісторыі любой краіны. Пры даследаванні гэтага часу фактычна адзінай крыніцай з’яўляюцца дадзеныя археалагічных раскопак, абапіраючыся на якія вучоныя спрабуюць рэканструяваць гістарычнае мінулае.

Прынята лічыць, што прарадзімай чалавека з’яўляецца Усходняя Афрыка і Паўднёвая Азія, дзе прыкладна тры мільёны гадоў таму людзі вылучыліся з жывёльнага свету. У Еўропе людзі з’явіліся значна пазней, каля 600 тыс. гадоў назад.

Ледавікі ў старажытнасці пакрывалі і тэрыторыю сучаснай Беларусі. Магчыма, што першыя насельнікі з’явіліся тут пасля адыходу буйнога валдайскага абледзянення ў прамежку каля 100–40 тыс. гадоў да н. э. Пра гэта сведчаць грубаабабітыя каменныя прылады працы, знойдзеныя археолагамі каля вёсак *Абідавічы* Быхаўскага раёна і *Свяцілавічы* Веткаўскага раёна. Як лічаць вучоныя, крамянёвыя скрэблы, востраканечнікі і ручныя рубілы маглі быць зроблены *неандэртальцамі.* Неандэртальцы з’яўляліся непасрэднымі папярэднікамі сучаснага чалавека, але па знешнім выглядзе яшчэ значна ад яго адрозніваліся: мелі моцна развітае надброўе, шырокія

насавыя адтуліны, наяўны патылічны валік, даволі валасатае цела і інш.

Больш упэўнена можна сведчыць, што засяленне тэрыторыі Беларусі адбылося 40–30 тыс. гадоў таму. Археолагамі выяўлены добра захаваныя стаянкі першабытных людзей каля вёсак *Юравічы* Калінкавіцкага раёна і *Бердыж* Чачэрскага раёна. Час узнікнення гэтых стаянак – адпаведна 26 тыс. гадоў і 23,5 тыс. гадоў да н. э. Іх насельнікі ўжо былі людзьмі сучаснага антрапалагічнага тыпу – *краманьёнцамі*. Яны валодалі тэхнікай пласцінчатай апрацоўкі крэменю і выраблялі больш дасканалыя і разнастайныя, у параўнанні з неандэртальцамі, прылады працы, такія як нажы, сякеры, разцы і інш.

Перыяды пацяплення на тэрыторыі Беларусі змяняліся часамі пахаладання, але такія цяжкія ўмовы толькі загартоўвалі першабытных людзей, вымушалі іх прыстасоўвацца да навакольнага асяроддзя, вынаходзіць новыя спосабы здабычы ежы, што ў выніку садзейнічала развіццю іх інтэлекту.

Поўнаму засяленню тэрыторыі Беларусі першабытным чалавекам спрыялі прыродна-кліматычныя ўмовы, якія ўсталяваліся пасля канчатковага адыходу ледавіка, прыкладна 14–12 тыс. гадоў таму: вільготны клімат, багаты раслінны і жывёльны свет і, як спадчына ледавіковай эпохі, вялікая колькасць рэк і азёр. Археолагамі знойдзена і даследавана звыш за 60 стаянак таго часу.

Абавязковай умовай, якая першапачаткова забяспечыла эвалюцыю чалавека, была наяўнасць каля стойбішча старажытных людзей не толькі вады і жывёлы – аб'ектаў палявання, але і камянёў, якія падыходзілі для вырабу прылад працы. Камяні выкарыстоўваліся і ў якасці матэрыялу для пабудовы першабытных жытлаў, выкладкі ачагоў. Пры дапамозе двух камянёў чалавек навучыўся высякаць агонь і тым самым авалодаў адной з прыродных стыхій.

Таму, згодна з археалагічнай перыядызацыяй, першы перыяд станаўлення і развіцця чалавека невыпадкова называецца *каменным векам*. Для тэрыторыі Беларусі ён датуецца 100–3 тыс. гадоў да н. э. У адпаведнасці з матэрыялам, з якога старажытныя людзі выраблялі прылады працы, вучоныя выдзяляюць яшчэ два перыя-

ды першабытнага грамадства: *бронзавы век* (2 тыс. да н. э. – VIII ст. да н. э.) *і жалезны век* (VII ст. да н. э. – VII ст. н. э.).

***Каменны век*** з'яўляўся самым працяглым па часе, і для лепшага вывучэння гэты перыяд прынята падзяляць на:

- *палеаліт* (ранні каменны век – 100–10 тыс. гадоў да н. э.);
- *мезаліт* (сярэднекаменны век – 9–5 тыс. гадоў да н. э.);
- *неаліт* (новы каменны век – канец 5–3 тыс. да н. э.).

***Палеаліт.*** Жыццё чалавека ў першабытную эпоху ўпрост залежала ад забяспечанасці харчаваннем. Самым старажытным, найпрасцейшым і трывалым відам гаспадарчай дзейнасці людзей з'яўлялася *збіральніцтва.* З дапамогай прымітыўных прылад працы – палкі-капалкі, рога жывёлы людзі здабывалі розныя карэнні і расліны. Збіральніцтва не патрабавала ад чалавека спецыяльных навыкаў, але і не заўсёды магло забяспечыць яго неабходнай колькасцю ежы. Таму ў працэсе эвалюцыі і барацьбы за існаванне чалавек па сутнасці стаў драпежнікам, і галоўную ролю ў яго жыцці пачало адыгрываць *паляванне.*

Паляванне было больш складаным відам гаспадарчай дзейнасці, патрабавала ад чалавека стварэння прынцыпова іншых прылад працы, а таксама вывучэння звычак звяроў, умення на практыцы прымяняць атрыманыя веды. Згодна з дадзенымі археалагічных раскопак, на працягу ўсяго ранняга каменнага веку людзі на тэрыторыі сучаснай Беларусі палявалі на буйных звяроў, у прыватнасці, на маманта. Паляванне на гэтую жывёлу, дарослая асоба якой важыла каля трох тон, для першабытнага чалавека было справай няпростай і небяспечнай. Людзі ўжывалі так званую *загонна-аблаўную сістэму палявання*, калі з дапамогай крыкаў і агню імкнуліся загнаць маманта ў загадзя падрыхтаваную яму-пастку. Але нават патрапіўшы ў яе мамант уяўляў вялікую пагрозу для чалавека, паколькі яго біўні па памерах значна перавышалі прымітыўную зброю людзей. Аднак пры станоўчым выніку палявання спажыванне маманта фактычна было безадходным: яго мяса і тлушч выкарыстоўваліся ў ежу, а косці і скура – для будаўніцтва жытла, вырабу вопраткі, абутку і прылад працы.

Гаспадарчая дзейнасць чалавека ў першабытным грамадстве насіла калектыўны характар, паколькі адзін чалавек не мог забяспечыць сябе сродкамі харчавання, абараніцца ад драпежнікаў і супрацьстаяць прыродным стыхіям. Як лічаць вучоныя, першым чалавечым калектывам з'яўлялася *праабшчына,* або *першабытны чалавечы статак*, які складаўся з 20–30 чалавек на чале з правадыром. Храналагічна праабшчына на тэрыторыі Беларусі існавала ў перыяд 100 тыс. гадоў да н. э. – 35 тыс. гадоў да н. э.

Эвалюцыя гаспадарчых адносін, удасканаленне прылад працы прывялі да зменаў і ў грамадскім ладзе: прыкладна 35 тыс. гадоў да н. э. пачалі ўтварацца парныя саюзы, якія складалі *родавую абшчыну*. Чалавек стаў ператварацца ў сацыяльную істоту, члена родавага і вытворчага калектыву. *Род* – калектыў кроўных родзічаў, які вёў сваё паходжанне па адной лініі і меў агульную маёмасць. Для першабытнага грамадства праца была абавязковым і неабходным сродкам выжывання, прычым назіраўся яе *пола-ўзроставы падзел*, калі гаспадарчыя абавязкі размяркоўваліся паміж членамі роду ў залежнасці ад полу і ўзросту. Нягледзячы на тое, што ў гаспадарчым жыцці галоўная роля належала мужчыну-паляўнічаму, на чале роду першапачаткова стаяла жанчына, паколькі пры неўпарадкаваных шлюбных адносінах роднасць можна было вызначыць толькі па жаночай лініі. Гэты перыяд у развіцці грамадства атрымаў назву *матрыярхат*. Унутры роду існавала *экзагамія* – жорсткая забарона шлюбных сувязяў паміж членамі роду.

***Мезаліт.*** Асноўнымі заняткамі першабытных людзей у перыяд палеаліту і мезаліту былі збіральніцтва, паляванне і рыбалоўства. Яны складалі аснову *прысвойваючай гаспадаркі*, пры якой людзі нічога не выраблялі самі, а ўжывалі толькі тое, што давала ім прырода.

З пачаткам мезаліту ледавік канчаткова адступіў і на тэрыторыі сучаснай Беларусі ўсталяваўся клімат, блізкі да цяперашняга, што натуральна прывяло да зменаў у флоры і фауне. Чарговы раз прырода ўнесла карэктывы і ў гаспадарчую дзейнасць людзей. Зніклі маманты, на якіх людзі палявалі дзесяткі тысяч гадоў, і з'явіліся новыя віды звяроў і птушак, а значыць, узнікла неабходнасць по-

шуку новых метадаў палявання і вырабу больш дасканалай зброі. Галоўным вынаходніцтвам чалавека ў гэты час становіцца першае механічнае прыстасаванне – *лук і стрэлы*.

У час мезаліту людзі пачалі вырабляць так званыя *мікраліты* – дробныя дэталі састаўных прылад працы, зробленыя з крэменю. Мікраліты звычайна ўстаўляліся ў пазы касцяных ці рагавых апраў, у дрэўкі стрэл і наканечнікі дзідаў, складалі лёзы кінжалаў, шыпы гарпуноў.

Знікненне мамантаў пазбавіла чалавека галоўнай крыніцы харчавання і тым самым павялічыла вагу іншых гаспадарчых заняткаў, у першую чаргу *рыбалоўства*. Вядома, што ў перыяд мезаліту людзі на тэрыторыі Беларусі для рыбнай лоўлі выкарыстоўвалі розныя прыстасаванні: кручкі, гарпуны, плеценыя з лыка сеткі і інш. Акрамя таго, рыбалоўства садзейнічала ўзнікненню аселага ладу жыцця, паколькі людзям не трэба было пераходзіць з месца на месца ў пошуках здабычы, як гэта рабілі паляўнічыя. На карысць гэтай думкі сведчаць знаходкі каменных сякер з драўлянай ручкай, якія, хутчэй за ўсё, выкарыстоўваліся людзьмі пры будаўніцтве жытлаў.

Верагодна, што менавіта ў мезаліце адбыліся змены і ў грамадскім жыцці людзей – з'явіліся першыя племянныя супольнасці. Яны ўзніклі ў выніку аб'яднання некалькіх экзагамных родаў, звязаных агульнасцю паходжання, тыпам гаспадарчых заняткаў, звычаяў і абрадаў. Разам з тым існаваў звычай *эндагаміі*, калі шлюбныя адносіны дазваляліся толькі ўнутры вызначанай племяннай супольнасці.

***Неаліт*** стаў якасна новым этапам у жыцці старажытных людзей, які характарызаваўся пераходам ад прысвойваючай да *вытворчай гаспадаркі* – людзі пачалі займацца земляробствам і жывёлагадоўляй. І хоць напачатку доля іх прадукцыі ў рацыёне чалавека была невялікая і ў перыяд неаліту па-ранейшаму панавала прысвойваючая гаспадарка, усё ж, дзякуючы земляробству і жывёлагадоўлі, у людзей упершыню з'явілася магчымасць нарыхтаваць ежу пра запас. Гэта ўнесла пэўныя змены ва ўзаемаадносіны чалавека з навакольным асяроддзем, пазбавіла яго безумоўнай залежнасці ад прыроды. У першабытных людзей з'явіўся вольны

час, і яны атрымалі магчымасць выкарыстоўваць яго для далейшага ўдасканалення гаспадаркі.

Для таго, каб займацца земляробствам, патрабаваліся новыя прылады працы, у сувязі з чым павялічылася патрэба ў высакаякаснай сыравіне – крэмені. У неаліце пачалася шахтавая здабыча крэменю. Старажытныя шахты на тэрыторыі Беларусі выяўлены каля пасёлка *Краснасельскі* (Гродзенская вобл.). Даследаванне вучонымі гэтага археалагічнага помніка дазволіла ўявіць карціну далёкага мінулага і высветліць, што старажытныя шахцёры здабывалі крэмень спецыяльным наборам гарняцкіх інструментаў, зробленых пераважна з рагоў высакароднага аленя. У гэты час людзі авалодалі новай тэхналогіяй апрацоўкі крэменю – шліфаваннем. У выніку з'явіліся высакаякасныя прылады працы: нажы і кінжалы, скрабкі, праколкі, свердзелы, разцы, долаты, сякеры і інш.

Важным вынаходніцтвам чалавека ў перыяд неаліту стаў выраб *глінянага посуду (керамікі)*, у якім можна было захоўваць зерне, арэхі і ягады, гатаваць ежу на вогнішчы. Першыя керамічныя гаршкі найчасцей ляпіліся з шырокіх гліняных стужак, а звонку абмазваліся моцнаразбаўленай глінай. Для большай устойлівасці дно такога посуду звычайна рабілася завостраным. Ужыванне прыгатаванай ежы спрыяла павелічэнню працягласці жыцця людзей, а выкарыстанне новых інтэнсіўных формаў гаспадарання абумовіла хуткі рост насельніцтва (на тэрыторыі Беларусі археолагамі выяўлена больш за 600 неалітычных стаянак).

Такім чынам, у час неаліту адбыліся якасныя карэнныя змены ў развіцці першабытнай гаспадаркі. Шахтавая здабыча крэменю, новыя тэхнікі ў вытворчасці прылад працы, выраб глінянага посуду і тканага адзення, а галоўнае – паступовы пераход да земляробства і жывёлагадоўлі далі вучоным падставы характарызаваць гэты перыяд як «*неалітычную рэвалюцыю*».

***Бронзавы век*** першым перыядам у гісторыі чалавецтва, калі людзі пачалі апрацоўваць метал. Бронза – гэта сплаў медзі і волава. Узнікненне і актыўнае пашырэнне металургіі садзейнічала актывізацыі абмену, у першую чаргу, металічнымі вырабамі, а таксама якасным крэменем і бурштынам.

У бронзавым веку вытворчая гаспадарка пачала адыгрываць дамінуючую ролю, у сувязі з чым земляробства і жывёлагадоўля паступова станавіліся галоўнымі заняткамі людзей, прычым удзельная вага жывёлагадоўлі была больш значная. З прычыны недахопу на тэрыторыі Беларусі медзі і бронзы прылады працы па-ранейшаму рабілі з каменя, а метал выкарыстоўваўся пераважна для вырабу зброі і ўпрыгажэнняў.

Адбыліся значныя змены і ў грамадскім жыцці людзей. Ужо ў перыяд ранняга бронзавага веку пачала ўзрастаць роля мужчыны ў жыцці абшчыны. Працай мужчын ствараліся пастаянныя харчовыя запасы, што садзейнічала ўтварэнню вялікіх патрыярхальных сем'яў і складванню патрыярхальна-родавага ладу (*патрыярхату*). Развіццё вытворчасці прывяло да ўзнікнення прыватнай уласнасці, замены родавай абшчыны *суседска-родавай*, усталявання патрыярхальнага рабства і зараджэння падзелу грамадства на класы.

Адметнай рысай эпохі бронзы было пранікненне на тэрыторыю Беларусі народаў *індаеўрапейскай* моўнай групы. Індаеўрапейцы добра ведалі жывёлагадоўлю і земляробства, валодалі навыкамі металургічнага майстэрства.

«Прарадзіма» індаеўрапейцаў, на думку большасці вучоных, знаходзілася ў Пярэдняй Азіі. У выніку вялікай міграцыі (у 4–3 тыс. да н. э.) індаеўрапейцы сталі рассяляцца па тэрыторыі Еўропы і змешвацца з карэнным (аўтахтонным) насельніцтвам, у выніку чаго яны набылі адметныя рысы і паклалі пачатак утварэнню многіх народаў – германцаў, балтаў, славян і інш.

Першымі плямёнамі індаеўрапейскай моўнай групы, якія пранiклі на тэрыторыю Беларусі і часткова асімілявалі, а часткова выцеснілі з яе карэннае, хутчэй за ўсё фіна-ўгорскае насельніцтва, былі *балты* (продкі сучасных літоўцаў, латышоў і існаваўшых у старажытнасці прусаў і яцвягаў). У бронзавым веку землі сучаснай Беларусі былі заселены плямёнамі некалькіх *археалагічных культур*, якія займалі акрэслены рэгіён і адрозніваліся паміж сабой спосабамі вырабу прылад працы, керамічнага посуду, жыллёвых пабудоў, пахавальных абрадаў: культура *шнуравой керамікі ці*

*культуры баявых сякер, сярэднедняпроўская, тшцінецка-соснінская* культуры і інш.

***Жалезны век.*** Адкрыццё жалеза старажытнымі людзьмі з’явілася пачаткам вялікага тэхнічнага перавароту ў гісторыі чалавецтва. Пашырэнню чорнай металургіі на землях Беларусі спрыялі даступнасць сыравіны і адносна нескладаная тэхналогія атрымання жалеза, якое здабывалі з балотнай і азёрнай руды. З’яўленне і выкарыстанне жалеза значна паўплывала на характар матэрыяльнай культуры і гаспадаркі. У першую чаргу, жалеза стала якасна новым матэрыялам для вырабу прылад працы: з’явіліся жалезныя сякеры з драўляным тапарышчам, матыкі, ралы, што садзейнічала пераходу ад матыкавага да *лядна-агнявога земляробства*.

Гэта была цэлая сістэма гаспадарання, якая патрабавала ад чалавека цяжкай і напружанай працы. Неабходна было высекчы лес, выкарчаваць пні, высахлыя дрэвы спаліць, а попел выкарыстаць у якасці ўгнаення. Зямельная дзялянка, прыгодная для сяўбы, называлася *ляда.* Але такая зямля магла пладаносіць толькі на працягу трох-чатырох гадоў, таму людзі вымушаны былі адначасова распрацоўваць некалькі дзялянак. Нягледзячы на тое, што такі спосаб гаспадарчай дзейнасці патрабаваў ад чалавека значных высілкаў, ён прыносіў большыя ўраджаі і, як следства, большую, чым у папярэдні перыяд, незалежнасць ад вынікаў прысвойваючай гаспадаркі.

З другога боку, павелічэнне колькасці прадуктаў харчавання спрыяла росту насельніцтва, і таму натуральна, што ў жалезным веку пачалася барацьба паміж родамі і плямёнамі за лепшыя землі. Гісторыя паказвае, што чалавечая думка эвалюцыяніравала не толькі ў напрамку ўдасканалення прылад працы, але і зброі, якая з вынаходніцтвам жалеза стала прынцыпова новай і высакаякаснай для таго часу: дзіды і стрэлы з жалезнымі наканечнікамі, баявыя жалезныя сякеры і інш. З мэтай абароны ў гэты перыяд старажытныя людзі пачалі будаваць умацаваныя паселішчы – *гарадзішчы*. Гарадзішча звычайна займала плошчу ад 5 да 20 сотак. Вакол яго выкопвалі равы і насыпалі валы, на якіх рабілі сцены з бярвёнаў. Сярэдзіну гарадзішча займалі жылыя і гаспадарчыя пабудовы.

Разам са з’яўленнем жалезных прыладаў працы і паляпшэннем апрацоўкі зямлі знікла неабходнасць весці гаспадарку цэлым родам, гэта ўжо магла рабіць асобная сям’я. Такім чынам, на змену суседска-родавай абшчыне прыйшла *суседская (тэрытарыяльная)* абшчына. Ад удзелу ў сельскагаспадарчых работах вызваляліся старэйшыны і правадыры, якія з цягам часу здолелі сканцэнтраваць у сваіх руках агульнаабшчынную ўласнасць.

Так, у жалезным веку пачалося разлажэнне першабытных адносін. Сталі ўтварацца новыя саюзы плямён, якія аб’ядноўваліся на падставе ўжо не родасных сувязяў, а тыпу гаспадаркі.

***2. Асаблівасці разлажэння першабытнага грамадства на беларускіх землях.*** Перыяд разлажэння першабытнага грамадства на беларускіх землях вучоныя датуюць VI–VIII ст. н. э. і звязваюць яго з так званым «вялікім перасяленнем народаў» і прыходам на тэрыторыю Беларусі славянскіх плямёнаў.

У выніку перасялення адбылося паглыбленне маёмасна-сацыяльнага расслаення, ваенна-племянная вярхушка памнажала свае багацці. Апорай рода-племянной арыстакратыі станавілася дружына – аб’яднанне прафесійных воінаў, якія страцілі сувязь са сваімі родамі. У выніку сфарміравалася своеасаблівая арганізацыя грамадства, якая атрымала назву «*ваенная дэмакратыя*». Яна кіравалася *ваенным правадыром*, *саветам старэйшын* і *народным сходам*. Час ваеннай дэмакратыі характарызаваўся несупыннымі міжпляменнымі войнамі. Ваенная дэмакратыя была формай пераходнага перыяду да класавага грамадства і ўтварэння дзяржавы.

У гэты час адбыліся важныя змены ў гаспадарчым жыцці насельніцтва. Галоўным заняткам жыхароў Старажытнай Беларусі стала сельская гаспадарка, а яе вядучай галіной – земляробства. Лядна-агнявое земляробства пачало выцясняцца ворыўным, якое было заснавана на выкарыстанні больш дасканалых прылад працы (металічных наральнікаў, насошнікаў, сярпоў і інш.), прымяненні арганічных угнаенняў, усталяванні паравай сістэмы ў форме *двухполля*. Асноўнай сельскагаспадарчай культурай па-ранейшаму было жыта. Пры такой сістэме земляробства, у адрозненне ад ляд-

на-агнявой, адпала неабходнасць штогод высякаць і карчаваць новыя лясныя дзялянкі, праца значна палегчылася, а ўраджайнасць павялічылася.

Важную ролю ў гаспадарчым жыцці чалавека адыгрывала жывёлагадоўля, якая забяспечвала земляробства цяглавай сілай і ўгнаеннямі, людзей – мясам, воўнай, скурамі. Вядома таксама, што буйная рагатая жывёла станавілася прыкметай багацця і эквівалентам абмену.

У перыяд разлажэння першабытнага грамадства разам з удасканаленнем гаспадарчай сістэмы на новы ўзровень узнялося *рамяство*. Узніклі новыя тэхналогіі ў апрацоўцы металаў, дрэва, будаўніцтве жылля і г. д., з'явіліся прафесійныя рамеснікі.

Яшчэ адной асаблівасцю VII–VIII ст. н. э. было суіснаванне розных эканамічных укладаў:

- *першабытны ўклад* захоўваўся ў трывалым існаванні сялянскай абшчыны;
- *рабаўладальніцкі ўклад* праяўляўся ў існаванні рабоў (у асноўным ваеннапалонных), але не атрымаў на землях Беларусі класічнага развіцця;
- *феадальны ўклад,* які стаў дамінуючым на працягу амаль тысячагоддзя.

Гаспадарка, пры якой даволі працяглы час суіснавалі некалькі эканамічных укладаў, атрымала назву *шматукладнай*.

У перыяд разлажэння першабытных адносін на тэрыторыі Беларусі адбыўся пераход да феадалізму, мінуючы рабаўладальніцтва. Вывучаючы гэты феномен гістарычнага развіцця Беларусі, вучоныя вызначылі некалькі прычын.

1. Найперш, гэта *кліматычныя* і *геаграфічныя* асаблівасці Беларусі. Класічнае рабства, пры якім раб не меў ніякай уласнасці, знаходзіўся на поўным утрыманні рабаўладальніка і быў фактычна яго «гаворачай прыладай працы», развівалася ў краінах з гарачым кліматам, дзе выдаткі на ўтрыманне раба былі мізэрныя. Ва ўмовах Беларусі са зменамі пораў года, калі зімой трэба было карміць фактычна непрацуючага раба, рабства было эканамічна неэфектыўным.

2. Наяўнасць на тэрыторыі Беларусі вялікай колькасці свабодных зямель рабіла больш эфектыўным выкарыстанне працы сялян-абшчыннікаў, якія, у адрозненне ад рабоў, забяспечвалі сябе ўсім неабходным і былі зацікаўлены ў выніках сваёй працы.

3. Да таго ж эканамічнае развіццё Заходняй Еўропы да канца I тысячагоддзя н. э. паказала эканамічную неперспектыўнасць рабаўладальніцтва ў параўнанні з феадалізмам.

Падводзячы вынікі развіцця першабытнаабшчыннага грамадства, неабходна акрэсліць яго характэрныя рысы:

- жыццё людзей абшчынамі;
- наяўнасць калектыўнай уласнасці на прылады і вынікі працы;
- падзел працы па полу і ўзросту;
- панаванне прысвойваючай гаспадаркі;
- наяўнасць прымітыўных прылад працы.

***3. Духоўная культура людзей у першабытным грамадстве.*** Ужо ў эпоху палеаліту развіццё інтэлекту і з'яўленне чалавека разумнага спрыяла таму, што ў старажытных людзей узнікла неабходнасць разабрацца ў навакольным свеце, высветліць сваё месца ў ім, даведацца пра прыродныя з'явы, пра тое, што азначае сон. Так узніклі першабытнае мастацтва і рэлігійныя вераванні.

**Рэлігія** – гэта светапогляд і светаадчуванне, а таксама спецыфічныя дзеянні (культ), заснаваныя на веры ў звышнатуральныя сілы. Найбольш раннімі формамі першабытнай рэлігіі з'яўляліся:

- *татэмізм* – вераванні, звязаныя з уяўленнем пра роднасць паміж групай людзей (родам) і татэмам (пэўным відам жывёл ці раслін). Татэмы аберагалі, не прычынялі ім шкоды, клапаціліся пра павелічэнне іх колькасці. Род звычайна насіў імя татэмнай жывёлы ці птушкі;
- *фетышызм* – вера ў звышнатуральныя ўласцівасці прыродных (камяні, дрэвы) або зробленых чалавекам неадушаўлёных прадметаў (фетышаў) і пакланенне ім. Старажытныя людзі насілі амулеты, першымі з якіх былі зубы забітых жывёл. Людзі верылі ў тое, што фетышы маюць здольнасць вы-

лечваць ад хваробы, аберагаць падчас палявання і вайны, ахоўваць жытло, поле і г. д.;
- *магія (чараўніцтва)* – абрады, таямнічыя дзеянні, загаворы і заклінанні з мэтай паўплываць на істоты, прадметы і з'явы навакольнага свету. Магія падраздзялялася на лячэбную (знахарства), ваенную, сельскагаспадарчую, любоўную і інш. Па мэтавай накіраванасці выдзяляюць таксама белую і чорную магію;
- *анімізм* – сістэма ўяўленняў і вераванняў аб духах і душы. Вера першабытных людзей у тое, што душа пасля смерці чалавека не памірае, а жыве асобна ад цела, прывяла да ўзнікнення пахавальных абрадаў. У курганы-могільнікі разам з целамі продкаў людзі клалі прылады працы, посуд, адзенне і іншыя рэчы, каб душа памерлага мела магчымасць карыстацца імі ў замагільным жыцці.

У першабытным грамадстве ўзнікла і вера ў добрых і злых духаў, якія нібыта насялялі навакольнае асяроддзе і жылі побач з чалавекам: вадзяніка, лесавіка, хатніка, ваўкалака, русалку і інш. Каб іх задобрыць добрых і злых духаў, першабытныя людзі звычайна прыносілі ім ахвяры. Існавалі спецыяльныя свяцілішчы – *капішчы*, якія вядомы на землях Беларусі з эпохі бронзы. Яны ўяўлялі сабой пляцоўкі круглай формы, у цэнтры якіх размяшчалі *ідала* і месца для вогнішча.

**Мастацтва.** У сувязі з адсутнасцю на тэрыторыі Беларусі горных масіваў тут не маглі з'явіцца, як у іншых еўрапейскіх краінах, наскальныя роспісы або выявы на сценах пячор. Даступнымі матэрыяламі для першабытных мастакоў былі камень, дрэва і косць.

Першымі і найбольш распаўсюджанымі мастацкімі вырабамі, вядомымі на землях Беларусі, былі касцяныя фігуркі жанчын, празваныя «палеалітычнымі Венерамі». Існуе некалькі гіпотэз наконт іх прызначэння:
- некаторыя лічаць, што яны былі характэрнымі для перыяду матрыярхату і адлюстроўвалі адзіную прарадзіцельку, сімвалізавалі адзінства кроўнай сувязі членаў роду;

- другія сцвярджаюць, што фігуркі выконвалі магічную ролю і спрыялі паспяховаму паляванню;
- іншыя мяркуюць, што «палеалітычныя Венеры» былі помнікамі культу звышнатуральнай усемагутнай істоты, погляду якой баяліся, і таму яе выявы рабілі без твару.

З развіццём грамадскіх адносін змянялася і мастацтва. Адлюстраваннем узрастання ролі мужчыны ў паўсядзённым жыцці стала тое, што ў неаліце сустракаліся ўжо выключна мужчынскія выявы на косці, а таксама на посудзе. Выявы на кераміцы спалучалі эстэтычныя і магічныя функцыі. Як лічаць вучоныя, *радыяльныя* ўзоры на донцах сведчылі аб пакланенні Сонцу; *трохвугольнікі* на гліняных вырабах маглі сімвалізаваць як багіню неба, так і быць знакам зямлі; арнамент у выглядзе *паўкругоў з кропкамі* мог азначаць зерне, якое акрапляецца нябеснай вільгаццю. Сярод археалагічных знаходак былі таксама шырока распаўсюджаны касцяныя і драўляныя фігуркі птушак і жывёлы: лося, качкі, чаплі і інш.

З развіццём металургіі з’явіліся новыя мастацкія вырабы з медзі і бронзы: падвескі, скроневыя кольцы, бранзалеткі і інш. Нярэдкімі былі ўпрыгажэнні з бурштыну, косці, каляровых камянёў. Хутчэй за ўсё, у бронзавым веку ўпрыгажэнні пачалі губляць магічны сэнс і ўсё больш набывалі эстэтычныя і сацыяльныя функцыі.

Мастацтву жалезнага веку была характэрна *салярная арнаментыка* (малюнкі Сонца). Бронзавыя жаночыя падвескі, якія выраблялiся ў форме месяцовага сярпа, называліся «*лунніцамі*».

***4. Праблема этнагенезу беларусаў.*** Важным пытаннем гісторыі любога народа з’яўляецца праблема яго паходжання – *этнагенезу*. Этнагенез заключае ў сабе як пачатковыя этапы ўзнікнення якога-небудзь народа, так і далейшае фармаванне яго этнаграфічных, лінгвістычных і антрапалагічных асаблівасцяў. Ключавым паняццем у гэтым працэсе з’яўляецца *этнас* (ад грэч. ethnos – племя, народ) – устойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, побыту, культуры, рысаў псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзі-

най назве і ўяўленні пра агульнасць паходжання. Асноўнымі гістарычнымі формамі этнасу з'яўляюцца *племя, народнасць, нацыя*.

Пытанне аб этнічнай аснове беларускага насельніцтва застаецца дыскусійным і канчаткова нявырашаным. Сёння існуе некалькі канцэпцый паходжання беларусаў. Фактычна ўсе яны прызнаюць, што вызначальным момантам у фармаванні беларускага этнасу стала засяленне тэрыторыі Беларусі, як і значнай часткі Еўропы, славянскімі плямёнамі на рубяжы VI–VII ст. н. э. Гэты працэс у гісторыі атрымаў назву *«Вялікае перасяленне народаў»*. Варыятыўнасць канцэпцый абумоўлена ў асноўным дыскусіяй пра ўзаемаадносіны славян з іншымі плямёнамі на беларускіх землях і ступенню іх уплыву на этнагенез беларусаў.

Праблема этнагенезу беларусаў была ў пэўнай меры прадметам дыскусіі як у навуцы, так і ў палітыцы. Гэта не выпадкова, паколькі гістарычная прыналежнасць і нацыянальная самаідэнтыфікацыя заўсёды знаходзіліся ў аснове палітычнай свядомасці. З гэтай прычыны ўзнікалі канцэпцыі, якія грунтаваліся не на навуковых фактах, а на пажаданнях ці меркаваннях, і, як правіла, ствараліся пад зараней вызначаныя палітычныя дактрыны і таму мелі палітычны, а не навуковы характар.

***Вялікаруская канцэпцыя.*** Гэтая тэорыя мела статус афіцыйнай у XIX ст., а таксама ў савецкі час. Адным з яе асноўных аўтараў з'яўляецца *М. В. Каяловіч* (1828–1891). Згодна з яго поглядамі, расійскі народ складаецца з трох плямёнаў: *вялікаросаў* (рускіх), *маларосаў* (украінцаў) і *беларусаў*. Таму, на думку М. В. Каяловіча, «бязглузда было б дзяліцца на племянныя групы, а тым больш праводзіць гэты падзел у народ. Гэта псавала б расійскае народнае адзінства і перашкаджала б развіццю простага народу ў кожнай племяннoй групе... Толькі ў адзінстве з Усходняй Расіяй любоў да Беларусі можа мець законнае і плённае выяўленне».

Такім чынам, у адпаведнасці з гэтай канцэпцыяй, ігнаравалася існаванне самабытнага беларускага этнасу, а тэрыторыя Беларусі прызнавалася часткай вялікарускай тэрыторыі, законнай спадчынай кіеўскіх і маскоўскіх князёў, расійскіх імператараў, што ў пэўнай ступені апраўдвала ўключэнне беларускіх зямель у склад

Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

Згаданая тэорыя аспрэчваецца сёння многімі вучонымі, паколькі гістарычныя крыніцы сведчаць, што ніколі не існавала старажытнарускага народа, які б падзяліўся на беларусаў, украінцаў і рускіх. На самай справе існавалі старажытнаславянскія протанароды, якія склаліся ў самастойныя этнасы, кожны з якіх пайшоў сваім гістарычным шляхам.

***Тэорыя «балцкага субстрату»*** разглядае этнагенез беларусаў праз прызму *асіміляцыі* (змешвання) славянскага і балцкага насельніцтва. Яе аўтары *В. Сядоў* і *Г. Штыхаў* лічаць, што паколькі славяне знаходзіліся на больш высокім узроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця, чым балты, то апошнія хутчэй пераймалі славянскія звычаі, спосаб вядзення гаспадаркі і вайны, што ў выніку прывяло да *славянізацыі балтаў*.

Гэтая канцэпцыя паходжання беларусаў атрымала назву «балцкай» або тэорыі «балцкага субстрату». Сутнасць яе заключаецца ў тым, што ў выніку славянізацыі балцкага насельніцтва і змешвання з ім прышлых носьбітаў славянскай мовы на тэрыторыі Беларусі намецілася аддзяленне часткі ўсходнеславянскай народнасці, што садзейнічала затым станаўленню беларускай мовы і фармаванню беларускага этнасу.

Існуе шэраг дадзеных, якія сведчаць, што антрапалагічны тып славянскіх плямён крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў сфармаваўся ў выніку змяшэння і своеасаблівага сімбіёзу славян з балтамі. Менавіта пад уплывам балцкіх дыялектаў на тэрыторыі паміж вярхоўямі Дняпра і Нёмана, ад Дзвіны да Прыпяці пачалі выпрацоўвацца фанетычныя асаблівасці беларускай мовы – «аканне», «дзеканне», «цэканне», цвёрды «р» і інш. Пра колішнюю сувязь гэтых народаў сведчаць вядомыя толькі на этнічна беларускіх і літоўскіх землях агульныя культы змяі і каменя, старажытныя песні з агульнымі матывам і зместам і інш.

Крытыкі гэтай канцэпцыі адзначаюць, што В. Сядоў не ўлічыў таго, што многія адзначаныя ім своеасаблівасці беларускага этнасу ўласцівы як славянам, так і балтам. Балты, як і славяне, інда-

еўрапейскага паходжання і з'яўляюцца продкамі не непасрэдна беларусаў, а ўсходнеславянскіх супольнасцяў крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў.

***Крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкая канцэпцыя.*** Яе аўтары сцвярджалі, што асновай беларускага этнасу непасрэдна сталі славянскія плямёны крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў, якія засялілі беларускія землі ў канцы VI–VII ст. н. э. Славянскія плямёны не ўступалі ў этнічны кантакт з балтамі, а проста выцеснілі іх з тэрыторыі Беларусі. Такім чынам згодна з гэтай тэорыяй продкамі беларусаў былі «чыстыя» славяне, а балцкі элемент не прысутнічаў у этнагенезе беларусаў.

Але дадзеныя археалагічных раскопак падаюць шматлікія прыклады балта-славянскага збліжэння на беларускіх землях, што праяўлялася ў адметных жаночых упрыгажэннях, керамічных вырабах, прыладах працы.

Разам з тым нельга не адзначыць надзвычай высокую ролю крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў у складванні беларускага этнасу. Вучоныя даказваюць, што ў той час, калі яны прыйшлі на тэрыторыю Беларусі, гэта ўжо былі не плямёны і нават не саюзы плямёнаў, а ўстойлівыя сацыяльна-культурныя супольнасці, якія сфармаваліся стыхійна і былі па сутнасці протанародамі. Усе яны, хутчэй за ўсё, уяўлялі сабой асобныя этнічныя супольнасці, а некаторыя з іх (крывічы) сваёй высокай культурай, палітычнай і сацыяльнай арганізацыяй зрабілі вызначальны ўплыў на фармаванне беларускага этнасу.

Акрамя пералічаных канцэпцый паходжання беларусаў, існуе шэраг іншых: ***крывіцкая***, паводле якой продкамі беларусаў з'яўляюцца пераважна крывічы; ***фіна-ўгорская***, якая прызнае фіна-ўгорскі кампанент у фармаванні беларускага этнасу; ***старажытнаруская***, згодна з якой у IX–X ст. сфармавалася новая этнічная супольнасць – старажытнаруская народнасць, з якой і ўтварыліся тры роднасныя народы: рускі, беларускі і ўкраінскі.

Такім чынам, наяўнасць шэрагу розных, нават супрацьлеглых канцэпцый паходжання беларускага этнасу сведчыць пра складанасць дадзенага пытання і неабходнасць яго далейшага даследавання.

## Асноўныя прыкметы беларускага этнасу

1. *Этнічная тэрыторыя.* Фармаванне беларускага этнасу праходзіла на тэрыторыі, якая значна перавышала межы сучаснай Беларусі і ўключала ў сябе таксама Віленшчыну, Беласточчыну, Смаленшчыну, Заходнюю Браншчыну.

2. *Граматычныя, фанетычныя і лексічныя асаблівасці мовы*, якія складваліся ў XIII–XIV ст. – «дзеканне», «цэканне», «аканне», цвёрды «р», выкарыстанне словаў «каб», «калі», «ці», «чы» і інш. Гэтыя характэрныя асаблівасці беларускай мовы зафіксаваны ў трох Статутах ВКЛ (1529, 1566, 1588 гг.).

3. Спецыфічныя *рысы матэрыяльнай і духоўнай культуры.* Сярод іх можна вылучыць наступныя:

- *тыпы пасяленняў* – мястэчкі, фальваркі, засценкі;
- *тыпы жылля* – зрубавая хата, якая складалася з двух памяшканняў – хаты і сеняў;
- *абрады і звычаі* – каляды, масленіца, купалле, дзяды, талака, сябрына і інш.;
- *адзенне і народная кухня.*

4. *Этнічная самасвядомасць.* Саманазва беларускага насельніцтва з XIV ст. – «ліцвіны», чым адрознівалі сябе ад жыхароў Маскоўскай дзяржавы, якіх называлі «маскавітамі» ці «маскалямі», ад балцкага насельніцтва («жамойтаў», «яцвягаў») і ад палякаў.

5. *Наяўнасць у краіне этнічных меншасцяў* (палякаў, украінцаў, рускіх, яўрэяў, татар і інш.) паказвае і падкрэслівае самабытнасць беларускай этнічнай большасці. Прадстаўнікі іншых этнасаў з’явіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі пры розных абставінах: па дамоўленасці з іншымі дзяржавамі, як следства палітыкі Вялікага княства Літоўскага, з прычыны войнаў, у выніку вымушанай эміграцыі.

6. *Своеасаблівасць менталітэту.* Менталітэт (ад лацінскага *mentalis* – разумовы) – своеасаблівы тып мыслення, светапогляду асобнага чалавека або якой-небудзь супольнасці. Адлюстроўваецца ў спецыфічных уяўленнях людзей аб прасторы і часе, прыродным і сацыяльным асяроддзі, меркаваннях пра саміх сябе і прадстаўнікоў іншых груп насельніцтва.

Менталітэт беларусаў фармаваўся працяглы гістарычны час і набываў свае рысы ў адмысловых абставінах сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і духоўна-культурнага жыцця.

У старажытны перыяд для менталітэту беларусаў былі ўласцівы: паганскі (язычніцкі) *політэізм* (вера ў адначасовае існаванне многіх багоў), *пантэізм* (абагаўленне зямлі, нябесных свяцілаў, дрэваў, камянёў і г. д.), *анімізм* (вера ў бессмяротнасць душы), адчуванне непарыўнай еднасці чалавека з усёй навакольнай прасторай.

Пасля прыняцця хрысціянства ў канцы X ст. адбывалася перапляценне двух тыпаў светабачання – паганскага і хрысціянскага, для якога стаў характэрны *манатэізм* (вера ў аднаго бога).

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Археалагічная культура*** – агульнасць аднастайных па матэрыяльнай культуры археалагічных помнікаў на акрэсленай тэрыторыі і храналагічна блізкіх па часе існавання.

***Вытворчая гаспадарка*** – гаспадарка, пры якой людзі забяспечвалі сябе прадуктамі харчавання дзякуючы ўласнай працы (земляробства, жывёлагадоўля).

***Матрыярхат*** – перыяд у гісторыі родавай абшчыны, калі жанчына адыгрывала вядучую ролю ў сістэме сямейна-шлюбных адносін і сваяцтва вялося па жаночай лініі (адпаведна, ***патрыярхат*** – па бацькоўскай).

***Неалітычная рэвалюцыя*** – тэрмін, якім абазначаецца якасна новы перыяд у гаспадарчым жыцці першабытнага чалавека, які адбыўся ў перыяд неаліту, звязаны з пераходам старажытных людзей ад прысвойваючай да вытворчай гаспадаркі.

***Першабытнаабшчынны лад*** – перыяд у гісторыі, які ахоплівае час ад з’яўлення першых людзей да ўзнікнення класавага грамадства. Характарызуецца паступовай біялагічнай эвалюцыяй чалавека, узаемаабумоўленасцю абшчынных, роднасных і эканамічных сувязяў паміж людзьмі, калектыўнай уласнасцю на сродкі вытворчасці, ураўнальным размеркаваннем сродкаў існавання.

***Прысвойваючая гаспадарка*** – тып гаспадаркі, пры якой людзі нічога не выраблялі самі, а спажывалі ў ежу прадукты прыроды (збіральніцтва, паляванне, рыбалоўства).

***Род*** – калектыў кроўных родзічаў, якія вялі сваё паходжанне па адной лініі (мацярынскай або бацькоўскай), усведамлялі сябе патомкамі агульнага продка і мелі агульнае родавае імя (часцей за ўсё гэта была назва якой-небудзь жывёлы ці птушкі).

***Родавая абшчына*** – аб'яднанне кроўных родзічаў, якія мелі калектыўную ўласнасць і вялі агульную гаспадарку.

***Рэлігія*** – светапогляд і светаадчуванне, а таксама спецыфічныя дзеянні (культ), заснаваныя на веры ў звышнатуральныя сілы.

***Шматукладная гаспадарка*** – тып гаспадаркі перыяду разлажэння першабытнага грамадства, у якой суіснавалі розныя эканамічныя ўклады (*першабытны, рабаўладальніцкі, феадальны*).

***Этнас*** – устойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, побыту, культуры, рысаў псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленні пра агульнасць паходжання. Асноўнымі гістарычнымі формамі этнасу з'яўляюцца *племя, народнасць, нацыя*.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Калі адбылося трывалае засяленне першабытнымі людзьмі тэрыторыі сучаснай Беларусі? Што перашкаджала больш ранняму яе засяленню?

2. Вызначце асноўныя рысы, характэрныя для прысвойваючай, вытворчай і шматукладнай гаспадарак.

3. Дакажыце, што на землях сучаснай Беларусі не было падставаў для развіцця рабаўладальніцтва.

4. Дайце характарыстыку асноўных формаў першабытнай рэлігіі.

5. Якія канцэпцыі этнагенезу беларусаў вы ведаеце?

# ТЭМА 3. РАННЕФЕАДАЛЬНЫЯ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎТВАРЭННІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ (IX – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIII СТ.)

1. *Характэрныя рысы і перыядызацыя феадальнага спосабу вытворчасці.*
2. *Генезіс феадальных адносін і сельская гаспадарка Беларусі ў IX – пачатку XIII ст.*
3. *Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях.*
4. *Першыя беларускія гарады і іх функцыі ў грамадстве.*
5. *Феадальная раздробленасць на землях Беларусі і яе наступствы.*
6. *Культура Беларусі ў IX – пачатку XIII ст.*

***1. Характэрныя рысы і перыядызацыя феадальнага спосабу вытворчасці.*** Тэрмін «феадалізм» у навуковае абарачэнне ўпершыню ўвёў французскі гісторык Ф. Гізо ў XIX ст. Гэтым тэрмінам ён абазначаў новы перыяд у гаспадарчым і сацыяльным жыцці грамадства, які прыйшоў на змену рабаўладальніцкаму.

Сярод асноўных рысаў феадальнага грамадства вучоныя вылучаюць наступныя:

- асноўным сродкам вытворчасці пры феадалізме з’яўлялася зямля;
- зямля знаходзілася ў манапольнай уласнасці феадалаў і з’яўлялася прыкметай палітычнай улады;
- надзяленне непасрэднага вытворцы (селяніна) сродкамі вытворчасці (зямлёй) з прымацаваннем яго да зямлі (пазаэканамічны прымус);
- наяўнасць феадальнай рэнты ў трох асноўных формах: *даніна* – прадуктовы падатак (натуральны аброк), *чынш* – грашовы падатак, *паншчына* – адпрацовачная павіннасць;
- панаванне *натуральнай гаспадаркі*, пры якой усё, што выраблялася, спажывалася пераважна ў межах гэтай жа гаспадаркі;
- нізкі, руцінны стан тэхнікі.

У еўрапейскіх краінах феадалізм існаваў з сярэдзіны I тысячагоддзя н. э. па XIX ст. Станаўленне і развіццё феадальных адносін можа адбывацца двума шляхамі: *сінтэзным* і *бяссінтэзным*. У некаторых краінах Заходняй Еўропы феадалізм развіваўся ў выніку сінтэзу родаплемянных і рабаўладальніцкіх адносін. Ён грунтаваўся на запазычванні некаторых гаспадарчых і тэхнічных дасягненняў Рымскай імперыі: двух- і трохполля, добрага ўгнаення глебы і інш., а таксама на развіцці дробнай вытворчасці і існаванні свабодных абшчыннікаў.

Пры бяссінтэзным шляху развіццё феадалізму праходзіць больш марудна. Яно было ўласціва для краін, у якіх сувязь з рымскім грамадствам адсутнічала ці была слабая. На такіх землях станаўленне феадалізму адбывалася пасля разлажэння родавага ладу. Менавіта такім шляхам, без уліку рымскіх традыцый, мінуючы рабаўладальніцтва, пачалося развіццё феадальных адносін на тэрыторыі Беларусі.

У адпаведнасці з гістарычнымі даследаваннямі прынята лічыць, што ў сваім развіцці феадалізм прайшоў тры перыяды. У гісторыі Беларусі этапы феадалізму храналагічна выглядаюць наступным чынам:

1) перыяд *ранняга феадалізму* (IX – першая палова XIII ст.), у якім адбылося станаўленне феадальных адносін, сфармавалася саслоўе землеўладальнікаў і землекарыстальнікаў, вызначыліся формы феадальнай рэнты, узніклі першыя дзяржаўныя ўтварэнні;

2) перыяд *развітога феадалізму* (другая палова XIII – першая палова XVIII ст.), найвышэйшая стадыя, якая характарызавалася развітымі феадальнымі адносінамі, стратай сялянамі асабістай свабоды, уздымам эканомікі і культуры;

3) перыяд *крызісу феадалізму і зараджэння капіталістычных адносін* (другая палова XVIII – першая палова XIX ст.), у аснове якога было разлажэнне традыцыйных для феадалізму грамадскіх і гаспадарчых парадкаў, развіццё таварна-грашовых адносін, рост гарадоў, складванне ўнутранага рынку і г. д.

***2. Генезіс феадальных адносін і сельская гаспадарка Беларусі ў IX – пачатку XIII ст.*** Станаўленне феадальных адносін на зем-

лях Беларусі адбывалася ва ўмовах існавання шматукладнай гаспадаркі. Як і раней, значную ролю ў жыцці сельскага насельніцтва адыгрывала *абшчына (верв, мір)*. Яна складалася з усіх сем'яў вёскі і выконвала адміністрацыйныя, судовыя і гаспадарчыя функцыі. Насельніцтва абшчыны было звязана кругавой парукай – разам адказвала за здзейсненыя злачынствы і выкананне павіннасцяў, працавала на карысць усёй абшчыны. Ворыўныя землі былі ў карыстанні асобных двароў, а ў абшчынным – лугі, сенажаці, вадаёмы.

Навукова даказана, што ва ўсходніх славян існавалі выразныя рысы рабаўладальніцтва (*хатняе рабства*), хаця яно і не атрымала шырокага распаўсюджання. Асноўнай крыніцай захопу нявольнікаў была вайна.

Але галоўнай характарыстыкай перыяду IX – першай паловы XIII ст. стаў працэс усталявання і паглыблення феадалізму, які, з аднаго боку, заключаўся ў фармаванні буйнога землеўладання князёў, знаці і царквы, а з другога – у тым, што свабодныя абшчыннікі траплялі ў залежнасць ад феадалаў.

З утварэннем на землях Беларусі першых дзяржаваў-княстваў ішло фарміраванне і сацыяльнай структуры феадальнага грамадства. Выразна аформілася *феадальная іерархія* («*феадальная лесвіца*»). На чале грамадства стаяў князь, які лічыўся вярхоўным уласнікам зямлі. Ён абапіраўся на *баяр* (родавую знаць), *ваеннаслужылую знаць*, якая складала старэйшую і малодшую дружыны, *духавенства*.

Паводле аднаго з самых старажытных помнікаў права на землях усходніх славян – «*Рускай праўды*», свабоднае насельніцтва мела назву «людзі», або «людзіны». Але непазбежным вынікам з'яўлення буйнога землеўладання было ўзмацненне феадальнай залежнасці сялян. Некаторыя свабодныя абшчыннікі – *смерды* – паступова траплялі ў залежнасць ад дзяржавы, а потым і ад феадалаў. Трапіць у залежнасць можна было рознымі шляхамі, аб чым сведчаць наступныя катэгорыі сялян:

- *закупы* – збяднелыя сяляне, якія бралі ў феадала грашовую пазыку («купу») і павінны былі працаваць на яго гаспадарцы за «купу», пакуль не вярнуць грошы;

- *радовічы* – сяляне, якія знаходзіліся ў залежнасці ад феадала ў адпаведнасці з дамовай («радам»);
- *ізгоі* – у XI–XII ст. так называліся людзі, якія ў выніку якіх-небудзь абставін выйшлі са свайго звычайнага грамадскага становішча. Большасць з іх складалі сяляне, якія былі па нейкіх прычынах выгнаны з абшчыны, засталіся без зямлі і былі вымушаны пайсці ў залежнасць да феадала;
- *чэлядзь, халопы* – несвабодныя людзі, рабы, якія знаходзіліся ў поўнай залежнасці ад феадала. Гісторыкі лічаць, што чэлядзь фарміравалася з палонных, захопленых у час вайны, а халопы – з мясцовага люду.

Аснову гаспадаркі ў адзначаны перыяд складала земляробства, развіццю якога садзейнічалі спрыяльныя прыродныя і кліматычныя ўмовы, а таксама эвалюцыя прылад працы. Ворныя прылады выраблялі з дрэва, металічнымі былі толькі асобныя іх часткі. Людзі карысталіся драўляным ралам з жалезным наральнікам, матыгай, сярпом, драўлянай рыдлёўкай і інш. Значным крокам наперад у развіцці земляробства стала ўзнікненне ў канцы IX–X ст. якасна новай ворнай прылады – двухзубай драўлянай сахі з двума металічнымі сашнікамі. Ворнае земляробства ўжывалася з прымяненнем паравай сістэмы ў выглядзе двухполля ці *трохполля*.

У перыяд ранняга феадалізму на землях Беларусі вырошчвалі амаль усе вядомыя сёння збожжавыя культуры, галоўнай з якіх было жыта. Сярод іншых культур можна адзначыць пшаніцу, ячмень, проса, лён, каноплі, грэчку, агуркі, цыбулю, моркву, рэдзьку. Ураджайнасць земляробства была ў сярэднім *сам-3*. Гэта значыць, што людзі атрымлівалі ўраджай у тры разы большы ў параўнанні з затрачаным насеннем.

Важную ролю ў гаспадарчым жыцці адыгрывала і жывёлагадоўля. Насельніцтва беларускіх земляў разводзіла коней, буйную рагатую жывёлу, свіней, хатнюю птушку. Гэтая галіна гаспадаркі забяспечвала людзей не толькі мясам, малаком, скурай, але таксама цяглавай жывёлай і ўгнаеннем, неабходнымі для вядзення ворыўнага земляробства.

Разам з тым у разглядаемы перыяд людзі займаліся і промысламі,

галоўнымі з якіх былі рыбалоўства, паляванне, збор грыбоў і ягад. Акрамя таго, займаліся *бортніцтвам* – зборам мёду дзікіх пчол, даглядалі дуплы і нават стваралі новыя. Развівалася таксама і хатняе рамяство: ткацтва, выраб посуду і інш.

Такім чынам, сельская гаспадарка з'яўлялася асновай гаспадарчай дзейнасці людзей на беларускіх землях у IX – першай палове XIII ст. Узровень яе развіцця дазваляў не толькі пракарміцца адной сям'і, але і стварыць дадатковы прыбавачны прадукт, які быў неабходнай умовай для развіцця рамяства і гандлю.

***3. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях.*** Узнікненне першых дзяржаўных утварэнняў ва ўсходніх славян у перыяд ранняга феадалізму цалкам адпавядала аналагічным працэсам у Заходняй Еўропе. Першыя дзяржавы фактычна з'яўляліся племяннымі княжаннямі. Летапісы паведамляюць, што ў другой палове IX ст. славянскія плямёны палян, драўлян, славенаў, крывічоў і дрыгавічоў мелі свае племянныя княжанні.

***Полацкае княства*** з цэнтрам у горадзе Полацку было першай дзяржавай, якая ўзнікла на беларускіх землях. Полацк займаў вельмі выгаднае геастратэгічнае становішча. Заходняя Дзвіна ў той час з'яўлялася часткай шляху, па якім ішоў міжнародны гандаль Візантыі і Арабскага халіфата з усходнеславянскімі княствамі і скандынаўскімі краінамі. Ён праходзіў праз Няву, Волхаў, Ловаць, Заходнюю Дзвіну да Дняпра і меў назву шляху «*з варагаў у грэкі*». Займаючы на гэтай важнай воднай магістралі фактычна цэнтральнае месца, Полацк з умацаванага паселішча хутка ператварыўся ў моцны транзітны і гандлёвы цэнтр.

Акрамя таго, Полацкае княства знаходзілася паміж двума іншымі дзяржаўнымі ўтварэннямі ўсходніх славян – Кіеўскім і Наўгародскім княствамі. Кожнае з гэтых княстваў імкнулася заключыць саюз з Полацкам, каб разам мець эканамічную і ваенную перавагу ў рэгіёне. Вядома, што ў 907 г. Полацк быў саюзнікам Кіева, а полацкая дружына прымала ўдзел у паходзе кіеўскага князя Алега на сталіцу Візантыі – Канстанцінопаль (Царград). Паход скончыўся перамогай Кіева, а Канстанцінопаль вымушаны быў плаціць даніну і Полацку.

У другой палове X ст. летапісы згадваюць першага вядомага полацкага князя Рагвалода, які прыйшоў «з-за мора», княжыў у Полацкай зямлі і валадарыў ёю. У гэты ж час Полацк становіцца ахвярай барацьбы за вярхоўную ўладу паміж наўгародскім князем Уладзімірам і яго братам, кіеўскім князем Яраполкам. Саюз з Полацкам мог стаць вырашальным у гэтай барацьбе, таму ў перыяд паміж 975 і 978 г. Уладзімір і Яраполк адначасова звярнуліся да полацкага князя з падобнай прапановай. Летапісы гэтую дыпламатычную акцыю спрошчана падаюць як сватанне вышэйзгаданых князёў да дачкі Рагвалода Рагнеды. Згодна з летапісам, Рагнеда выбрала Яраполка, дадаўшы пры гэтым, што яна не хоча выходзіць за Уладзіміра – «сына рабыні» (Уладзімір быў пазашлюбным сынам кіеўскага князя). Але хутчэй за ўсё, выбар Рагнеды быў абумоўлены тым, што полацкі князь хацеў бачыць сваім палітычным саюзнікам больш уплывовага і моцнага кіеўскага князя.

Далей для Полацка падзеі разгортваліся вельмі трагічна. Уладзімір з войскам нечакана напаў на горад, знішчыў полацкую княжацкую сям'ю, а Рагнеду прымусова зрабіў сваёй жонкай. Пазней ён забіў Яраполка, заняў кіеўскі трон і на некаторы перыяд (каля 20 гадоў) аб'яднаў пад сваёй уладай Наўгародскае, Полацкае і Кіеўскае княствы. Утвораная Уладзімірам дзяржава атрымала ў гістарыяграфіі назву «*Кіеўская Русь*».

Залежнасць Полацк ад Кіева працягвалася нядоўга. Пасля 988 г. Рагнеда, якая так і не даравала Уладзіміру забойства сваіх сваякоў, зрабіла няўдалы замах на яго жыццё. Уладзімір параіўся з баярамі і замест пакарання Рагнеды адправіў яе разам з іх сынам Ізяславам назад, у Полаччыну, у спецыяльна пабудаваны горад Ізяслаўль (цяпер г. Заслаўе Мінскай вобласці). Такім чынам, была адноўлена вотчына Рагнеды, а пасля запрашэння палачанамі Ізяслава на княжанне ў Полацк аднавілася ў Полацкай зямлі і дынастыя Рагвалодавічаў – унукаў Рагвалода. З таго часу полацкія князі вялі барацьбу за аднаўленне і ўмацаванне незалежнасці Полацка.

Размешчанае на двух важных гандлёвых шляхах – па Дняпру ў Чорнае мора і па Заходняй Дзвіне ў Балтыйскае – Полацкае княства вымушана было ўступіць у барацьбу з двума другімі цэнтрамі

ўлады на ўсходнеславянскіх землях – з Кіевам і Ноўгарадам. Тры цэнтры былі вельмі падобныя па свайму палітычнаму і эканамічнаму паходжанню, а з часоў Уладзіміра іх аб’ядноўвалі і дынастычныя сувязі. Агульнымі для гэтых княстваў былі царкоўнаславянская мова і хрысціянскія каштоўнасці, якія пачалі распаўсюджвацца сярод кіруючай эліты.

Значных поспехаў у барацьбе за незалежнасць Полацка дасягнуў сын Ізяслава, князь Брачыслаў (1003–1044). Ён паспяхова змагаўся з Ноўгарадам за *волакі* – сухапутныя шляхі паміж рэкамі, валоданне якімі прыносіла значныя прыбыткі ў скарб. У 1021 г. Брачыслаў здзейсніў паход на Ноўгарад і захапіў горад, але на зваротным шляху ў Полацк быў разбіты кіеўскім князем Яраславам Мудрым (сынам Рагнеды і Уладзіміра). У выніку Брачыслаў і Яраслаў Мудры заключылі саюз, па якому да Полацкага княства далучаліся важныя гарады Віцебск і Усвяты, якія кантралявалі волакі паміж Заходняй Дзвіной і Дняпром.

Найбольшай магутнасці Полацкае княства дасягнула пры Усяславе Брачыславічы, ці, як называлі яго летапісы, Усяславе Чарадзеі (1044–1101). Пры ім канчаткова было зацверджана, што ўладанні Рагвалодавічаў утвараюць асобную, незалежную зямлю, вылучаную з астатняй Русі, і ў другой палове XI ст. Полацк зрабіўся асноўным супернікам Кіева. Каб паказаць сваю роўнасць з вялікімі князямі Яраславічамі (сынамі Яраслава Мудрага) і падкрэсліць незалежнасць Полацкага княства, па загаду Усяслава ў Полацку быў пабудаваны сабор Святой Сафіі, які стаў уровень з кіеўскім і наўгародскім Сафійскімі саборамі.

У 1065–1078 гг. паміж войскамі Усяслава Чарадзея і Яраславічаў адбыўся шэраг бітваў, найбольш жорсткай з якіх была бітва на Нямізе ў 1067 г. У сувязі з гэтай падзеяй упершыню ў летапісах згадваецца г. Менск. Бітва на Нямізе была прайграна Усяславам Чарадзеем, а насельніцтва Менска знішчана. Апісваючы гэтую падзею, летапісец адзначаў: «На Нямізе снапы сцелюць з галоваў, малоцяць цапамі булатнымі, на таку жываты кладуць, веюць душу ад цела...»

З рэшткамі сваёй дружыны Усяслаў адышоў да Дняпра, але падманам быў захоплены Яраславічамі ў палон. Больш за год прасядзеў

полацкі князь у порубе (турме) у Кіеве, пакуль не быў вызвалены паўстаўшымі жыхарамі горада. Усяслаў Чарадзей на некаторы час стаў кіеўскім князем, але потым вярнуўся ў Полацк.

У 1097 г. у Любечы адбыўся з’езд князёў Рурыкавічаў, на якім адбылася спроба ўпарадкавання адносін паміж нашчадкамі Яраслава Мудрага. Яго вотчына раздзялілася на ўдзелы трох ліній – Ізяславічаў, Святаславічаў і Усеваладавічаў. Гэтая дамова не тычылася Полацкай зямлі, і таму Усяслаў Чарадзей не быў запрошаны на гэты з’езд. Такім чынам, нашчадкі Яраслава Мудрага прызналі незалежнасць Полацкага княства. Да канца XI ст. вотчына Усяслава не ведала спусташэнняў, і гэта быў перыяд, калі Полацкае княства дасягнула найбольшай сваёй магутнасці.

Вышэйпералічанае дазваляе сцвярджаць, што Полацкае княства было першай дзяржавай на беларускіх землях, паколькі Полацкая зямля мела ўсе неабходныя атрыбуты дзяржаўнасці.

**1.** ***Тэрыторыю*** – у другой палове XI ст., у перыяд найбольшай магутнасці Полацкага княства, яно межавала з Наўгародскай зямлёй на поўначы, са Смаленскай – на ўсходзе, з Тураўскай – на поўдні, з балцкімі народамі – на захадзе.

**2.** ***Насельніцтва***, якое ўсведамляла сябе жыхарамі менавіта гэтай дзяржавы і адрознівала сябе ад тых, хто жыў за межамі іх княства. Жыхары Полацкага княства называлі сябе *крывічы-палачане*.

**3.** ***Органы кіравання***, якія ў Полацкім княстве можна вызначыць як княжацка-вечавы лад. *Веча* – агульны сход грамадзян, які збіраўся ў Полацку. Веча валодала вялікімі паўнамоцтвамі: запрашала князя, а таксама магло прагнаць яго («указаць яму шлях»), абвяшчала вайну і заключала мір, прызначала падаткі. Практычна ўсе найважнейшыя справы дзяржаўнай палітыкі ажыццяўляліся толькі са згоды большасці паўнапраўных грамадзян.

Паўнамоцтвы князя распаўсюджваліся ў асноўным у сферы *выканаўча-распараджальнай* дзейнасці. Ён абавязаны быў клапаціцца пра абарону краіны, кіраваць войскам і збіраць падаткі. Полацкае княства мела сваю ўласную дынастыю Рагвалодавічаў – «Рагвалодавых унукаў».

**4.** ***Войска.*** Галоўнай ваеннай сілай з’яўлялася княжацкая дру-

жына. Полацкая дружына ўжо ў 907 г. прымала ўдзел у паходзе кіеўскага князя Алега на Царград.

**5. *Законы.*** Пануючым было так званае «звычаёвае права» – сістэма няпісаных прававых норм, якія ўзніклі непасрэдна з грамадскіх адносін і абапіраліся на агульнапрынятасць і даўнасць ужывання і прызнаваліся дзяржавай.

**6. *Падаткавую сістэму*.** Падаткі з насельніцтва збіраліся князем разам з дружынай у выглядзе даніны натуральнымі прадуктамі: зернем, мёдам, футрам і г. д. Збор даніны ва ўсходніх славян называўся *«палюддзе»*.

Такім чынам, Полацкае княства стала першай дзяржавай на беларускіх землях, якая па ўзроўню развіцця не саступала іншым моцным княствам таго часу – Кіеўскаму і Наўгародскаму.

***Тураўскае княства.*** Але Полацкае княства не было адзінай дзяржавай на землях Старажытнай Беларусі. У басейне ракі Прыпяць у X ст. на аснове племяннога саюза дрыгавічоў утварылася Тураўскае княства. Пра раннюю гісторыю Тураўскага княства звестак няма. Упершыню цэнтр княства г. Тураў згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 980 г. Першым летапісна вядомым князем гэтай дзяржавы быў Тур, ад яго імя, згодна летапісу, насельніцтва празвалася тураўцамі.

Тураўскае княства таксама мела выгаднае геаграфічнае становішча, паколькі праз яго тэрыторыю праходзілі міжнародныя гандлёвыя магістралі. Першая па Прыпяці і Дняпру вяла ў Чорнае мора; другая мела напрамак на Польшчу і праходзіла па рэках Прыпяць – Піна – Мухавец – Буг; трэцяя праз сістэму рэк Прыпяць – Ясельда – Рось – Нёман вяла ў Балтыку.

Тураўскае княства, якое межавала з больш моцнай Кіеўскай дзяржавай, да 80-х гадоў X ст., хутчэй за ўсё, заставалася самастойным, а ў 980-я гады трапіла ў залежнасць ад Кіева. Вядома, напрыклад, што кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч пакінуў кіраваць у Тураве свайго сына-намесніка Святаполка.

Грамадска-палітычны лад у Тураве меў свае асаблівасці. Тураўскія князі паводле роднасных сувязяў з кіеўскімі мелі права займаць кіеўскі трон. У такім выпадку ў Тураў прызначаўся княжацкі

намеснік – *пасаднік*. Горадам і воласцю кіравала веча; ёсць звесткі, што веча нават выбірала епіскапа. Гэта было незвычайнай з'явай, паколькі епіскапаў па царкоўных законах павінен быў прызначаць мітрапаліт.

Аднак на развіццё Тураўскага княства вельмі адмоўна ўплывала адсутнасць сваёй правячай дынастыі. Прадстаўнікі розных княжацкіх родаў, якія займалі тураўскі прастол, не дбалі пра мясцовыя інтарэсы. У выніку такой палітыкі Тураўшчына нават губляла землі. Так, у 1142 г. Тураўскае княства страціла гарады Берасце, Драгічын, Клецк, Рагачоў, а ў 1155 г. – Мазыр.

***Берасцейская зямля.*** Важным цэнтрам Сярэдняга Пабужжа з'яўляўся горад Берасце. Разам з гарадамі Кобрын, Камянец, Драгічын, Бельск, Мельнік тэрыторыя Берасцейскай зямлі ўяўляла сабой практычна адзіную ў сацыяльна-палітычных адносінах вобласць, нягледзячы на тое, што этнічны склад насельніцтва тут быў вельмі разнастайны.

Берасце адыгрывала ролю заходняга фарпоста на землях усходніх славян, і да сярэдзіны XII ст. Берасцейская зямля ўваходзіла ў склад Тураўскага княства. За магчымасць мець уплыў на гэтую тэрыторыю ў другой палове XII ст. змагаліся кіеўскія і галіцка-валынскія князі і нават польскія каралі. У выніку, як і Тураўскае княства, Берасцейская зямля ў другой палове XII ст. трапіла ў залежнасць ад галіцка-валынскіх князёў.

***Верхняе Панямонне*** з'яўлялася тэрыторыяй, на якой ад старажытнасці жылі балцкія плямёны *яцвягаў*, *літвы і дайновы*. Каланізацыя гэтых земляў славянамі ажыццяўлялася пазней за іншыя тэрыторыі. Верхняе Панямонне ўключала гарады Наваградак, Гародню, Ваўкавыск, Слонім і інш.

Як сведчаць летапісы, з канца X ст. тэрыторыя Гарадзеншчыны трапіла ў сферу палітычных інтарэсаў кіеўскіх князёў: «на яцвягаў» хадзілі Уладзімір Святаслававіч і Яраслаў Мудры. Апошні ў 1044 г. заснаваў Наваградак.

Некаторы час Верхняе Панямонне знаходзілася ў палітычным падпарадкаванні Галіцка-Валынскага княства. Аднак у першай трэці

XII ст. у летапісах паведамляецца аб самастойным гарадзенскім князі *Усеваладку* (1116–1141), які ў 1127 г. браў удзел у паходзе на Полацк. Гэты факт сведчыў пра тое, што Гародня ўжо была цэнтрам удзельнага княства. Дынастычныя шлюбы звязвалі гарадзенскіх князёў з кіеўскімі, і яны перыядычна арганізоўвалі сумесныя ваенныя паходы.

У сярэдзіне XIII ст. Верхняе Панямонне адыграла знакавую ролю ў гісторыі Беларусі, паколькі менавіта гэтыя землі сталі тэрытарыяльным ядром новай дзяржавы, вакол якой перад пагрозай знешніх ворагаў пачалі аб'ядноўвацца аслабленыя ўдзельныя ўсходнеславянскія княствы.

Такім чынам, у перыяд IX–XI ст. развіццё беларускіх земляў характарызавалася ўзнікненнем на іх тэрыторыі раннефеадальных княстваў-дзяржаваў, для якіх быў уласцівы прынцып арганізацыі насельніцтва не на падставе кроўных сувязяў, а па тэрытарыяльнай прыкмеце. Пазней працэс утварэння і развіцця дзяржаваў-княстваў змяніўся *феадальнай раздробленасцю* (1101 – сярэдзіна XIII ст.) – з'явай, якая была характэрнай для ўсіх краін, якія развіваліся па шляху феадалізму.

***4. Першыя беларускія гарады і іх функцыі ў грамадстве.*** У выніку росту прадукцыйных сіл у земляробстве і жывёлагадоўлі, шырокага распаўсюджання і ўдасканалення жалезных прылад працы з'явілася магчымасць вызваліць ад працы ў сельскай гаспадарцы пэўную частку людзей, здольных да рамяства. Такім чынам, адбылося выдзяленне рамяства ў самастойную гаспадарчую галіну. У гістарычнай літаратуры гэты працэс атрымаў назву *другога грамадскага падзелу працы*.

З аддзяленнем рамяства ад земляробства цесна звязана ўзнікненне гарадоў. Горад – агароджаны (адсюль назва «горад»), умацаваны населены пункт, жыхары якога займаліся пераважна рамяством і гандлем. Шляхі ўзнікнення гарадоў былі рознымі. Часта гарады ўтвараліся на месцах былых гарадзішчаў жалезнага веку, а таксама вакол феадальных замкаў ці як прыгранічныя крэпасці. Важнымі фактарамі ўзнікнення, развіцця і росту гарадоў былі іх геаграфічнае становішча і наяўнасць гандлёвых шляхоў.

Першым горадам на землях Беларусі лічыцца Полацк. Ён быў заснаваны крывічамі на месцы ўпадзення ракі Палаты ў Заходнюю Дзвіну і ўпершыню згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 862 г., аднак даследаванні беларускіх археолагаў сведчаць, што горад узнік як мінімум на сто гадоў раней за першую згадку ў летапісе. У ліку старажытных беларускіх гарадоў пісьмовыя крыніцы называюць: Тураў (980), Ізяслаўль (Заслаўе) (каля 985), Берасце (1019), Віцебск (1021), Менск, Орша (1067), Пінск (1097), Слуцк (1116), Гародня (1127), Мсціслаў (1135), Гомель (1142) і інш. Усе старажытныя беларускія гарады былі заснаваны на берагах вялікіх рэк, па якіх праходзілі рачныя гандлёвыя шляхі.

На думку гісторыкаў, свае назвы беларускія гарады маглі атрымаць наступнымі шляхамі:

1) ад назваў рэк, на берагах якіх былі заснаваны: Полацк – ад ракі Палаты, Віцебск – ад Віцьбы, Пінск – ад Піны, Гародня – ад Гараднічанкі, Слуцк – ад Случы і інш.;

2) ад імёнаў князёў, якім належалі гарады: Тураў – ад князя Тура, Ізяслаўль – ад Ізяслава, Барысаў – ад Барыса і г. д.;

3) легендарнае (звязанае з легендай) паходжанне назвы некаторых гарадоў (Берасце, Навагрудак).

Звычайна раннефеадальныя гарады складаліся з дзвюх асноўных частак:

- ***дзядзінца*** – умацаванага цэнтра, дзе жыў князь з дружынай і размяшчаліся адміністрацыйныя і культавыя пабудовы. У абарончай сістэме спалучаліся прыродны ландшафт (высокі бераг ракі, абрыў) і штучныя ўмацаванні (земляны вал, драўляны частакол, вежы);
- ***рамесніцкага пасаду*** – неўмацаванай часткі горада, дзе жылі і працавалі рамеснікі.

Найбольш буйныя гарады мелі яшчэ *вакольны горад*, які займаў прамежкавае становішча паміж дзядзінцам і пасадам. Будаваліся гарады цалкам з дрэва: драўлянымі былі княжацкія палацы, жылыя пабудовы, дрэвам масцілі вуліцы.

У жыцці раннефеадальнага грамадства гарады адыгрывалі вялікую ролю і выконвалі шмат функцый. Яны з'яўляліся *цэнтрамі*

*рамеснай вытворчасці.* Як сведчаць крыніцы, у вывучаемы перыяд у гарадах Беларусі налічвалася каля 40 рамесных спецыяльнасцяў. Вядучая роля належала кавальству, якое забяспечвала неабходнымі прыладамі працы сельскую гаспадарку і многія віды рамёстваў. Добра былі развіты ювелірная справа, апрацоўка дрэва, ганчарства, ткацтва, гарбарства і інш.

Аддзяленне рамяства ад земляробства і горада ад сяла прывяло да развіцця гандлю. Функцыю *гандлёвых цэнтраў* выконвалі гарады. У іх размяшчаліся рынкі, на якіх можна было набыць ці абмяняць рамесную прадукцыю, сыравіну, прадукты харчавання. У гарадах, якія знаходзіліся на важнейшых водных магістралях, ажыццяўлялўся і знешні гандаль. У IX – першай палове XIII ст. асноўным накірункам на землях Беларусі быў гандаль з Візантыяй, Арабскім Усходам, Заходняй Еўропай, а таксама з усходнеславянскімі княствамі: Кіеўскім і Наўгародскім. З беларускіх земляў вывозілі футра, мёд, воск, лён. Прадметамі імпарту пераважна былі вырабы з металу, каштоўныя камяні, тканіны, віно, вострыя прыправы.

Узнікаючы вакол феадальных замкаў, гарады выконвалі таксама функцыю *адміністрацыйна-фіскальных цэнтраў*. У гарадах абвяшчаліся новыя законы, сюды звозілася даніна, сабраная з падданага насельніцтва.

Важнай функцыяй гарадоў была *ваенна-абарончая*. Створаная вакол горада абарончая сістэма і наяўнасць у горадзе ваеннай сілы – дружыны рабілі яго месцам, дзе можна было знайсці сховішча ў час варожых нападаў і арганізаваць абарону.

З прыняццем у 988 г. хрысціянства гарады сталі і *культурна-рэлігійнымі цэнтрамі.* Спачатку толькі ў гарадах будаваліся храмы, перапісваліся кнігі, стваралiся вырабы прыкладнога мастацтва і г. д.

**Такім чынам, з утварэннем гарадоў на землях сярэднявечнай Беларусі адбывалася хуткае развіццё рамяства, гандлю, культуры.**

***5. Феадальная раздробленасць на землях Беларусі і яе наступствы.*** *Феадальная раздробленасць* – гэта працэс падзелу раннефеадальных дзяржаў на ўдзельныя княствы. Так, пасля смерці Усяс-

лава ў 1101 г. Полацкая дзяржава была падзелена на 6 удзельных княстваў: Полацкае, Менскае, Віцебскае, Лагойскае, Ізяслаўскае і Друцкае. Асаблівасцю феадальнай раздробленасці ў Полацкім княстве было тое, што міжусобная барацьба мела не сепаратысцкі характар, а вялася за дамінаванне на дадзенай тэрыторыі.

Найбольш моцным стаў Менскі ўдзел. Менскі князь *Глеб Усяслававіч* (? – 1119) праводзіў актыўную палітыку, накіраваную на ўзмацненне і пашырэнне тэрыторыі княства, імкнуўся аб'яднаць усе беларускія землі вакол Менска. Кіеўскія князі арганізавалі некалькі паходаў супраць князя Глеба. Апошні быў захоплены ў палон, кінуты ў кіеўскі поруб, дзе хутка памёр.

Незалежную ад Кіева палітыку імкнуліся весці і іншыя нашчадкі Усяслава Чарадзея. У 1127 г. быў здзейснены паход паўднёварускіх князёў на Полацкую зямлю. За «непаслушэнства» Кіеву ў 1129 г. некаторыя князі Полацкай зямлі былі высланы ў Візантыю. Незадаволеныя кіраваннем стаўленнікаў Кіева палачане ў 1132 г. узнялі паўстанне і на вечы пастанавілі вярнуць сваіх князёў з Візантыі. Але не ўсе высланыя князі вярнуліся ў свае ўдзелы.

У барацьбу за незалежнасць ад Кіева ў XII ст. уключылася і Тураўскае княства. У 1158 г. тураўскі князь Юрый Яраславіч адмовіўся падпарадкоўвацца Кіеву. Натхнёныя княжацкім прыкладам, жыхары Турава вытрымалі дзесяцітыднёвую аблогу вялікага варожага войска, якое складалася з кіеўскай, галіцкай, смаленскай і луцкай дружын. Вораг адышоў, і такім чынам была абаронена незалежнасць Турава і ўсяго княства.

Аднак у другой палове XII – пачатку XIII ст. Тураўская зямля таксама перажывала працэс феадальнага драблення. Спачатку яна была падзелена паміж сынамі Юрыя Яраславіча на Тураўскае, Пінскае і Дубровіцкае княствы, пазней выдзеліліся Клецк, Берасце, Драгічын. У выніку землі былога Тураўскага княства трапілі пад уплыў больш моцных галіцка-валынскіх князёў.

Паглыбленне феадальнай раздробленасці суправаджалася міжусобнымі войнамі. Дробныя князі таксама прагнулі самастойнасці і са сваімі землямі і дружынамі выходзілі з-пад улады кіраўнікоў удзелаў.

Фактычна ўсе краіны, якія сталі на шлях феадалізму, у сваім развіцці прайшлі тры стадыі: ад *раннефеадальных дзяржаў* праз *перыяд феадальнай раздробленасці* да стварэння *цэнтралізаваных дзяржаў*. Такім чынам, феадальная раздробленасць была заканамерным этапам эвалюцыі феадальных краін.

Сярод асноўных прычын, якія абумовілі феадальную раздробленасць, можна вызначыць дзве:

*1)* ***палітычную***, якая была звязана з наяўнасцю ў раннефеадальным грамадстве *васальнай залежнасці* – сістэмы своеасаблівых адносін паміж феадаламі. Князі ўступалі паміж сабой у васалітэт, калі адзін з іх пагаджаўся лічыцца «сынам» другога (пры раўнапраўных адносінах князі называлі адзін аднаго «братамі»). Баяры з'яўляліся васаламі таго князя, якому служылі і ад якога за службу атрымлівалі маёнткі. Пачынаючы з XI–XII ст. з'явіліся асабістыя дружыны найбуйнейшых баяр з васалаў трэцяга ўзроўню. Узмацненне ўдзельных князёў прыводзіла да аслаблення цэнтральнай улады і садзейнічала распаду раннефеадальных дзяржаў;

*2)* ***эканамічную***, якая была абумоўлена панаваннем натуральнай гаспадаркі, калі ўсе землі Беларусі мелі так званую *эканамічную аўтаркію* (незалежнасць): усё неабходнае для жыцця выраблялася і спажывалася ў межах адной гаспадаркі і не было жыццёвай неабходнасці для пашырэння эканамічных сувязяў паміж рэгіёнамі.

Феадальная раздробленасць мела *станоўчыя* і *адмоўныя* наступствы. На першым этапе падзел вялікіх княстваў на асобныя ўдзелы ствараў спрыяльныя ўмовы для росту гарадоў, развіцця рамёстваў і культуры, удасканалення натуральнай гаспадаркі. Зразумела, што пры існаваўшых у той час сродках камунікацыі кіраванне невялікімі тэрыторыямі было больш эфектыўным. Аднак пастаяннае вядзенне разбуральных міжусобных войнаў стала адмоўна адбівацца на гаспадарчым жыцці. Разбуралася сельская гаспадарка, рамяство, заняпаў шлях «з варагаў у грэкі», які некалькі стагоддзяў прыносіў трывалыя прыбыткі ў скарб Полацкага княства і іншых беларускіх земляў. Да таго ж, раз'яднаныя ўдзелы не маглі аказаць належнага адпору знешнім захопнікам. Толькі напрыканцы XII – пачатку XIII ст. пад пагрозай знешніх

ворагаў на беларускіх землях сталі праяўляцца тэндэнцыі да палітычнай і эканамічнай кансалідацыі.

***6. Культура Беларусі ў IX – пачатку XIII ст.*** Культура народаў у перыяд ранняга сярэднявечча ў многім вызначалася рэлігійнымі ўяўленнямі. Дахрысціянскай рэлігіяй насельніцтва на беларускіх землях было *язычніцтва (паганства)* – вера ў многіх багоў. Сярод вярхоўных багоў у старажытных насельнікаў Беларусі былі: *Пярун* – бог грому і маланкі, *Сварог* – бог неба, *Вялес* – бог жывёлагадоўлі, гандлю, багацця, уладар замагільнага свету, апякун язычніцкіх святароў-вешчуноў, *Ярыла* – бог урадлівасці і вайны, *Дажбог* – бог Сонца, *Лада* – багіня дабрабыту і апякунка сямейнага жыцця і інш. У пантэоне багоў адлюстроўвалася як пакланенне людзей прыродным з'явам, так і іх гаспадарчая дзейнасць.

Аднак з узнікненнем першых дзяржаўных утварэнняў, усталяваннем княжацкай улады, развіццём рамяства і гандлю з'явілася патрэба ў больш шырокіх ведах, граматнасці, трывалых сувязях з іншымі краінамі і ў новым асэнсаванні чалавекам свайго жыцця. Гэта не маглі забяспечыць язычніцкія вераванні, і таму наспела неабходнасць у прыняцці новай рэлігіі, якой на землях усходніх славян стала хрысціянства.

Хрысціянства прыйшло на тэрыторыю Беларусі пасля таго, як у 988 г. муж Рагнеды кіеўскі князь Уладзімір ахрысціў сваіх падданых. Візантыйскі варыянт хрысціянства стаў дзяржаўнай рэлігіяй і, як сведчаць крыніцы, уводзіўся ў Кіеўскім княстве хутка, часта нават з прымяненнем сілы.

У Полацкім княстве хрысціянская вера распаўсюджвалася больш спакойна. У гістарычных крыніцах не згадваюцца факты насілля альбо прымусу пры ўвядзенні новай рэлігіі на беларускіх землях. У Полацкай зямлі існавалі свае перадумовы для прыняцця хрысціянства, да таго ж, полацкія воіны ўдзельнічалі ў паходзе на Візантыю ў 907 г. і ўжо мелі ўяўленне аб хрысціянстве. Існуе думка, што кіруючая эліта Полацкага княства яшчэ раней прыняла хрысціянства, якое прыйшло на гэтую тэрыторыю праз Скандынавію.

Але больш упэўнена можна сцвярджаць, што хрысціянства ў По-

лацку было прынята прадстаўнікамі вышэйшай знаці ўслед за афіцыйным увядзеннем яго ў Кіеве. Ізяслаў, сын Уладзіміра і Рагнеды, хутка пасля прыняцця новай веры стаў княжыць у Полацку. Аб яго клопаце па распаўсюджванню тут хрысціянства ўскосна сведчыць характарыстыка, дадзеная Ізяславу ў Цвярскім летапісе, дзе сказана, што ён «*прилежаще прочитанию божественных писаний*», гэта значыць, быў вельмі набожны. Княгіня Рагнеда таксама шчыра прыняла новую веру, пашырала яе сярод сваіх суродзічаў-крывічоў павольна, абдумана, высвятляючы сутнасць Хрыстовай навукі. Дзякуючы Рагнедзе з Полацка хрысціянства распаўсюдзілася на ўсю Полаччыну, Смаленшчыну і іншыя крывіцкія землі. Апошнія гады свайго жыцця Рагнеда правяла ў манастыры пад імем чарніцы Анастасіі.

На чале хрысціянскага духавенства ў старажытнай Русі стаяў *мітрапаліт,* які меў рэзідэнцыю ў Кіеве. Прызначаў яго *канстанцінопальскі патрыярх.* Таму першымі кіеўскімі мітрапалітамі былі грэкі ці балгары. Кіеўскаму мітрапаліту былі падпарадкаваны і епіскапы, якія стаялі на чале епархій. У 992 г. узнікла епархія ў Полацку, а ў 1005 г. – у Тураве.

Усталяванне хрысціянства адбывалася аднačасова з існаваннем паганства, таму працэс хрысціянізацыі расцягнуўся на стагоддзі. Трывалымі аказаліся шмат якія язычніцкія традыцыі, як, напрыклад, шанаванне памерлых продкаў («*дзяды*») ці святкаванне Купалля. Хрысціянская царква так і не змагла іх пераадолець, таму многія язычніцкія звычаі не зніклі, а сталі арганічнай часткай хрысціянскай культуры на тэрыторыі Беларусі. У выніку тут усталяваўся так званы *сінкрэтызм* – арганічнае ўзаемаперапляценне старажытных паганскіх уяўленняў з хрысціянскімі.

Вынікі прыняцця хрысціянства былі вельмі значнымі. Распаўсюджанне новай веры садзейнічала развіццю на землях Беларусі пісьменнасці і адукацыі. Пры цэрквах і манастырах перапісваліся кнігі і адкрываліся школы. У беларускіх гарадах вялося летапісанне. Вялікую навуковую каштоўнасць маюць знойдзеныя ў Віцебску і Мсціслаўлі берасцяныя граматы-лісты, змест якіх сведчыць пра тое, што граматай у той час валодалі не толькі прадстаўнікі духавенства і знаці, але і простыя гараджане.

На беларускіх землях разгарнулася мураванае дойлідства. Саборы, царквы і манастыры сталі самымі велічнымі і прыгожымі будынкамі таго часу. Так, маючы шырокія сувязі з Візантыяй і Заходняй Еўропай, Полацк развіваўся як буйны культурны цэнтр з уласнай архітэктурнай школай. У 50-я гады XI ст. у Полацку быў пабудаваны грандыёзны Сафійскі сабор. Ён меў сем купалоў, а ў сярэдзіне быў аздоблены фрэскамі. Сярод помнікаў старажытнага мураванага дойлідства можна назваць Спаскую царкву ў Полацку, Ніжнюю і Барысаглебскую (Каложскую) царквы ў Гродне (другая палова XII ст.). Вядомым помнікам абарончага дойлідства канца XIII ст. з’яўляецца Камянецкая (Белая) вежа. Яна была пабудавана дойлідам Алексам па загаду валынскага князя Уладзіміра Васількавіча як парубежны апорны фарпост і мела шмат агульнага з еўрапейскімі вежамі тыпу «*данжон*».

Хрысціянства прынесла на беларускія землі не толькі пісьменнасць, адукацыю і мастацтва, але і змены ў норавах. Хрысціянская вера ўзвышала чалавека над прыродай, вучыла рабіць дабро і цярпліва пераносіць пакуты зямнога жыцця. Але разам з тым нават у самых складаных жыццёвых сітуацыях у чалавека заставалася надзея на дапамогу Бога. Хрысціянскія запаведзі – не забі, не падмані, не ўкрадзі, шануй бацьку і маці і разам з тым знікненне ўласцівых для язычніцтва ахвярапрынашэнняў і кроўнай помсты – садзейнічалі прагрэсіўнаму развіццю грамадства.

***Ефрасіння Полацкая.*** Найбольшае праяўленне новай культуры знайшло сваё адлюстраванне ў дзейнасці Ефрасінні Полацкай (каля 1120–1173). Яна была ўнучкай Усяслава Чарадзея і ў свецкім жыцці мела імя Прадслава. Ад замуства маладая дзяўчына збегла ў манастыр, пастрыглася ў манашкі і атрымала новае імя – Ефрасіння. Яна заснавала ў Полацку жаночы і мужчынскі манастыры, займалася перапісваннем багаслоўскіх кніг, адкрыла школу, бібліятэку. Па яе замове ў 1161 г. майстар *Лазар Богша* стварыў шэдэўр старажытнабеларускага эмальернага мастацтва – крыж Ефрасінні Полацкай, які знік падчас другой сусветнай вайны.

Ефрасіння Полацкая напрыканцы свайго жыцця здзейсніла падарожжа да «Гасподняй дамавіны» ў Палесціну, дзе і памерла 23 мая

1173 г. Пазней яна была кананізавана праваслаўнай царквой і каталіцкім касцёлам і ўключана ў лік святых беларускай зямлі.

***Кірыла Тураўскі.*** Вялікі ўклад у развіццё старажытнабеларускай культуры ўнёс пісьменнік і прамоўца, выдатны сын Тураўскай зямлі Кірыла Тураўскі (каля 1130–1182). Найбольшую вядомасць яму прынеслі яго «словы», прысвечаныя розным біблейскім сюжэтам, якімі ён імкнуўся схіліць да хрысціянскай веры як мага больш людзей. У 1158 г. ён быў прызначаны Тураўскім епіскапам. Словы і прытчы Кірылы Тураўскага карысталіся сярод насельніцтва шырокай папулярнасцю, за што яго яшчэ пры жыцці менавалі Златавустам.

Прыняцце хрысціянства, безумоўна, было станоўчай з’явай, якая паўплывала на змены маральных каштоўнасцяў усходніх славян, пашырыла іх эканамічныя і палітычныя зносіны з іншымі краінамі, спрыяла развіццю культуры, літаратуры, мастацтва. Хрысціянская вера выпрацоўвала і прыкметна ўзмацняла ў беларусаў мяккасардэчнасць, міласэрнасць, гуманнасць.

Знакамітымі царкоўнымі дзеячамі і пісьменнікамі XII ст. былі *Клімент і Аўраам,* якія жылі і прапаведвалі ў Смаленску, які з’яўляўся адным з цэнтральных гарадоў крывічоў у Верхнім Падняпроўі.

З распаўсюджаннем хрысціянства на тэрыторыі Беларусі ўзнікае *мураванае дойлідства.* Самай старажытнай мураванай пабудовай на тэрыторыі Беларусі з’яўляецца *Полацкі Сафійскі сабор.* Ён быў пабудаваны ў 50-я гады XI ст., адразу пасля як былі пабудаваны такія саборы ў Кіеве і Ноўгарадзе. Сафійскія саборы будаваліся ў сталіцах дзяржаваў і сведчылі пра іх магутнасць і незалежнасць.

Шэдэўрам старажытнага беларускага мастацтва з’яўляецца *крыж Ефрасінні Полацкай*, які зрабіў для яе ў 1161 г. майстар-ювелір *Лазар Богша*.

Такім чынам, культура беларускіх земляў у перыяд ранняга сярэднявечча вылучалася высокім узроўнем развіцця. Вызначальную ролю, безумоўна, адыгралі прыняцце хрысціянства і распаўсюджанне пісьменнасці. Аднак наяўнасць моцных язычніцкіх традыцый надавала адметнасць культурным працэсам на землях усходніх славян.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Веча*** (ад стараславянскага *вет* – рада) – народны сход, орган дзяржаўнай улады (разам з князем) у асобных княствах.

***Волакі*** – назва месца найбольшага збліжэння дзвюх суседніх судаходных рэк, па якому караблі перацягвалі (валаклі) з адной рэчкі ў другую або перавозілі грузы.

***Даніна*** – натуральны аброк. На землях усходніх славян вядомы з IX ст. як асноўны падатак насельніцтва на карысць дзяржавы, а таксама як падатак з заваяваных народаў.

***Натуральная гаспадарка*** – тып гаспадаркі, пры якой усё, што выраблялася, спажывалася ў межах гэтай жа гаспадаркі.

***Палюддзе*** («хадзіць па людзях») – штогадовы аб'езд князем з дружынай падуладных тэрыторый з мэтай збору даніны.

***Паншчына*** – апрацоўка сялянамі зямлі феадала ўласным інвентаром і цяглавай жывёлай.

***Сінкрэтызм*** – арганічнае ўзаемаперапляценне старажытных паганскіх уяўленняў з хрысціянскімі.

***Феадальная раздробленасць*** **–** працэс дзялення раннефеадальных дзяржаў на ўдзельныя княствы.

***Чынш*** – грашовая рэнта.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Вызначце характэрныя рысы феадалізму і назавіце асноўныя віды феадальнай рэнты.
2. Дакажыце, што Полацкае княства з'яўлялася дзяржавай.
3. Вызначце асноўныя напрамкі знешняга гандлю беларускіх земляў у IX–XIII ст.
4. Дакажыце, што на першым этапе феадальная раздробленасць спрыяла развіццю гаспадаркі асобных земляў і росту гарадоў, а затым стала тормазам на шляху эканамічнага развіцця.
5. Вызначце ўплыў хрысціянства на развіццё культуры беларускіх земляў.

# ТЭМА 4. УТВАРЭННЕ І СТАНАЎЛЕННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIII – XV СТ.)

1. *Прычыны ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага.*
2. *Цэнтралізатарская палітыка вялікіх князёў.*
3. *Дзяржаўны лад і органы кіравання ў ВКЛ. Судовая сістэма.*
4. *Сацыяльная структура грамадства ВКЛ.*
5. *Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх земляў у складзе ВКЛ.*
6. *Гарады Беларусі ў XIV–XVI ст.*

***1. Прычыны ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага.*** На пачатку XIII ст. дзяржаваўтваральныя працэсы на землях Беларусі перамясціліся з Полацка на тэрыторыю Наваградскай зямлі. Аб'яднанне вакол яе самастойных удзельных княстваў паклала пачатак узнікненню новай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ).

Сярод асноўных прычын, якія знаходзіліся ў аснове працэсу ўтварэння адзінай цэнтралізаванай дзяржавы, можна вылучыць наступныя:

**1) унутрыпалітычную:** феадальная раздробленасць, якая панавала ў Полацкім княстве з пачатку XII ст., і працяглыя міжусобныя войны паступова прывялі да негатыўных наступстваў у гаспадарчым і палітычным жыцці. У канцы XII ст. на ўсходнеславянскіх землях рэзка зменшылася эканамічнае значэнне гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі». Гандаль паміж краінамі Балтыйскага і Міжземнага мораў пачаў ажыццяўляцца вакол Еўропы, што атрымлівалася хутчэй і танней, чым з выкарыстаннем шляху «з варагаў у грэкі» з яго маруднай і складанай працэдурай волакаў. Разам з тым рост гарадоў, развіццё рамёстваў, удасканаленне сельскай гаспадаркі і паглыбленне грамадскага падзелу працы патрабавалі ўнутрыпалітычнай стабільнасці і тэрытарыяльнай кансалідацыі.

У перыяд феадальнай раздробленасці паглыбілася сацыяльная дыферэнцыяцыя грамадства, абвастрыліся супярэчнасці як паміж саслоўямі, так і сярод феадалаў у барацьбе за панаванне. Усё гэта сведчыла пра неабходнасць усталявання моцнай улады, якая магла б заканадаўча абмежаваць разбуральныя працэсы, аб'яднаць усе сілы грамадства для ўмацавання дзяржавы;

**2) знешнепалітычную:** разрозненыя і аслабленыя беларускія землі з пачатку XIII ст. сталі аб'ектам нападу знешніх ворагаў, асабліва мангола-татараў і крыжакоў.

Мангола-татарскія орды пад кіраўніцтвам Чынгісхана з'явіліся ва Усходняй Еўропе вясной 1223 г. (з 1237 г. іх узначальваў хан Батый). За няпоўныя два дзесяцігоддзі яны падпарадкавалі сабе ўсходнерускія княствы, над якімі больш чым на дзвесце гадоў было ўсталявана мангола-татарскае ярмо, Галіцка-Валынскую зямлю, а ў 1240 г. разбурылі Кіеў. З 1240 г. мангола-татары пачалі перыядычна здзяйсняць набегі на паўднёвыя землі Беларусі. Яны праследавалі *эканамічную мэту* – захоп багацця: палонных, золата, збожжа, футра і інш. Мангола-татары былі качэўнікамі і ніколі не жылі на падпарадкаваных тэрыторыях.

Іншая справа была з крыжакамі-рыцарамі з Заходняй Еўропы, якія кіраваліся ў сваёй дзейнасці хрысціянскімі ідэямі прапаведніцтва. У 1186 г. адзін з першых нямецкіх місіянераў на ўсходнеславянскіх землях манах Мейнард звярнуўся да полацкага князя Уладзіміра з просьбай дазволіць хрысціць падкантрольныя Полацку плямёны ліваў і латгалаў. У 1201 г. місіянеры заснавалі ў вусці Заходняй Дзвіны крэпасць Рыгу і тым самым зачынілі Полацку выхад у Балтыйскае мора.

Услед за крыжам місіянера ішоў меч заваёўніка, і ў 1202 г. быў заснаваны Ордэн мечаносцаў (Лівонскі ордэн), а ў 1228 г. – Тэўтонскі ордэн. Крыжацкія Ордэны былі добра арганізаванымі ваеннымі структурамі. Іх афіцыйнай задачай была абвешчана абарона заснаванага на землях балтаў Каталіцкага касцёла і пашырэнне хрысціянства, але *сапраўднай мэтай рыцараў была палітычная* – захоп і падпарадкаванне новых земляў. Галоўнымі даходамі Ордэна была даніна з мясцовага насельніцтва, таму нямецкія рыцары імкнуліся замацавацца на захопленых тэрыторыях.

Першым цяжар барацьбы з крыжакамі прыняло на сябе Полацкае княства. На пачатку XIII ст. Полацк вымушаны быў саступіць ім дзве асноўныя крэпасці на Заходняй Дзвіне – Кукейнос (1208 г.) і Герцыке (1209 г.) і тым самым аслабіў свае пазіцыі ў Падзвінні.

Такім чынам у сярэдзіне XIII ст. перад беларускімі землямі востра паўстала праблема захавання самастойнасці і неабходнасці арганізацыі дзейснага адпору знешнім ворагам. Ажыццявіць гэта ва ўмовах феадальнай раздробленасці было немагчыма, і таму сярод кіраўнікоў удзельных княстваў і земляў усё большую прывабнасць пачала набываць ідэя аб'яднання. **Перавага палітычных прычын над эканамічнымі адрознівала працэс аб'яднання на беларускіх землях ад аналагічных працэсаў у Заходняй Еўропе.**

У гэтых умовах палітычны цэнтр беларускіх земляў перамяшчаецца з Полацка ў Навагрудак, на той час самы значны горад Панямоння.

У XII–XIII стст. адбыўся хуткі эканамічны росквіт Навагрудка. Асновай эканамічнай магутнасці Навагрудчыны сталі развітое земляробства і рамяство, а таксама актыўны гандаль. Па Нёмане навагрудскія купцы траплялі ў Балтыйскае мора і далей – у гарады Паўночнай і Заходняй Еўропы. Праз развітую сістэму волакаў можна было трапіць у Днепр і Заходнюю Дзвіну, а адтуль адпаведна ў Чорнае і Балтыйскае моры. Пра шырокія гандлёвыя сувязі Навагрудскай зямлі сведчаць знаходкі на яе тэрыторыі скарбаў з арабскімі, візантыйскімі і заходнееўрапейскімі манетамі.

Узвышэнне Навагрудка ў значнай ступені было абумоўлена геапалітычным становішчам – ён размяшчаўся ў пэўнай адлегласці ад асноўных маршрутаў крыжацкіх захопаў і мангола-татарскіх набегаў. Гэта спрыяла прытоку на Навагрудчыну славянскага насельніцтва з больш небяспечных тэрыторый і, як следства, узнікненню і ўмацаванню гарадоў (Слоніма, Ваўкавыска, Свіслачы, Зэльвы і інш.).

Такім чынам у сярэдзіне XIII ст. Навагрудскае княства мела высокі эканамічна-культурны патэнцыял, што, несумненна, уплывала на павелічэнне палітычнай вагі княства сярод суседніх усходнесла-

вянскіх і балцкіх земляў, якія мелі трывалыя ваенна-палітычныя і эканамічныя сувязі з крывічамі. Таму не выпадкова, што ідэя неабходнасці аб'яднання выспела менавіта сярод наваградскай знаці і атрымала падтрымку купцоў і рамеснікаў. Так Наваградак стаў цэнтрам новага дзяржаваўтваральнага працэсу, у выніку якога з'явілася адна з самых буйных дзяржаваў тагачаснай Еўропы – Вялікае Княства Літоўскае.

Праблема ўтварэння ВКЛ канчаткова не вырашана ў гістарыяграфіі, аб чым сведчыць наяўнасць многіх канцэпцый. Іх узнікненне было звязана з рознай палітычнай кан'юнктурай і недакладнай лакалізацыяй *Літвы летапіснай*. Тэрмін «*Літва*» ўпершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах пад 1009 г. у запісах нямецкага горада Кведлінбурга. Большасць беларускіх даследчыкаў лічаць, што Літва летапісная знаходзілася на балцка-славянскім памежжы і займала тэрыторыю паўночнага захаду сучаснай Беларусі і паўднёвага ўсходу сучаснай Літвы.

Важны ўклад у станаўленне дзяржавы зрабіў літоўскі князь (з Літвы летапіснай) Міндоўг, які быў запрошаны на княжанне наваградскай знаццю. Пад 1235 г. у летапісе згадваецца *Літва Міндоўга*. У 1246 г. Міндоўг прыняў праваслаўную веру, як неабходную ўмову для абрання на пасаду князя. Традыцыя запрашэння на княжанне правадыроў з дружынамі была вядома на землях усходніх славян значна раней (Рурык, Рагвалод).

Міндоўг хутка аб'яднаў вакол Наваградскай зямлі тэрыторыю Верхняга Панямоння, і першапачаткова гэтая дзяржава называлася па-рознаму: «Літва», «Літоўскае княства», «княства Літоўскае і Наваградскае» ці нават «Вялікае княства Наваградскае».

Становішча маладой дзяржавы было вельмі хісткім і небяспечным у суседстве з больш моцным Галіцка-Валынскім княствам. Так, паўднёвыя князі ў 1248 г. арганізавалі кааліцыю і спустошылі Наваградскую зямлю. Яны імкнуліся спыніць тут працэс дзяржаваўтварэння. Вайна з галіцка-валынскімі князямі цягнулася пяць гадоў. Каб адстаяць сваю незалежнасць у барацьбе з гэтым ворагам, Міндоўг вымушаны быў заключыць саюз з Лівонскім ордэнам, пагадзіўся прыняць каталіцтва і ў 1252 г. (паводле іншых звестак,

у 1253 г.) каранаваўся. Актам каранацыі Міндоўг хацеў дабіцца міжнароднага прызнання ВКЛ.

Такім чынам, новае дзяржаўнае ўтварэнне, якое стала магчымым дзякуючы ваенна-палітычнаму саюзу славянскага горада Наваградка з балцкім *кунігасам* (князем) Міндоўгам, перамагло ў барацьбе з галіцка-валынскімі князямі. Падначаленне невялікіх княстваў Верхняга Панямоння адзінай уладзе спыніла працэс феадальнай раздробленасці і садзейнічала інтэграцыі жыхароў розных княстваў Беларусі ў рамках адзінай дзяржавы.

Стабільнасць і магутнасць новай дзяржавы дасягаліся не толькі выгадным геапалітычным становішчам, а таксама дыпламатыяй, сілай і крывёю. Пачатковы перыяд утварэння ВКЛ характарызаваўся жорсткай барацьбой за ўладу. Так, шляхам забойства з гістарычнай арэны ў 1263 г. быў выдалены Міндоўг. Расправіўшыся са змоўшчыкамі і забойцамі бацькі, сваю ўладу ў Наваградку ўсталяваў сын Міндоўга *Войшалк* (1264–1267). Ён заключыў саюз з галіцка-валынскімі князямі і, зыходзячы з палітычных інтарэсаў, у 1267 г. перадаў уладу свайму сваяку галіцкаму князю *Шварну* (1267–1270). Але сам ён у гэтым жа годзе быў забіты па загаду галіцка-валынскага князя Льва Данілавіча.

Пасля смерці Шварна ўладу ў ВКЛ атрымаў *Трайдэн* (*Трайдзень*) (1270–1282). Падчас яго кіравання значна пашырыўся знешнепалітычны ўплыў Княства. Трайдэн разарваў саюз Літвы з галіцка-валынскімі князямі, супрацьдзейнічаў ваенным паходам татар на землі ВКЛ, даў прытулак уцекачам ад крыжацкай агрэсіі з Прусіі. Такім чынам Трайдэну ўдалося стабілізаваць унутрыпалітычную сітуацыю ў Княстве і на пэўны час прыпыніць пасяганні ворагаў на незалежнасць ВКЛ.

***2. Цэнтралізатарская палітыка вялікіх князёў.*** Вялікую ролю ва ўмацаванні ВКЛ адыграла цэнтралізатарская палітыка вялікіх князёў *Віценя* (1295–1316), *Гедыміна* (1316–1341) і *Альгерда* (1345–1377).

***Віцень*** змагаўся за ўнутранае адзінства Вялікага Княства. Пра яго палітыку ў летапісах гаворыцца: «*Зямлі прыбавіў да княства*

*многа, аж да Буга»*. Пры ім у 1307 г. да ВКЛ было далучана Полацкае княства, а ў 1315 г. – Берасцейская зямля. Ён вёў актыўную знешнюю палітыку: выступаў супраць палякаў, змагаўся з крыжакамі.

З часоў Віценя (1296) бярэ пачатак і гістарычны герб Беларусі – Пагоня: «*Измысли себе герб и всему княжеству печать: рыцер збройны на коне з мечем, иже ныне наричут погоня*». Пагоня стала гербам дынастыі вялікіх князёў літоўскіх і дзяржаўным гербам ВКЛ. Лёс Віценя, як і многіх іншых князёў ВКЛ, быў трагічны. Праўда, паводле летапісных звестак, загінуў ён не ад рук палітычных супернікаў, а ад удару маланкі.

Такім чынам, сярэдзіна XIII – пачатак XIV ст. былі часам станаўлення і ўмацавання ВКЛ. Пры Віцені гэты працэс стаў незваротны. З пачатку XVI ст. адбываўся імклівы рост ВКЛ у геаграфічнай і палітычнай прасторы Еўропы. Вялікую ролю ў гэтым адыграў Гедымін.

***Гедымін.*** У час княжання Гедыміна ў складзе ВКЛ былі аб'яднаны беларускія землі да Дняпра. Аднак у гэты перыяд неаднойчы спустошаны ў другой палове XIII – пачатку XIV ст. галіцка-валынскімі князямі і крыжакамі, Навaградак прыйшоў у заняпад. Таму Гедымін вырашыў перанесці сталіцу з Навагрaдка ў Вільню, што і было зроблена ў 1323 г. Ёсць сведчанні, што Вільня была заснавана крывічамі, з 1070-х гадоў з'яўлялася цэнтрам Віленскага ўдзела Полацкага княства і да пачатку XIV ст. стала значным палітыка-эканамічным цэнтрам.

Знешняя палітыка Гедыміна мела два асноўныя накірункі: пашырэнне межаў Вялікага Княства і барацьба з крыжацкай агрэсіяй. У адпаведнасці з першай задачай, Гедымін шляхам дынастычнага саюза далучыў да ВКЛ у 1320 г. Віцебскае княства, у 1326 г. – Менск, а пазней – Тураў і Пінск.

Разам з тым з мэтай умацавання дзяржавы і больш паспяховай барацьбы супраць крыжакоў ён у 1325 г. заключыў саюз з польскім каралём Уладзіславам I і загадаў распачаць будаўніцтва магутных умацаванняў у ВКЛ – замкаў па лініі Трокі – Вільня – Меднікі – Крэва – Ліда – Навагрaдак.

Вялікую ролю ў барацьбе з крыжакамі адыграў знакаміты палкаводзец *Давыд Гарадзенскі* (1283–1326). Аб павазе да яго з боку

вялікага князя гаворыць той факт, што Гедымін аддаў яму ў жонкі сваю дачку Біруту. Давыд Гарадзенскі быў паплечнікам Гедыміна, яны неаднаразова разам выступалі супраць крыжакоў і нават арганізавалі паход войска ВКЛ на крыжацкую крэпасць Брандэнбург (1326 г.). Падчас гэтага паходу Давыд Гарадзенскі быў па-здрадніцку забіты падкупленым немцамі мазавецкім рыцарам і, паводле падання, быў пахаваны каля Каложскай царквы ў Гародне. Сам Гедымін таксама загінуў пры аблозе нямецкай крэпасці Баербург у 1341 г.

Роля Гедыміна ва ўмацаванні ВКЛ вельмі вялікая: ён не толькі здолеў абараніць дзяржаву ад ворагаў, але і запрашаў рамеснікаў, гандляроў, адукаваных людзей з еўрапейскіх краін на сталае жыхарства ў ВКЛ, што ў значнай ступені садзейнічала гаспадарчаму і культурнаму росквіту краіны.

***Шляхі ўключэння беларускіх земляў у склад ВКЛ***. Пашырэнне тэрыторыі ВКЛ ажыццяўлялася рознымі шляхамі. Найбольш значным быў *добраахвотна-дагаворны* шлях, які даваў тэрыторыям пэўную аўтаномнасць пры ўваходжанні ў склад новай дзяржавы. Далучэнне да больш моцнага Наваградка і ўмацаванне дзяржаўнай улады гарантавала надзейную абарону ад ворагаў і стварала ўмовы для стабільнага развіцця сельскай гаспадаркі і рамёстваў. Асноўнымі рысамі аўтаномнасці былі наступныя:

- намеснікі і ваяводы прызначаліся толькі са згоды мясцовага насельніцтва;
- існавала мясцовая судовая сістэма;
- на пасады мясцовага кіравання магло быць прызначана толькі мясцовае баярства.

На такіх умовах у 1307 г. у склад ВКЛ увайшла Полацкая зямля, а ў 1320 г. – Віцебскае княства.

Віцебск быў далучаны да ВКЛ на падставе *шлюбных сувязяў*. Віцебскі князь Яраслаў Васількавіч у 1318 г. выдаў сваю дачку замуж за сына Гедыміна Альгерда. Пасля смерці Яраслава князем у Віцебску стаў Альгерд і Віцебскае княства ўвайшло ў склад ВКЛ.

Яшчэ адным шляхам пашырэння тэрыторыі ВКЛ быў *ваенна-палітычны*. Напрыклад, у жорсткай барацьбе з галіцка-валынскімі

князямі ў першай чвэрці XIV ст. пад уладу князёў ВКЛ трапіла Берасцейская зямля.

Феадальныя княствы-дзяржавы, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі, з развітой эканомікай, сістэмай улады, культурай уносілі свае багатыя традыцыі ў новую дзяржаву. Усе народы, якія прымалі ўдзел у палітычным, эканамічным і культурным будаўніцтве Вялікага княства Літоўскага, а найперш беларускі і літоўскі, з'яўляюцца гістарычнымі спадкаемцамі гэтай дзяржавы.

Паколькі на ўсходнеславянскія землі, у тым ліку і беларускія, пісьменнасць прыйшла разам з хрысціянствам у канцы X ст. (у адрозненне ад большасці літоўцаў, якія да 1386 г. заставаліся язычнікамі і пісьменнасці не мелі), старабеларуская мова выконвала ролю дзяржаўнай мовы ў ВКЛ. На ёй складаліся дакументы вялікакняжацкай канцылярыі, судовыя справы і іншыя афіцыйныя дакументы. Таму з улікам гэтага ёсць усе падставы пры вызначэнні дзяржаўнасці ВКЛ ужываць тэрмін «Беларуска-Літоўскае гаспадарства».

***Альгерд.*** Сваім пераемнікам Гедымін прызначыў аднаго з малодшых сыноў – Яўнуція, які ў 1345 г. страціў вярхоўную ўладу ў выніку змовы сваіх братоў Альгерда і Кейстута. Хоць вялікім князем быў абвешчаны Альгерд, па сутнасці ў краіне склалася *двоеўладдзе*. Альгерд кіраваў усходняй часткай Княства з цэнтрам у Вільні і забяспечваў бяспеку краіны з усходу. Пад кіраўніцтвам Кейстута знаходзілася заходняя частка ВКЛ з рэзідэнцыяй у Троках, і, адпаведна, на яго ўскладваўся абавязак барацьбы з крыжакамі. Браты працягвалі справу Гедыміна, павялічылі тэрыторыю дзяржавы ў два разы пераважна за кошт далучэння да Княства славянскіх земляў: Валыні (1352), Браншчыны (1355) і Смаленшчыны (1357). Пасля перамогі войска Альгерда над татарамі ў бітве на рацэ Сінія Воды (1362) да ВКЛ былі далучаны Кіеўшчына і Падолле, а таксама Чарнігаўска-Северская зямля. Пры Альгердзе завяршылася аб'яднанне ў складзе ВКЛ беларускіх земляў.

Такім чынам дамінуючым у дзяржаве стаў усходнеславянскі элемент – 9/10 тэрыторыі і 4/5 насельніцтва былі «рускімі». «Рускімі» ў той час называліся ўсходнеславянскія землі ВКЛ (сённяшнія бе-

ларускія, украінскія, часткова рускія), а іх насельніцтва – «руссю», «русінамі». Суседнюю Маскоўскую дзяржаву называлі Масковіяй, а яе жыхароў – «маскалямі», або «маскавітамі».

Як ужо адзначалася, паўднёва-ўсходні накірунак быў галоўным у знешняй палітыцы Альгерда, і менавіта ў час яго кіравання найбольш выразна праявіліся супярэчнасці ў адносінах з усходнім суседам – Маскоўскім княствам. Першыя супярэчнасці ўзніклі на рэлігійнай глебе яшчэ пры Гедыміне, калі ў 1317 г. была абвешчана Літоўская мітраполія з цэнтрам у Наваградку.

Пасля смерці сваёй жонкі, віцебскай князёўны Марыі Яраслаўны, вялікі князь Альгерд ажаніўся з дачкой цвярскога князя Ульянай, а паколькі Цвер і Масква ў той час вялі барацьбу за першынство ў аб’яднанні ўсходнерускіх земляў, то, натуральна, Альгерд дапамагаў свайму цесцю ў гэтай барацьбе. У 1368, 1370 і 1372 гадах ён здзейсніў тры знакамітыя паходы на Маскву. Падчас першага паходу Альгерд з часткай сваіх рыцараў і знаці ўехаў на тэрыторыю Маскоўскага замка са словамі: «*Княжа вялікі маскоўскі, памятай, што дзіда літоўская стаяла пад Масквою*». Маскоўская дзяржава тады не мела значнай ваеннай сілы, і справы былі вырашаны мірным шляхам. Усходняя мяжа ВКЛ была ўсталявана каля Каломны і Мажайска.

Але гэта быў толькі пачатак супрацьстаяння. На працягу наступных дзесяцігоддзяў Вільня і Масква вялі палітыку «збірання ўсіх рускіх праваслаўных земляў». Сутыкненне паміж ВКЛ і Маскоўскім княствам было непазбежным, паколькі абодва бакі прэтэндавалі на адны і тыя ж тэрыторыі, населеныя праваслаўнымі жыхарамі.

***Ягайла.*** Пасля смерці Альгерда ў ВКЛ пачалася дынастычная барацьба, прычынай якой стала прызначэнне Альгердам сваім спадкаемцам на вялікакняжацкім прастоле не старэйшага сына ад першай жонкі – *Андрэя Полацкага*, а сына ад другой жонкі – *Ягайлы*. З гэтым не пагадзіўся Кейстут, які меў вялікі аўтарытэт у Княстве. Па загадзе Ягайлы ў 1382 г. Кейстут быў забіты, і да барацьбы за трон ВКЛ далучыўся яго сын і стрыечны брат Ягайлы Вітаўт. Барацьба скончылася перамогай Ягайлы, а Вітаўт атрымаў ва ўладанне Берасце і Гародню і згадзіўся на мір.

Вялікае Княства па-ранейшаму знаходзілася пад пагрозай крыжацкай агрэсіі, і для стрымання захопніцкіх памкненняў ворага ішоў актыўны пошук саюзнікаў. Найлепшым спосабам было заключэнне выгаднага шлюбу. На гэтым шляху ў Ягайлы было два варыянты: або ажаніцца з польскай каралевай Ядзвігай, або – з дачкой Дзмітрыя Данскога. Перспектыва парадніцца з маскоўскім князем выглядала зусім нядрэннай, асабліва пасля перамогі Дзмітрыя Данскога на Куліковым полі (1380). Аднак Масква запатрабавала, каб Ягайла прызнаў сябе васалам («малодшым братам») Дзмітрыя Данскога, а таксама ахрысціў у праваслаўе ўсю Літву. Гэта не ўваходзіла ў планы Ягайлы, ён адмовіўся ад ідэі саюза з Масквой і пачаў перамовы з польскімі пасламі.

У 80-я гады XIV ст. унія Вялікага Княства і Кароны адпавядала інтарэсам абедзвюх дзяржаваў, паколькі дазволіла б аб'яднаць сілы для барацьбы з самым галоўным агульным ворагам – Тэўтонскім ордэнам. У гэтым саюзе быў зацікаўлены і каталіцкі касцёл, які атрымаў бы магчымасць мірным шляхам ахрысціць на лацінскі ўзор жамойтаў – апошні язычніцкі народ у Еўропе.

***Крэўская унія.*** 14 жніўня 1385 г. была заключана Крэўская унія, згодна з якой Ягайла атрымаў права ўзяць шлюб з польскай каралевай Ядзвігай, але для гэтага павінен быў выканаць шэраг умоваў:

- перайсці ў каталіцтва;
- ахрысціць паводле каталіцкага абраду ўсіх язычнікаўлітоўцаў;
- стварыць унію (саюз) Вялікага Княства і Кароны.

Крэўская унія была дынастычна-персанальнай, калі дзве дзяржавы аб'ядноўваліся праз асобу манарха, у дадзеным выпадку Ягайлы. Потым паводле права пераемнасці ўзначаліць краіну павінен быў яго прамы нашчадак ад шлюбу з Ядзвігай. Асноўныя пытанні, якія тычыліся двух бакоў, вырашаліся сумесна, але пры гэтым кожная дзяржава захоўвала асобныя органы ўлады, войска і скарб.

Ягайла прыняў каталіцтва і стаў каралём Польшчы Уладзіславам II. У 1387 г. ён выдаў прывілей, паводле якога феадалы ВКЛ каталіцкага веравызнання атрымлівалі неабмежаваныя

правы па распараджэнню сваімі землямі і вызваляліся ад шэрагу дзяржаўных павіннасцяў. На праваслаўную знаць ВКЛ, якая колькасна значна пераважала каталікоў, дзеянне гэтага прывілея не распаўсюджвалася. Натуральна, што гэта выклікала незадаволенасць праваслаўных феадалаў, якія ўбачылі ва ўчынках караля не толькі наступленне на свае правы, але і пэўную пагрозу незалежнасці ВКЛ. Таму ў асяроддзі праваслаўнай (беларускай, украінскай, рускай) знаці ВКЛ пачалі пашырацца сепаратысцкія настроі, якія ў 1389 г. перараслі ў адкрытую ўзброеную барацьбу супраць Ягайлы. Узначаліў гэтае змаганне Вітаўт.

***Вітаўт.*** Трохгадовае супрацьстаянне Вітаўта з Ягайлам скончылася падпісаннем у 1392 г. Востраўскага пагаднення (ад маёнтка Вострава пад Лідай). Згодна з гэтай дамовай, Ягайла прызнаў Вітаўта вялікім князем ВКЛ, хоць намінальна яшчэ захоўваў свой вярхоўны сюзерэнітэт. Такім чынам з падпісаннем Востраўскага пагаднення унія Кароны і Вялікага Княства стала саюзам дзвюх раўнапраўных дзяржаваў.

На пасадзе вялікага князя Вітаўт заняўся ўмацаваннем улады і цэнтралізацыяй краіны, ператвараючы яе ў магутную еўрапейскую дзяржаву. Летапісы слушна называлі яго Вітаўтам Вялікім. Пры ім ВКЛ дасягнула найбольшай магутнасці і тэрытарыяльных памераў, стала самай буйной дзяржавай у Еўропе «ад мора да мора» (ад Балтыкі да Чорнага мора).

Для ажыццяўлення сваіх планаў ён у якасці саюзніка вырашыў выкарыстаць татарскага хана Тахтамыша, які ўцёк з Залатой Арды і са згоды вялікага князя пасяліўся ў ВКЛ, пад Лідай. Апроч таго, у 1398 г. Вітаўт заключыў новы саюз з Тэўтонскім ордэнам.

Але грандыёзныя намеры вялікага князя значна паменшыліся пасля разгрому арміі ВКЛ татарскім войскам пад кіраўніцтвам ханаў Цімура і Едзігея на рацэ Ворскле ў 1399 г. Пасля гэтай трагедыі становішча ВКЛ увогуле і ўлада Вітаўта ў прыватнасці значна пахіснуліся. Узбунтаваліся Смаленск, Ноўгарад і іншыя гарады. Вітаўт разумеў, што гэтая сітуацыя з'яўляецца вельмі прыдатнай і для ўзмацнення крыжацкай агрэсіі на землі ВКЛ, і таму вырашыў змяніць вектар знешняй палітыкі з усходняга на заходні.

У гэтых умовах Вітаўт пайшоў на аднаўленне саюза з Польшчай. У 1401 г. была заключана Віленска-Радамская унія, паводле якой пацвярджалася палітычная самастойнасць Вялікага Княства. Улада ў ВКЛ прызнавалася пажыццёва за Вітаўтам, а пасля яго смерці павінна была перайсці да Ягайлы ці ягоных нашчадкаў. Калі б Ягайла памёр бяздзетным, то польскія феадалы павінны былі б узгадніць кандыдатуру караля з Вітаўтам.

Важным пунктам гэтага пагаднення было абавязацельства абедзвюх дзяржаваў дзейнічаць разам супраць знешніх ворагаў, галоўным з якіх на той час заставаўся Тэўтонскі ордэн. З кожным годам крыжацкая агрэсія набірала сілу, і было зразумела, што справа дойдзе да адкрытых ваенных дзеянняў.

Перыяд 1409–1411 гг. увайшоў у гісторыю пад назвай Вялікай вайны ВКЛ і Кароны супраць Ордэна. Княства імкнулася вярнуць сабе Жамойцію, а Карона – Памор'е. Для забеспячэння тылу яны заключылі пагадненне з Маскоўскай дзяржавай. Ордэн таксама шукаў падтрымку ў Еўропе – у Венгрыі і Чэхіі.

Цэнтральнай падзеяй Вялікай вайны стала ***Грунвальдская бітва***, якая адбылася 15 ліпеня 1410 г. каля вёскі Грунвальд ва Усходняй Прусіі паміж аб'яднаным войскам ВКЛ і Польскай Кароны, з аднаго боку, і арміяй Тэўтонскага ордэна, з другога. Саюзным войскам кіраваў Ягайла, але асабіста ўдзел у бітве не прымаў, у адрозненне ад Вітаўта, які ўзначальваў войска ВКЛ непасрэдна на полі бою. Войскамі Ордэна кіраваў вялікі магістр Ульрых фон Юнгінген. Грунвальдская бітва скончылася поўнай перамогай саюзнай арміі над крыжакамі. Тэўтонскі ордэн страціў сваю былую веліч і славу і больш не здолеў яе ўзнавіць. Такім чынам, у выніку бітвы пад Грунвальдам не толькі была спынена двухсотгадовая агрэсія нямецкіх рыцараў на ўсход, але і былі зменены агульныя суадносіны сіл ва Усходняй Еўропе на карысць славянскіх народаў.

Вынікі перамогі былі замацаваны падпісаннем 1 лютага 1411 г. у г. Торунь мірнага дагавора паміж Нямецкім ордэнам, з аднаго боку, і Каронай і ВКЛ, з другога (Тарунскі мір).

***Гарадзельская унія.*** Перамога надала ўпэўненасці Вялікаму княству Літоўскаму, і Вітаўт яшчэ больш імкнуўся да пашырэння

самастойнасці ВКЛ. Межы Княства сягалі ад Балтыкі да Чорнага мора і ад Смаленска да Беластока, і ў канцы XIV – пачатку XV ст. тэрыторыя ВКЛ складала каля 900 тыс. кв. км.

Але з другога боку, Ягайла хацеў замацаваць васальнае становішча Вялікага Княства і рабіў захады да аднаўлення уніі. У кастрычніку 1413 г. у Гарадзельскім замку над Бугам адбыўся з'езд польскіх феадалаў і феадалаў ВКЛ каталіцкага веравызнання ў прысутнасці манархаў дзвюх краін. Вынікам гэтага з'езда стала падпісанне трох прывілеяў, якія і склалі акт новай Гарадзельскай уніі.

Паводле асноўных яе палажэнняў, правы на дзяржаўныя пасады і іншыя правы (напрыклад, права ўдзельнічаць у выбарах вялікага князя, мець родавыя гербы, свабодна распараджацца сваёй зямлёй і інш.) належалі ў ВКЛ выключна каталіцкай знаці. З мэтай найбольш шчыльнага збліжэння Кароны і ВКЛ 47 феадалаў-каталікоў Вялікага Княства прынялі гербы польскай шляхты і тым самым утварылі гербавае братэрства. На пераважную большасць шляхты ВКЛ, якая заставалася праваслаўнай, прывілеі Гарадзельскай уніі не распаўсюджваліся. Гэтая падзея яшчэ больш абвастрыла адносіны паміж каталіцкай і праваслаўнай шляхтай ВКЛ і, каб забяспечыць свае інтарэсы, прымусіла апошнюю або пераходзіць у каталіцтва, або змагацца за свае правы і шукаць падтрымкі ў праваслаўнай Маскоўскай дзяржаве.

Вітаўт разумеў складанасць становішча. Каб пазбегнуць унутранага антаганізму ў дзяржаве на рэлігійнай глебе і спыніць на сваіх землях, асабліва на ўсходзе, узрастаючы ўплыў Масквы, ён у 1415 г. стварыў самастойную праваслаўную мітраполію з цэнтрам у Навагрудку, а таксама агучыў ідэю аб магчымасці заключэння уніі праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла ў ВКЛ. Але унія не адбылася, супрацьстаянне каталіцызма і праваслаўя не было ліквідавана, і менавіта гэта стала прычынай грамадзянскай вайны ў дзяржаве ў 30-я гады XV ст.

У 20-я гады XV ст. Вітаўт стаў палітычным лідэрам Усходняй Еўропы: у Залатой Ардзе кіравалі яго стаўленнікі, праз яе ён уплываў на справы Маскоўскай Русі. Ён зрабіў спробу каранацыі на літоўскага караля. Аднак яна была сарваная праціўнікамі ўзмацнення ВКЛ.

***Грамадзянская вайна ў ВКЛ (1432–1436).*** Пасля смерці Вітаўта ў 1430 г. на з'ездзе знаці ў Вільні пры падтрымцы праваслаўнага баярства вялікім князем ВКЛ быў абраны малодшы брат Ягайлы *Свідрыгайла*, які выступаў за ўмацаванне дзяржавы з апорай на праваслаўную шляхту. Унутранае становішча ў ВКЛ пачало мяняцца – дзяржаўныя пасады ў краіне пераходзілі да прадстаўнікоў магутных праваслаўных родаў (Хадкевічаў, Друцкіх, Корсакаў і інш.), якія і вырашалі галоўныя пытанні дзяржаўнага развіцця.

Па сутнасці, Свідрыгайла не ўлічыў памылкі папярэдняга перыяду, і яго палітыка не вяла да ліквідацыі рэлігійна-палітычнага антаганізму сярод вышэйшых колаў ВКЛ, а, наадварот, яшчэ больш яго ўзмацняла. Каталіцкая арыстакратыя не хацела мірыцца са стратай палітычнай магутнасці ў Княстве, што прывяло да арганізацыі змовы супраць вялікага князя. 1 верасня 1432 г. быў зроблены замах на жыццё Свідрыгайлы, але ён здолеў уратавацца ўцёкамі ў Полацк. У выніку на віленскі трон уступіў брат Вітаўта *Жыгімонт Кейстутавіч*, якога прызналі Літва, Берасцейская і Менская землі, а таксама Прынёманскія валасці. Астатнія тэрыторыі захавалі вернасць Свідрыгайлу.

Такім чынам, на некаторы час ВКЛ распалася на два дзяржаўных утварэнні: *Вялікае княства Літоўскае* з цэнтрам у Вільні, на чале якога стаяў Жыгімонт, і *Вялікае княства Рускае* з цэнтрам у Полацку, якое ўзначальваў Свідрыгайла. Паміж імі пачалася феадальная вайна, якая доўжылася чатыры гады.

Жыгімонт зрабіў важныя палітычныя крокі, калі ў 1432 і 1434 гадах выдаў два прывілеі, паводле якіх праваслаўнае баярства было ўраўнаванае ў правах з каталіцкім, акрамя права ўдзелу ў вялікакняжацкай Радзе. У выніку Свідрыгайла згубіў шмат сваіх прыхільнікаў і ў верасні 1435 г. пацярпеў канчатковае паражэнне – яго войска было разбіта пад Вількамірам, а сам Свідрыгайла ў чарговы раз ратаваўся ўцёкамі, гэты раз на Валынь. Але феадалаў ВКЛ не задавальняла і палітыка Жыгімонта. Супраць яго ў сакавіку 1440 г. была арганізаваная змова, і Жыгімонт быў забіты ў Трокскім замку.

Гаспадаром ВКЛ быў абраны малодшы сын Ягайлы *Казімір Ягелончык* (1440–1492). Пасля смерці свайго брата, польскага караля

Уладзіслава III, з 1447 г. Казімір адначасова стаў і каралём Польшчы. Пры гэтым з усіх кіраўнікоў абедзвюх краін ён заставаўся, бадай, адзіным, хто клапаціўся і дбаў пра дзяржаўныя інтарэсы ВКЛ. Пры ім у 1447 г. быў выдадзены прывілей, які замацоўваў суверэнітэт ВКЛ і гарантаваў, што землі і дзяржаўныя пасады ў ВКЛ будуць атрымліваць толькі ўраджэнцы ВКЛ. Казімір імкнуўся ліквідаваць рэлігійны антаганізм у Вялікім Княстве, садзейнічаў будаўніцтву цэркваў і праваслаўных манастыроў. Апроч таго, у ВКЛ пашыраліся правы праваслаўнай царквы, якая ў 1458 г. канчаткова вызвалілася з-пад улады маскоўскага мітрапаліта і падпарадкавалася непасрэдна канстанцінопальскаму патрыярху. У перыяд кіравання Казіміра Ягелончыка быў выдадзены першы кодэкс крымінальнага права ў ВКЛ, напісаны на старабеларускай мове, – *Судзебнік 1468 г.*

У той жа час Казімір быў схільны перадаць Польшчы Падолле і Валынь, што прывяло да арганізацыі ў 1481 г. змовы праваслаўных феадалаў ВКЛ супраць манарха. Але змова была раскрытая, а вінаватыя пакараны смерцю.

Пры кіраўніцтве Казіміра Ягелончыка ВКЛ не вяло, як раней, актыўнай знешняй палітыкі, накіраванай на пашырэнне тэрыторыі дзяржавы і аб’яднанне ўсходнеславянскіх земляў. Гэтую ідэю пераняў усходні сусед ВКЛ – Маскоўскае княства, якое заключыла саюз з Крымскім ханствам і праз паўстагоддзя паступова пачало ператварацца ў галоўнага палітычнага праціўніка ВКЛ.

***Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ВКЛ***. У XIII–XIV ст. адміністрацыйны падзел ВКЛ заставаўся ў асноўным у старых межах, якія існавалі паміж асобнымі княствамі да ўваходжання іх у склад адзінай дзяржавы. У сярэдзіне XIV ст. ВКЛ было падзелена паміж Альгердам і Кейстутам на дзве ваенна-адміністрацыйныя акругі: Віленскую і Трокскую, якія з 1413 г. сталі называцца *ваяводствамі*.

У канцы XIV – пачатку XV ст. Вітаўт ліквідаваў княжацкія пасады ў Полацку, Віцебску і Наваградку і прызначыў у гэтыя землі сваіх намеснікаў. На працягу XV ст. намесніцтвы называліся *старостамі* або *паветамі*.

У 1565–1566 г. у ВКЛ была праведзена адміністрацыйная рэфор-

ма, у адпаведнасці з якой было ўтворана 13 ваяводстваў і 30 паветаў, з якіх на беларускіх землях Княства было 8 ваяводстваў (Віленскае, Трокскае, Полацкае, Наваградскае, Віцебскае, Берасцейскае, Мсціслаўскае, Менскае) і 16 паветаў. Гэты адміністрацыйны падзел быў замацаваны Статутам Вялікага княства Літоўскага 1588 г. і захаваўся да канца XVIII ст.

***3. Дзяржаўны лад і органы кіравання ў ВКЛ. Судовая сістэма.*** Палітычны лад ВКЛ прайшоў шматвяковую эвалюцыю, аб'яднаўшы рысы іншаземных сістэм кіравання і традыцыі, якія існавалі ў Полацкім і іншых беларускіх княствах. З самага пачатку свайго існавання ВКЛ складвалася як неабмежаваная феадальная манархія. На чале дзяржавы стаяў вялікі князь – *гаспадар*. У яго кампетэнцыю ўваходзілі:

- камандаванне ўзброенымі сіламі;
- выданне заканадаўчых актаў;
- прызначэнне на вышэйшыя дзяржаўныя пасады;
- паўнамоцтвы вышэйшага суддзі;
- абвяшчэнне вайны і заключэнне міра;
- вызначэнне накірункаў знешняй палітыкі;
- распараджэнне дзяржаўнымі фінансамі і інш.

У XIII–XIV ст. многія важныя дзяржаўныя пытанні ён вымушаны быў узгадняць з васальнымі князямі і найбольш уплывовымі феадаламі, якія ажыццяўлялі выканаўча-распарадчую і судовую ўладу на месцах. У выніку пры князі ўзнік дарадчы орган, які атрымаў назву *Рада Вялікага княства Літоўскага (Паны-рада)*. Першапачаткова яе склад вызначаўся гаспадаром па яго ўласным выбары. Але роля Рады пастулова ўзрастала, а з увядзеннем практыкі займання вялікімі князямі ВКЛ адначасова і трона Польскай Кароны, частымі сталі ад'езды манарха ў Польшчу. Па закону, знаходзячыся па-за межамі ВКЛ, гаспадар не меў права кіраваць дзяржаўнымі справамі Княства.

У такіх умовах у 1492 г. новаабраны князь *Аляксандр* (1492–1506), сын Казіміра Ягелончыка, выдаў прывілей, па якому абмяжоўваліся правы вялікага князя і пашыраліся правы Паноў-рады. Згодна

з прывілеем, вялікі князь не меў права адмяняць або змяняць законы, пастановы і судовыя рашэнні, прынятыя разам з Радай. Больш за тое, яе пастановы, прынятыя большасцю галасоў, павінны былі выконвацца вялікім князем. Такім чынам Рада паступова стала заканадаўчым, выканаўча-распарадчым, судовым і кантралюючым органам, які юрыдычна абмяжоўваў уладу вялікага князя.

У склад Рады ўваходзілі: *віленскі біскуп, ваяводы, кашталяны,* некаторыя *старосты, маршалак земскі, канцлер, падскарбі земскі, гетман*, іншыя прыдворныя чыны, а таксама некаторыя буйныя феадалы па асабістых запрашэннях. *Ваяводы* ўзначальвалі адміністрацыйныя, гаспадарчыя, ваенныя і судовыя органы ваяводства; *гетман* адказваў за камплектаванне войска ВКЛ і камандаваў усімі ўзброенымі сіламі дзяржавы ў выпадку, калі іх не ўзначальваў сам вялікі князь; *канцлер* загадваў дзяржаўнай канцылярыяй і захоўваў дзяржаўную пячатку, пад яго наглядам афармляліся ўсе пастановы і прывілеі; *кашталян* камандаваў войскам галоўнага замка ваяводства, а пры адсутнасці ваяводы – усімі ўзброенымі сіламі ваяводства; *маршалак земскі* – адна з вышэйшых службовых пасад у ВКЛ, старшыня на пасяджэннях сойма і Рады, сачыў за этыкетам і парадкам падчас афіцыйных цырымоній; *падскарбі* загадваў дзяржаўнымі фінансамі і даглядаў скарб, вёў дакладны ўлік прыбыткаў і выдаткаў; *староста* – кіраўнік адміністрацыі ў павеце.

На пасяджэннях Рады вырашаліся пытанні дзяржаўнага кіравання, міжнародных зносін, прызначэння на кіруючыя пасады, падрыхтоўкі важнейшых заканадаўчых актаў, разглядаліся некаторыя судовыя справы. У поўным складзе Рада збіралася некалькі разоў у год. Бягучыя справы кіравання дзяржавай вырашала так званая Пярэдняя Рада, у якую ўваходзілі маршалак земскі, канцлер, падскарбі земскі, гетман, ваяводы і кашталяны.

Для вырашэння найбольш важных дзяржаўных справаў (выбары князя, пытанні вайны і міра, арганізацыя абароны, прызначэнне надзвычайных падаткаў і інш.) з XV ст. пачаў збірацца *вальны сойм*. Ён з’яўляўся органам саслоўна-прадстаўнічай дэмакратыі ў ВКЛ. Першапачаткова сістэмы прадстаўніцтва не існавала, і на

сойм, як правіла, запрашалася ўся шляхта. Але з 1512 г. было ўведзена ў практыку вылучэнне на вальны сойм па 2 дэпутаты (паслы) ад кожнага павета. Акрамя таго, на соймы асабіста запрашаліся вярхі каталіцкага і праваслаўнага духавенства, службовыя асобы цэнтральнага і часткова мясцовага кіравання. Найчасцей соймы збіраліся ў Вільні, а таксама ў Гародні, Наваградку, Берасці, Менску, Слоніме. Яны праводзіліся як у закрытых памяшканнях (замках, гаспадарскіх дварах), так і на плошчах гарадоў.

У пачатку XVI ст. вальны сойм набыў значэнне заканадаўчага і кантралюючага органа. Галоўнымі яго функцыямі былі:

- выбары вялікага князя;
- прызначэнне падаткаў на войска;
- абвяшчэнне вайны і заключэнне міра;
- разгляд крымінальных спраў вышэйшых дзяржаўных асобаў і знатных паноў.

Саслоўна-прадстаўнічымі органамі ў ваяводствах і паветах былі *соймікі*, на якіх абмяркоўваліся мясцовыя і агульнадзяржаўныя справы, выбіраліся дэпутаты на вальны сойм, выпрацоўваліся інструкцыі, хадайніцтвы і просьбы да вялікага князя.

У адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам ВКЛ, які канчаткова аформіўся ў XVI ст., мясцовае кіравнне выглядала наступным чынам: ваяводства ўзначальваў *ваявода*, павет – *староста*, воласцю кіраваў *сельскі войт,* а ў вёсцы на чале сельскай абшчыны быў *старац*.

Асобнае месца ў сістэме кіравання ВКЛ займалі гарады, якія мелі *магдэбургскае права.* Упершыню яно ўзнікла ў XIII ст. у Еўропе, а з 80-х гадоў XIV ст. атрымала распаўсюджанне на землях ВКЛ. Першым горадам, які атрымаў магдэбургскае права ў Княстве, была Вільня (1387), затым Берасце (1390) і інш. Прывілеі на магдэбургскае права гарадам давалі ўласнікі – вялікія князі або прыватныя феадалы.

Магдэбургскае права давала гарадам судовы імунітэт, падатковыя льготы, права валодання зямлёй, ільготы ў рамеснай і гандлёвай дзейнасці, вызваляла ад воінскай павіннасці. У адпаведнасці з прывілеем, у гарадах ствараўся выбарны орган самакіравання –

*магістрат*. Ён складаўся з гарадской *рады* і *лавы*. На чале магістрата стаяў *войт*, якому належала вышэйшая судовая і выканаўчая ўлада ў горадзе. Гарадская рада, на чале якой стаялі *бурмістры*, разглядала маёмасныя і грамадзянскія справы мяшчан, а лава судзіла крымінальныя справы. Войтаўска-лаўніцкі суд (лаву) узначальваў войт. Засядаў гарадскі магістрат у спецыяльным будынку – ратушы, якая звычайна размяшчалася ў цэнтры горада.

Такім чынам, па форме кіравання Вялікае княства Літоўскае можна вызначыць як саслоўна-прадстаўнічую манархію, што разам з наяўнасцю магдэбургскага права ў гарадах цалкам адпавядала традыцыям тагачасных еўрапейскіх дзяржаваў.

***Судовая сістэма*** ВКЛ спалучала дзве сістэмы судоў: *агульнасаслоўныя* суды і *саслоўныя*.

**1. *Агульнасаслоўныя суды***. Найвышэйшым судом у ВКЛ быў *гаспадарскі* (вялікакняжацкі) суд. Вялікі князь быў вярхоўным суддзёй па ўсіх справах, што заканадаўча было замацавана ў Судзебніку 1468 г. Ён разглядаў апеляцыі на рашэнні саслоўных судоў, справы аб дзяржаўных злачынцах, аб прыналежнасці да шляхецкага саслоўя і інш. З 1581 г. вышэйшай судовай інстанцыяй стаў *Трыбунал Вялікага княства Літоўскага.*

Агульнасаслоўным судом быў таксама *замкавы (гродскі)* суд. Суд разглядаў крымінальныя злачынствы шляхты, мяшчан і сялян, якія былі затрыманы на месцы злачынства («па гарачым учынку»). Суддзямі былі ваяводы, старосты і дзяржаўцы.

***2. Саслоўныя суды***. У паветах існавалі: *земскі* суд, які разглядаў грамадзянскія зыскі і крымінальныя справы шляхты, і *падкаморскі* суд, у кампетэнцыю якога ўваходзіла прыняцце рашэнняў па спрэчках землеўладальнікаў па зямельных пытаннях.

Як ужо адзначалася, у гарадах з магдэбургскім правам галоўным быў *войтаўска-лаўніцкі* суд, які разглядаў крымінальныя і грамадзянскія справы, а таксама *бурмістраўскі*, у якім разбіраліся спрэчкі паміж мяшчанамі і нязначныя правапарушэнні.

Справы простых людзей у воласці, а таксама ў гарадах, якія не мелі магдэбургскага права, разглядаў *копны* суд – суд сельскай або гарадской грамады. Суддзямі былі простыя жыхары, якія

дзейнічалі пад наглядам дзяржаўнай або панскай адміністрацыі. Капа разглядала грамадзянскія справы, межавыя спрэчкі, дробныя крадзяжы і сваркі, чараўніцтва. Копны суд дзейнічаў на падставе звычаёвага права.

Вялікае значэнне з XV ст. набываў *вотчынны* суд. Прывілеем 1447 г. было рэгламентавана судовае права феадалаў, а залежнае ад яго насельніцтва было пазбаўлена магчымасці шукаць абароны ў дзяржаўных органах. Галоўным суддзёй у вотчынным судзе быў сам феадал ці яго службовыя асобы.

Такім чынам, судовая сістэма Вялікага княства Літоўскага грунтавалася на двух відах права: на *звычаёвым праве* – сістэме няпісаных прававых нормаў, якія ўзніклі непасрэдна з грамадскіх дзеянняў і былі заснаваны на даўнасці дзеяння (традыцыі, звычаі), і на *прававых дзяржаўных актах*. Вышэйшай ступенню судовага заканадаўства ў дзяржаве сталі Статуты ВКЛ 1529, 1566, 1588 г.

***4. Сацыяльная структура грамадства ВКЛ.*** Усё насельніцтва ВКЛ належала да чатырох асноўных *саслоўяў* – сацыяльных супольнасцяў, прадстаўнікі якіх мелі аднолькавае прававое становішча: *шляхты, духавенства, мяшчан* і *сялян*. Шляхта і духавенства адносіліся да «*шляхетнага стану*», былі прывілеяванымі саслоўямі і вызваляліся ад выплаты дзяржаўных падаткаў. Мяшчане і сяляне ў дакументах называліся «*людзі простага стану*», былі непрывілеяванымі саслоўямі і асноўнымі падаткаплацельшчыкамі.

***Шляхта.*** Слова «*шляхта*» паходзіць ад старажытнанямецкага *slahta,* што азначае *род, парода*. У ВКЛ шляхта займала пануючае становішча, эканамічнай асновай гэтага была феадальная ўласнасць на зямлю. Па свайму маёмаснаму становішчу і палітычнай ролі ў жыцці дзяржавы шляхецкае саслоўе не было аднародным:

– *магнаты* (*паны*) – прадстаўнікі радавітай арыстакратыі, якія мелі княжацкія тытулы (Радзівілы, Сапегі, Тышкевічы, Астрожскія, Хадкевічы, Друцкія, Алелькавічы, Гальшанскія і інш.). Яны валодалі вялікімі зямельнымі ўладаннямі і займалі важныя пасады ў дзяржаўным апараце;

– *баяры* (*шляхта*) – ваенна-служылыя людзі ў ВКЛ. У XIV–XV ст. гэта была асноўная маса феадалаў (сярэднія і дробныя землеўласнікі), якія за валоданне зямлёй павінны былі несці ваенную службу пад харугвамі вялікага князя ці буйнога зямельнага ўласніка, удзельнічаць у *паспалітым рушэнні*. Узаемаадносіны паміж рознымі групамі шляхты грунтаваліся на прынцыпах феадальнай іерархіі, што абумовіла эканамічную залежнасць малазаможнай і незаможнай шляхты ад магнатаў.

Прадстаўнікі шляхецкага саслоўя мелі шэраг палітычных і асабістых правоў:

- выключнае (манапольнае) права валодання зямлёй (прывілеі 1387, 1432, 1434 гадоў гарантавалі права ўласнасці на выслужаныя ў вялікага князя вотчыны);
- права судовага імунітэту (не маглі быць пазбаўлены свабоды без суда);
- права выбіраць і быць выбранымі ў органы кіравання;
- права мець свой герб і інш.

Шляхта была вайсковым саслоўем, удзельнічала ў войнах, адыгрывала вялікую ролю ў палітычным, гаспадарчым і культурным жыцці. У XVI ст. колькасць шляхты, якая мела землі на тэрыторыі Беларусі, складала каля 9% ад агульнай колькасці насельніцтва.

***Духавенства*** – прафесійныя служачыя культу, якія прадстаўлялі ў ВКЛ розныя канфесіі: *хрысціянскія* (праваслаўную, каталіцкую, пратэстанцкую і уніяцкую), *мусульманскую* і *іудзейскую*. Унутры канфесій сярод духавенства таксама існавала іерархія:

- праваслаўнае духавенства ў ВКЛ узначальваў кіеўскі *мітрапаліт*, на чале епархій стаялі *архіепіскапы* і *епіскапы*, прыходамі кіравалі *настаяцелі (святары)*;
- на чале каталіцкага духавенства ВКЛ стаяў *арцыбіскуп*, яму былі падначалены *біскупы*, парафіямі кіравалі *ксяндзы*;
- у іудаізме духавенства не мела разгалінаванай структуры. Яўрэйскія абшчыны (*кагалы*) выбіралі *равінаў*, якія выконвалі рэлігійныя функцыі;
- рэлігійныя функцыі ў мусульманскіх прыходах ажыццяўлялі *мулы (імамы)* і іх памочнікі – *муэдзіны*.

Па свайму сацыяльна-юрыдычнаму статусу вышэйшае хрысціянскае духавенства належала да шляхты.

Шляхта і духавенства не плацілі дзяржаўных падаткаў.

***Мяшчане***. Тэрмін «*мяшчане*» (ад слова «места» – горад) за жыхарамі гарадоў ВКЛ быў замацаваны ў другой палове XV ст., а юрыдычна афармлены ў Статутах ВКЛ у XVI ст. Мяшчанства дзялілася на тры асноўныя групы:

- *патрыцыят,* у які ўваходзілі вышэйшая гарадская адміністрацыя, вышэйшае духавенства і буйныя купцы;
- *сярэдні слой,* які складалі рамесныя майстры, уладальнікі лавак, гандляры, неэлітнае духавенства, дробныя службовыя асобы;
- *гарадскі плебс («чорныя людзі») – каморнікі, гультаі, парабкі.*

Мяшчане былі непрывілеяваным саслоўем, яны плацілі дзяржаўныя падаткі і выконвалі гарадскія павіннасці.

***Сяляне.*** Самай вялікай сацыяльнай групай феадальнага грамадства былі *сяляне*. Катэгорыі сялян вызначаліся па наступных прыкметах:

- у адпаведнасці з тым, на чыёй зямлі жылі сяляне, іх падзялялі на *дзяржаўных*, *прыватнаўласніцкіх і царкоўных*;
- у залежнасці ад выканання асноўных павіннасцяў вызначаліся сяляне *даннікі* (давалі даніну), *чыншавікі* (плацілі чынш), *цяглыя* (адпрацоўвалі паншчыну) і *сяляне-слугі*, асноўным абавязкам якіх было выкананне павіннасцяў, што патрабавалі спецыяльных навыкаў (*цівуны*, *пушкары*, *піваvары*, *асочнікі*, *бортнікі* і інш.). Сяляне-слугі былі ў дзяржаўных, прыватных і царкоўных уладаннях, а іх сацыяльны статус быў больш высокі, чым іншых катэгорый сялян;
- па ступені забяспечанасці зямлёй і сродкамі вытворчасці, акрамя вышэйпералічаных катэгорый, якія мелі ў карыстанні зямлю і плацілі падаткі, вылучаюць «*людзей лёзных*» (асобы без пэўных абавязкаў, пастаяннага месца жыхарства, якія не займаліся карыснай працай), *агароднікаў* (сяляне, якія сяліліся на невялікіх надзелах зямлі і выконвалі вызначаныя павіннасці); *бабылёў-кутнікаў* або *халупнікаў* (беззямельныя

сяляне, некаторыя мелі хаты, часам жывёлу і агароды, іншыя нічога не мелі, жылі ў чужых хатах, займаючы кут або камору).

Гісторыю сялянства Беларусі ў складзе ВКЛ вучоныя падзяляюць на два перыяды:

1) *XIII – сярэдзіна XVI ст. (да валочнай памеры)*. У гэты час сяляне ў асноўным плацілі даніну вырабамі прадукцыі сельскай гаспадаркі і промыслаў і па свайму становішчу падзяляліся на *«людзей пахожых»* (мелі права пераходу ад аднаго феадала да другога пасля збору ўраджаю і выплаты ўсіх падаткаў), *«людзей непахожых»* (страцілі волю і належалі феадалу на аснове вотчыннага права і не маглі яго пакінуць) і *«чэлядзь нявольную»* (хатніх рабоў);

2) *сярэдзіна XVI ст.*, калі, з аднаго боку, пачала шырока выкарыстоўвацца рэнта грашыма, а з другога – паскорыўся перавод сялян на адпрацовачныя павіннасці і юрыдычна аформілася прыгоннае права.

***Этапы запрыгоньвання сялянства***:

1) ***XIII–XV ст.*** – канцэнтрацыя зямельнай уласнасці ў руках феадалаў і ўзмацненне гаспадарчай залежнасці сялян ад іх;

2) ***1447 г.*** – *Прывілей Казіміра Ягелончыка.* Паклаў пачатак юрыдычнаму афармленню прыгоннага права. Забараняў феадалам прымаць «чужых» (збеглых) сялян і даваў права феадалам судзіць залежнае насельніцтва;

3) ***1468 г.*** – *Судзебнік Казіміра Ягелончыка.* Сяляне пазбаўляліся права свабоднага пераходу ад аднаго феадала да другога. Прадугледжвалася суровае пакаранне асоб, якія садзейнічалі ўцёкам «чэлядзі нявольнай» і залежных сялян;

4) ***1529 г.*** – *Першы Статут Вялікага княства Літоўскага*. Уведзены 10-гадовы тэрмін земскай даўнасці – «пахожыя» сяляне, якія 10 гадоў пражылі на зямлі аднаго феадала, станавілся «непахожымі». На працягу 10 гадоў дазвалялася вяртаць збеглых «непахожых» людзей у феадальныя маёнткі;

5) ***1557 г.*** – у адпаведнасці з аграрнай рэформай (*валочнай памерай*) адбылося пашырэнне фальваркава-паншчыннага спосабу гаспадарання. Паводле «*Уставы на валокі*» ад 1 красавіка 1557 г., уве-

дзенай Жыгімонтам Аўгустам, селянін і яго маёмасць прызнаваліся ўласнасцю феадала;

6) ***1588 г.*** – *Трэці Статут ВКЛ.* Завяршыў працэс юрыдычнага афармлення прыгоннага права. Сяляне страцілі асабістую свабоду і ператварыліся ў прыгонных («людзей непахожых»).

Такім чынам, у сацыяльнай структуры ВКЛ прывілеяванае становішча мелі свецкія і духоўныя феадалы, яны карысталіся палітычнымі і эканамічнымі правамі. Сярод людзей простага стану ў лепшым становішчы знаходзіліся мяшчане, асабліва заможныя. Сяляне, якія складалі асноўную групу насельніцтва і неслі галоўны цяжар павіннасцяў на карысць дзяржавы і феадалаў, фактычна былі бяспраўнымі. Пераход простых людзей у прывілеяваны стан шляхты быў магчымы ў выключных выпадках толькі для багатых сялян і мяшчан, якія неслі ваенную службу.

***5. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх земляў у складзе ВКЛ.*** Эканамічнай асновай феадальнага грамадства была сельская гаспадарка, а адносіны, якія ўзнікалі ў сферы дачыненняў да асноўнага сродку вытворчасці – зямлі, былі галоўнымі фактарамі, якія вызначалі стан эканомікі ў дзяржаве.

Вярхоўным уласнікам усёй зямлі ў ВКЛ лічыўся вялікі князь. Яму належалі так званыя гаспадарскія землі – *вялікакняжацкі дамен*, які ў XVI ст. складаў амаль палову тэрыторыі краіны. Вялікакняжацкі дамен фарміраваўся шляхам далучэння да старых вотчын Гедымінавічаў заваяваных і канфіскаваных земляў, а таксама *вымарачных маёнткаў*, уладальнікі якіх не пакінулі прамых нашчадкаў па мужчынскай лініі. У другой палове XVI ст. з дзяржаўных земляў былі выдзелены *сталовыя эканоміі* – уладанні, даход з якіх ішоў на ўтрыманне вялікакняжацкага двара («на стол»). На тэрыторыі Беларусі гэта былі Берасцейская, Кобрынская, Гарадзенская і Магілёўская эканоміі.

Да ліку дзяржаўных земляў адносіліся таксама *староствы* і *дзяржавы* – уладанні, якія звычайна аддаваліся вялікім князем у часовае трыманне феадалам за выкананне пэўнай дзяржаўнай службы з абавязацельствам выплаты ў скарб чацвёртай часткі даходу – *кварты*.

Значную ўдзельную вагу ў феадальным землеўладанні ВКЛ мела *прыватнае землеўладанне* – уласнасць свецкіх феадалаў (магнатаў, шляхты). Існавала таксама і *царкоўная зямельная ўласнасць* – маёнткі каталіцкага касцёла і праваслаўнай (пазней і уніяцкай) царквы і манастыроў. Рост феадальнага землеўладання ў XIV – першай палове XVI ст. адбываўся рознымі шляхамі: вялікакняжацкімі падараваннямі, наданнямі з боку феадалаў васалам і царкве, купляй-продажам, залогам і г. д.

У XIV – першай палове XVI ст. асновай эканамічнага жыцця ВКЛ была сельская гаспадарка. Галоўнымі заняткамі насельніцтва па-ранейшаму заставаліся земляробства і жывёлагадоўля; дапаможнымі – бортніцтва, паляванне, рыбалоўства, рамяство. Удасканальвалася агратэхніка, двухполле змянялася трохполлем. Асноўнай сельскагаспадарчай культурай было жыта, ураджайнасць якога была сам-3, сам-4, рэдка на добра ўгноеным ворыве – сам-5. Шырока былі распаўсюджаны ячмень, авёс, проса, грэчка, лён, каноплі.

Сялянская гаспадарка мела назву «дым» і з'яўлялася адзінкай падаткаабкладання. Значную ролю ў сялянскім жыцці адыгрывала *абшчына (грамада)*. Яна арганізоўвала сялянскае землекарыстанне і выплату феадальнай рэнты. Кіравалі абшчынай *старцы*, якія выбіраліся на сельскім сходзе. Адказнасць абшчыны забяспечвалася *кругавой парукай* («адзін за ўсіх і ўсе за аднаго»). У абшчынным землекарыстанні былі выганы, лугі, сенажаці, рыбныя ловы і інш. У некаторых выпадках абшчына абараняла сялян ад сваволля феадалаў, вырашала спрэчныя пытанні абшчынным («копным») судом.

За карыстанне зямельнымі надзеламі сяляне абавязаны былі выконваць шматлікія павіннасці, характар і доля якіх мяняліся па меры развіцця феадальных адносін. Асноўныя віды феадальнай рэнты: *даніна, чынш, паншчына*; дадатковыя віды адпрацовачных павіннасцяў: *талокі, гвалты, шарваркі, падводная павіннасць* і інш.

У канцы XV ст. з развіццём таварна-грашовых адносінаў і павелічэннем на рынках попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю пачалася рэарганізацыя гаспадаркі феадалаў, пры якой частка ся-

лян пераводзілася з даніны на паншчыну, а другая – на грашовыя плацяжы (чынш).

***6. Гарады Беларусі ў XIV–XVI ст.*** У сацыяльна-эканамічных працэсах, якія адбываліся ў разглядаемы перыяд на землях Беларусі, важную ролю адыгрывалі гарады. У выніку грамадскага падзелу працы, росту абмену прадукцыяй сельскай гаспадаркі і рамеснымі вырабамі, спецыялізацыі і пашырэння рамеснай вытворчасці і развіцця гандлю роля гарадоў узрастала. У першай палове XVI ст. на землях Беларусі адбывалася *ўрбанізацыя* – хуткі рост гарадоў і павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва. Гарадское насельніцтва папаўнялася як у выніку натуральнага прыросту, так і за кошт сялян-уцекачоў, якія за гарадскімі сценамі атрымлівалі абарону з боку магістрата. З мэтай павелічэння ўласных прыбыткаў феадалы таксама перасялялі сваіх прыгонных рамеснікаў у гарады. Такім чынам утвараліся *юрыдыкі* – асобныя кварталы, якія знаходзіліся ва ўласнасці феадала і на якія не распаўсюджваліся паўнамоцтвы магістрата.

У першай палове XVI ст. у Беларусі было каля 40 гарадоў, якія можна падзяліць на тры групы:

1) *буйныя гарады* з насельніцтвам больш за 10 тыс. чалавек (Полацк, Віцебск, Берасце, Магілёў, Слуцк);

2) *сярэднія гарады* з колькасцю насельніцтва ад 3 да 10 тыс. чалавек (Менск, Гродня, Орша, Быхаў);

3) *малыя гарады*, у якіх пражывала ад 1,5 да 3 тыс. жыхароў (Бабруйск, Барысаў, Слонім, Кобрын).

Своеасаблівым тыпам паселішчаў у ВКЛ з’яўляліся *мястэчкі*. Яны займалі прамежкавае становішча паміж сельскімі населенымі пунктамі і гарадамі. У мястэчках звычайна налічвалася менш за 1,5 тыс. чалавек, і, у адрозненне ад гараджан, людзі ў іх займаліся пераважна сельскай гаспадаркай. Разам з тым неад’емнай часткай эканамічнага жыцця мястэчак з’яўляліся рамяство і гандаль. У XVI ст. на землях Беларусі было звыш за 400 мястэчак, пераважная большасць з якіх былі ўтвораныя на землях феадалаў і з’яўлялася цэнтрамі феадальных маёнткаў.

Па-ранейшаму гарады выконвалі шмат функцый, галоўнай з якіх была гандлёва-рамесная. З мэтай абароны сваёй вытворчасці ад канкурэнцыі іншаземных купцоў і рамеснікаў феадальных юрыдык майстры адной ці сумежных спецыяльнасцяў у магдэбургскіх гарадах аб'ядноўваліся ў саюзы, якія называліся *сотні*, *брацтвы*, а з канца XVI ст. – *цэхі*. У цэх прымалі людзей «дабрачынных ды жанатых», якія не былі «п'яніцамі ці гульцамі ў косці». На чале цэха стаялі *майстры-прафесіяналы*, якія мелі свае рамесныя майстэрні. Акрамя іх, у цэх уваходзілі іх *вучні*, якія працавалі на майстра *«за хлеб і навуку»*, а таксама *падмайстры*, якія ўжо авалодалі пэўнымі навыкамі, і, каб стаць майстрамі, ім неабходна было зрабіць так званую «штуку» («шэдэўр»). Цэхі рэгламентавалі выпуск, якасць, кошты і збыт прадукцыі. Рамеснікі, якія не ўваходзілі ў цэх, называліся *партачамі*, і іх вырабы прадаваліся па вельмі нізкіх коштах.

Падводзячы вынікі, неабходна заўважыць, што развіццё аграрных адносін, рост гарадоў, а таксама грамадскія працэсы на землях Беларусі сведчылі аб параўнальна высокай ступені сацыяльна-эканамічнага развіцця тагачаснай Беларусі.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Гвалты*** – пільныя неадкладныя работы, выкліканыя стыхійнымі бедствамі, пажарамі, паводкамі і інш.

***Дзяржавы*** – дзяржаўныя зямельныя ўладанні, як правіла, невялікіх памераў, якія здаваліся скарбам у трыманне розным асобам на вызначаных умовах.

***Магдэбургскае права*** – права горада на самакіраванне, якое ўзнікла ў XIII ст. у горадзе Магдэбург і дзейнічала ў гарадах Усходняй Германіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

***Прыгоннае права*** – сістэма юрыдычных норм, якія замацоўвалі пазямельную, судовую і асабістую (пазаэканамічны прымус) залежнасць сялян ад феадалаў і дзяржавы. Прыгонныя сяляне надзяляліся зямлёй, за што выконвалі на карысць феадала павіннасці і былі пазбаўлены палітычных правоў.

***Сталовыя эканоміі*** – буйныя дзяржаўныя ўладанні ў ВКЛ, даход з якіх ішоў на забеспячэнне вялікакняжацкага двара і асабістыя патрэбы князя («на стол»).

***Староствы*** – дзяржаўныя маёнткі ў ВКЛ, якія князь даваў у часовае карыстанне феадалам за службу.

***Талака*** – народны звычай калектыўнай працы, які быў выкарыстаны феадаламі для прыцягнення сялян да тэрміновай прымусовай працы ў час жніва, касьбы, ворыва.

***Урбанізацыя*** – працэс павелічэння колькасці гарадскога насельніцтва і ў цэлым ролі гарадоў у жыцці грамадства.

***Цэх*** – аб'яднанне рамеснікаў адной або сумежных спецыяльнасцяў у сярэднявечных гарадах для абароны сваіх прафесійных інтарэсаў.

***Шарваркі*** – работы па рамонту і будаўніцтву дарог, мастоў.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Вызначце па ступені значнасці і ахарактарызуйце прычыны ўтварэння Вялікага княства Літоўскага.

2. Складзіце табліцу «Дзейнасць вялікіх князёў літоўскіх у другой палове XIII–XV ст.» паводле ўзору:

| Вялікі князь | Гады кіравання | Асноўныя дасягненні ва ўнутранай палітыцы | Асноўныя накірункі і падзеі знешняй палітыкі |
|---|---|---|---|
| | | | |

3. Прадстаўце ў выглядзе схем:
а) органы дзяржаўнага кіравання ВКЛ;
б) грамадскую структуру ВКЛ;
в) катэгорыі залежных сялян.

# ТЭМА 5. БЕЛАРУСЬ У XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТ.

1. *Унутры- і знешнепалітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVI ст.*
2. *Лівонская вайна. Люблінская унія і ўтварэнне Рэчы Паспалітай.*
3. *Валочная памера – аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст.*
4. *Уплыў ідэй Адраджэння на культуру Беларусі ў XVI ст. – першай палове XVII ст.*
5. *Рэфармацыя ў Беларусі і Берасцейская царкоўная унія.*
6. *Палітычная сітуацыя на землях Беларусі ў першай палове XVII ст.*

***1. Унутры- і знешнепалітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVI ст.*** Канец XV – пачатак XVI ст. характарызаваўся абвастрэннем унутрыпалітычнай сітуацыі ў ВКЛ. Краевугольным каменем заставалася рэлігійнае пытанне. Гэта ярка праявілася падчас мяцяжу *Міхала Глінскага* (1508). Міхал Глінскі з'яўляўся дарадцам вялікага князя Аляксандра, а пасля яго смерці страціў свой уплыў пры двары *Жыгімонта Старога* (1506–1548 гг.). Нежаданне мірыцца з другарадным становішчам стала асноўнай прычынай мяцяжу. У пошуку прыхільнікаў Глінскі рабіў стаўку на праваслаўных феадалаў, незадаволеных пракаталіцкай палітыкай урада. Ён распаўсюджваў чуткі, што ўсіх праваслаўных гвалтоўна будуць пераводзіць у каталіцтва. Глінскі атрымаў падтрымку з боку маскоўскага князя Васіля III. І хоць мяцеж быў падаўлены, а яго ўдзельнікі жорстка пакараны, аднак ён чарговы раз засведчыў небяспеку нявырашанасці рэлігійнай праблемы ў ВКЛ.

Унутраныя супярэчнасці ўскладняліся напружаным знешнепалітычным становішчам. У першай палове XVI ст. небяспеку для ВКЛ прадстаўлялі крымскія татары. Каб адкупіцца ад іх набегаў,

ВКЛ выплачвала Крымскаму ханству спецыяльны падатак – *ардыншчыну*, але гэта не ратавала паўднёвыя і ўсходнія землі Княства. У 1502 г. беларуска-літоўскае войска разбіла татар на рацэ Уша, у 1503 г. – каля Давыд-Гарадка, а ў 1506 г. нанесла паражэнне пад Клецкам. Усяго за першую палову XVI ст. крымскія татары здзейснілі каля 50 набегаў на землі ВКЛ.

Галоўным накірункам знешняй палітыкі ў XVI ст. стала зацяжная ваенна-палітычная барацьба з Маскоўскай дзяржавай за дамінаванне ва Усходняй Еўропе. З канца XV ст. Маскоўскае княства ўзяло на сябе ролю спадкаемцы Кіева, а пасля жаніцьбы Івана III на дачцэ візантыйскага імператара абвясціла сябе і заступнікам усіх праваслаўных хрысціян ва Усходняй Еўропе. У 80–90-я гады XV ст. на бок Маскоўскай дзяржавы перайшлі шмат праваслаўных феадалаў ВКЛ разам са сваімі ўдзеламі, а на пачатку XVI ст. пачалося адкрытае супрацьстаянне Масквы і Вільні. У першай палове XVI ст. адбыліся чатыры вайны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай (1500–1503; 1507–1508; 1512–1522; 1534–1537 гг.). Ініцыятарам ваенных канфліктаў было Маскоўскае княства, якое імкнулася ажыццявіць сваю захопніцкую палітыку пад лозунгам абароны праваслаўя. І хоць барацьба ішла з пераменным поспехам, у выніку ВКЛ страціла значную частку сваёй тэрыторыі разам са Смаленскам.

***2. Лівонская вайна. Люблінская унія і ўтварэнне Рэчы Паспалітай.*** Вышэйшай кропкай супрацьстаяння Масквы і Вільні ў XVI ст. стала Лівонская (Інфлянцкая) вайна 1558–1583 г. Яна распачалася па ініцыятыве маскоўскага князя Івана IV Гconverted Грознага, якi паставіў задачу атрымання Масковіяй выхаду да Балтыйскага мора. Самай слабай краінай, якая перакрывала Маскоўскай дзяржаве шлях да Балтыкі, была Лівонія (Інфлянты) – канфедэрацыя 5 духоўна-феадальных княстваў, якія намінальна лічыліся пад уладай рымскага папы і імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі. Не маючы магчымасці супрацьстаяць войскам Івана Грознага, Лівонія звярнулася за дапамогай да ВКЛ. Узвышэнне Масквы і ўмацаванне яе пазіцый у Прыбалтыцы не адпавядалі стратэгічным інтарэсам

знешняй палітыкі Вялікага Княства, таму ў 1561 г. Жыгімонт Аўгуст узяў Лівонію пад свой пратэктарат. У адказ Масква пачала ваенныя дзеянні супраць ВКЛ.

З уступленнем у вайну ВКЛ галоўным тэатрам ваенных дзеянняў сталі беларускія землі. У 1562 г. былі захоплены Віцебск, Орша, Дуброўна, а ў лютым 1563 г. маскоўскае войска захапіла Полацк. Улады ВКЛ не здолелі арганізаваць дзейснага адпору агрэсару, узнікла прамая пагроза для Вільні. У такіх умовах Вялікае Княства вымушана было ісці на саюз з Польскай Каронай.

У заключэнні уніі былі зацікаўлены абодва бакі:

- ВКЛ патрабавала ваеннай дапамогі, і, акрамя таго, шляхецкае саслоўе спадзявалася атрымаць у новай дзяржаве так званыя *«залатыя шляхецкія вольнасці»*, да якіх адносіліся права *«liberum veto»*, права *рокаша* і права ўтвараць *канфедэрацыі*;
- польская шляхта жадала далучыць ВКЛ да Польшчы ў якасці багатага прыдатка, атрымаць новыя землі і пасады; каталіцкая царква атрымала магчымасць пашырыць свой уплыў на ўсходнія землі.

Умовы заключэння уніі сталі галоўным пытаннем на *Люблінскім сойме*, які працаваў з 10 студзеня па 1 ліпеня 1569 г. Карыстаючыся цяжкім становішчам ВКЛ, польскі бок дабіўся ад Жыгімонта Аўгуста тэрытарыяльных саступак – у склад Кароны былі ўключаны Валынь, Падолле і Кіеўшчына. У такой сітуацыі ВКЛ пайшло на падпісанне ўмоваў уніі.

***Умовы Люблінскай уніі.*** Па ўмовах Люблінскай уніі для аб'яднанай дзяржавы Рэчы Паспалітай *агульнымі* станавіліся:

– вышэйшы орган – сойм, які мог збірацца толькі на тэрыторыі Польшчы (асобных соймаў для ВКЛ і Кароны не прадугледжвалася);

– кіраўнік дзяржавы, які адначасова быў польскім каралём і вялікім князем літоўскім;

– заканадаўства;

– агульная знешняя палітыка.

*Асобнымі* ў ВКЛ і Польшчы захоўваліся:

– афіцыйная назва дзяржаваў (*ВКЛ* і *Польская Карона*) пры існаванні агульнай назвы *Рэч Паспалітая*;

– адміністрацыйны апарат (*гетманы, канцлеры, маршалкі і* інш.);

– судовая сістэма (вышэйшым судовым органам у ВКЛ з 1581 г. стаў *Галоўны Трыбунал*);

– войска (*паспалітае рушэнне* або ўсеагульнае шляхецкае апалчэнне і *жаўнеры* – ваеннаабавязаныя мужчыны, якіх выстаўляў са сваіх уладанняў кожны шляхціц);

– атрыбуты дзяржавы: герб (у ВКЛ – *Пагоня*) і мова справаводства (у ВКЛ – *старабеларуская*).

Такім чынам, Рэч Паспалітая была *федэрацыяй* – дзяржавай, якая складалася з самастойных дзяржаўных утварэнняў, аб'яднаных на пэўных умовах у адзіную краіну. У складзе Рэчы Паспалітай ВКЛ існавала да канца XVIII ст.

Рэальна унія не задаволіла ні шляхту ВКЛ, якая не атрымала таго, чаго хацела, ні магнатаў, якія страцілі месцы ў Панах-радзе і ролю на сойме. Палітычная дыскрымінацыя дапаўнялася эканамічнай: шляхта ВКЛ не мела права набываць землі на тых тэрыторыях, якія былі адарваны ад ВКЛ у 1569 г. У краіне набывалі моц антыпольскія настроі, якія выявіліся ў барацьбе за захаванне самастойнасці, падчас якой шляхта імкнулася адрадзіць поўную дзяржаўнасць ВКЛ, «былую старыну».

У 70–80-я г. XVI ст. у ВКЛ насуперак Люблінскаму акту рэгулярна збіраліся агульнадзяржаўныя соймы, з 1581 г. у ВКЛ дзейнічаў Галоўны трыбунал; моцным усплёскам незалежніцкіх настрояў стала прыняцце III Статута ВКЛ у 1588 г., які скасоўваў многія пастановы Люблінскай уніі: ВКЛ абвяшчалася самастойнай дзяржавай са сваёй тэрыторыяй, апаратам, кіраваннем войскам, фінансамі. Згодна са Статутам, права набываць землі і займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ мелі выключна грамадзяне Вялікага Княства.

Барацьба за «старыну» выявілася ва ўмацаванні беларускай мовы і духоўных каштоўнасцяў. Вялікую ролю ў гэтым адыгрывалі праваслаўныя брацтвы – нацыянальна-рэлігійныя арганізацыі, створаныя ў адказ на прапольска-каталіцкую палітыку ўрада Рэчы Паспалітай.

Разам з тым аб'яднанне ваенных сіл Кароны і Княства пад кіраўніцтвам караля *Стэфана Баторыя* (1576–1586 гг.) дазволіла адваяваць у 1579 г. Полаччыну, а ў 1580 г. вызваліць усе землі ВКЛ, якія былі захоплены маскоўскім войскам у 60-я г. XVI ст. У 1582 г. было заключана *Ям-Запольскае перамір'е* паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай на 10 гадоў, якім завяршылася Інфлянцкая вайна. Іван IV адмаўляўся ад заваяваных інфлянцкіх земляў на карысць Рэчы Паспалітай, а Стэфан Баторый згадзіўся вывесці армію з тэрыторыі Маскоўскай дзяржавы. Падпісанне міру зафіксавала паражэнне Маскоўскага царства ў *Інфлянцкай вайне. У* жніўні 1583 г. *было заключана Плюскае перамір'е* (на рацэ Плюса) Маскоўскага княства са Швецыяй у Лівонскай вайне. Да шведаў перайшлі Ям, Капор'е, Івангарад і Карэла з уездамі. Перамір'ем было канчаткова зафіксавана паражэнне Маскоўскай дзяржавы ў *Лівонскай вайне* 1558–1583 гг. Але ўвогуле вынікі вайны для ВКЛ былі драматычныя: яна прынесла матэрыяльныя і людскія страты, прывяла да вымушанага саюза з Польшчай і стала прычынай пачатку доўгатэрміновага ваеннага ліхалецця.

***3. Валочная памера – аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст.*** Гэтая рэформа, праведзеная на землях ВКЛ, з'яўлялася комплексам эканамічных, сацыяльных і тэхнічных мерапрыемстваў па ўдасканаленні сістэмы землекарыстання і абкладання сялян феадальнымі павіннасцямі.

***Галоўныя прычыны рэформы:***

1) *унутраная:* існаванне ў ВКЛ недасканалай сістэмы збору падаткаў, якая абапіралася на разнастайныя па свайму складу адзінкі падаткаабкладання (*«дымы»*, *«службы»*, *«дворышчы»*, *«жарэбі»* і інш.), зямельныя памеры якіх часта адрозніваліся нават у межах аднаго ўладання. Такім чынам, гэтая сістэма не ўлічвала вытворчых рэсурсаў сялянскай гаспадаркі: незалежна ад колькасці зямлі сялянскія гаспадаркі плацілі аднолькавыя падаткі;

2) *знешняя:* павелічэнне попыту і цэнаў на збожжавых рынках Заходняй Еўропы ў сувязі з ростам гарадскога насельніцтва, а таксама актыўнай каланізацыяй Новага Свету.

Першыя спробы гаспадарчага рэфармавання былі прадпрыняты ў 30–40-я гады XVI ст. ва ўладаннях каралевы *Боны Сфорца* ў Пінскім і Клецкім староствах і далі хуткі эканамічны эфект. У 1550-я гады яе сын Жыгімонт Аўгуст з мэтай павелічэння даходаў правёў больш шырокую рэформу ў дзяржаўных уладаннях. Асноўным дакументам рэформы стала «*Устава на валокі*» (1557 г.), якая і дала назву рэформе – «*валочная памера*».

***Асноўныя мерапрыемствы рэформы:***

1) рэформа пачалася з перамеру ўсіх ворыўных зямель на *валокі* – стандартныя пазямельныя адзінкі, роўныя 21,36 га;

2) валока адначасова станавілася асноўнай адзінкай абкладання сялян павіннасцямі. Павіннасці прызначаліся ў залежнасці ад колькасці і якасці зямлі. У сувязі з гэтым, ведаючы патэнцыял сваёй гаспадаркі, сялянская сям'я магла ўзяць цэлую валоку або яе частку;

3) была ліквідавана цераспалосіца, а сяляне атрымлівалі зямлю ў трох розных месцах, што садзейнічала ўкараненню трохпольнага севазвароту і павышэнню ўраджайнасці;

4) на найбольш урадлівых землях ствараліся *фальваркі* – феадальныя гаспадаркі, заснаваныя на працы залежных сялян і арыентаваныя на вытворчасць збожжа на продаж. Суадносіны фальваркавай і сялянскай зямлі былі 1:7, гэта азначала, што адну фальваркавую валоку апрацоўвалі столькі сялянскіх сямей, колькі разам мелі 7 валок;

5) сялянскія надзелы былі двух відаў:

– *цяглыя*, за карыстанне якімі сяляне адбывалі паншчыну ў памеры 2 дні ў тыдзень з валокі, а таксама сяляне выходзілі на гвалты і талокі і плацілі чынш ад 6 да 21 гроша ў год;

– *асадныя*, галоўнай павіннасцю якіх была выплата чыншу ў памеры ад 66 да 106 грошаў у год.

У дзяржаўных уладаннях на захадзе і ў цэнтры Беларусі рэформа была праведзена да канца XVI ст. На ўсходзе Беларусі з прычыны працяглай Лівонскай вайны (1558–1583) ажыццяўленне рэформы расцягнулася на стагоддзе. На гэтай памежнай з Маскоўскай дзяржавай тэрыторыі асноўнымі павіннасцямі дзяржаўных сялян былі даніна і чынш.

***Вынікі рэформы:***

1) аграрная рэформа прывяла да значнага ўздыму сельскай гаспадаркі ў ВКЛ за кошт дакладнага вызначэння памераў зямельных надзелаў сялян, удасканалення сістэмы падаткаабкладання, укаранення перадавой агратэхнікі, развіцця гандлю і таварна-грашовых адносін;

2) па прыкладу дзяржавы валочную памеру праводзілі ў сваіх уладаннях прыватныя ўласнікі, што ў выніку прывяло да росту даходаў скарбу і феадалаў, а таксама да ўмацавання эканомікі краіны ў цэлым;

3) эканамічная стабільнасць і павышэнне прыбыткаў дзяржавы садзейнічалі развіццю адукацыі, культуры, вайсковай справы;

4) у гістарыяграфіі прынята лічыць, што рэформа садзейнічала завяршэнню працэсу юрыдычнага афармлення прыгоннага права на землях ВКЛ.

Аграрная рэформа стала эканамічным фундаментам, асновай далейшага развіцця гаспадаркі і культуры Беларусі ў XVI ст.

***4. Уплыў ідэй Адраджэння на культуру Беларусі ў XVI ст. – першай палове XVII ст.*** *Адраджэнне* (Рэнесанс) – эпоха ў развіцці духоўнай культуры Еўропы, якая аформілася на працягу XIV – першай паловы XVII ст. *Тыпалагічнымі рысамі* культуры Адраджэння былі:

- *гуманізм* – сцвярджэнне зямной каштоўнасці і гарманічнага развіцця чалавека: чалавека-майстра, чалавека-творцы, чалавека-філосафа;
- *секулярызацыя* культуры – вызваленне культуры ад дыктату царквы;
- станаўленне крытычнай думкі і інш.

Фарміраванню новых поглядаў садзейнічалі агульнае эканамічнае развіццё, зараджэнне капіталістычных адносін, рост гарадоў, вялікія геаграфічныя адкрыцці і інш.

На беларускіх землях эпоха Рэнесансу ахапіла XVI – першую палову XVII ст. і мела свае *асаблівасці*:

- сацыяльнай апорай Адраджэння ў ВКЛ было шляхецкае саслоўе, а не гараджане, як у Заходняй Еўропе;

– па часе Адраджэнне ў ВКЛ супала з Рэфармацыяй і мела пэўную залежнасць ад сярэднявечных і рэлігійных традыцый;
– у гэты час узнікла беларускае кнігадрукаванне і адбылося станаўленне мясцовай школы кніжнай графікі;
– характарызавалася *поліканфесійнасцю* (суіснаваннем розных рэлігій –праваслаўя, каталіцтва, пратэстантызму, уніяцтва, ісламу, іўдаізму) і *полілінгвізмам* (шматмоўем, калі дзяржаўнай мовай была *старабеларуская*, царкоўнай – *царкоўнаславянская*, касцельная і літаратурная – *латынь,* мовай шляхецкага саслоўя – *польская*), што прыўносіла адметныя рысы ў культуру адзначанага перыяду на землях ВКЛ.

Пачынальнікам беларускага рэнесансавага асветніцтва быў *Францыск Скарына* (каля 1490–1551 г.) – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Першая кніга «Біблія» была выдадзена ім у 1517 г. у Празе. На пачатку 20-х гадоў XVI ст. друкарня была наладжана ў Вільні, дзе, акрамя «Бібліі», Скарына надрукаваў «Малую падарожную кніжку» (1522 г.) і «Апостал» (1525 г.). У яго творах і дзейнасці раскрываецца *сэнс эпохі Рэнесансу*: гэта быў сінтэз хрысціянскага гуманізму з антычнай мастацкай і філасофскай культурай. У выніку была створана якасна новая культура, якая значна паўплывала на станаўленне і развіццё нацыянальных культур еўрапейскіх народаў.

Кнігадрукаванне на тэрыторыі Беларусі пашырылася ў 1550-я гады і было ўжо пастаянным. Друкарні з’явіліся ў Берасці, Нясвіжы, Заблудаве, Цяпіне. У 1562 г. у Нясвіжскай друкарні *Сымонам Будным* была выдадзена першая кніга на беларускай мове – «Катэхізіс». Вядомымі дзеячамі Адраджэння на землях Беларусі былі таксама *Васіль Цяпінскі*, *Мікола Гусоўскі*, *Мялецій Смятрыцкі*, *Лаўрэнцій Зізаній* і інш.

Значную ролю ў развіцці беларускай культуры адыгрывалі праваслаўныя брацтвы, якія адкрывалі прыходскія школы, стваралі друкарні, выдавалі кнігі. Брацкія друкарні існавалі ў Вільні і Еўі. У іх выдавалася як рэлігійная літаратура, так і матэрыялы прававога характару, напрыклад, Статуты ВКЛ.

Такім чынам нягледзячы на тое, што Адраджэнне ў Беларусі пачалося прыкладна на 100 гадоў пазней, чым у Італіі, мастацкія

шэдэўры, творы сацыяльнай і філасофскай думкі, створаныя выхадцамі з Беларусі, сталі важным укладам у залаты фонд здабыткаў сусветнай культуры.

***5. Рэфармацыя ў Беларусі і Берасцейская царкоўная унія.*** У XVI ст. на землях Беларусі распаўсюдзіліся і ідэі Рэфармацыі. *Рэфармацыя* – сацыяльна-палітычны і ідэалагічны рух, накіраваны супраць засілля каталіцкай царквы ва ўсіх сферах жыцця, на змены ў каталіцызме і прыстасаванне царкоўнай арганізацыі да буржуазных адносін. Меў антыфеадальны характар і прывёў да ўзнікнення новых форм арганізацыі вернікаў у хрысціянстве – *пратэстантызму*.

Ідэі, звязаныя з Рэфармацыяй, прыходзілі ў Беларусь разам з замежнымі гандлярамі і рамеснікамі, а таксама з беларускімі студэнтамі, якія вучыліся ў еўрапейскіх універсітэтах. Гэтымі ідэямі натхняліся іншыя людзі, якія ездзілі за мяжу. Рэфармацыя ў Беларусі з’яўлялася складанай часткай еўрапейскага рэфармацыйнага руху. Найбольш распаўсюджанай плынню пратэстантызму на землях Беларусі быў *кальвінізм*, які больш адпавядаў традыцыйным каштоўнасцям вольнасці магнатаў і шляхты. Прыхільнікі кальвінізму патрабавалі адмены царкоўных падаткаў і царкоўнага землеўладання, магчымасці стварэння рэлігійных абшчын з самакіраваннем і інш. Асаблівасцю рэфармацыйнага руху ў ВКЛ стала тое, што ён ахапіў у асноўным вышэйшыя колы грамадства – магнатэрыю і шляхту і толькі часткова гараджан. Прыхільнасць да Рэфармацыі феадальнай знаці, а таксама часткі дробнай і сярэдняй шляхты абумовіла імкненне захаваць свае сацыяльна-эканамічныя і палітычныя правы шляхам дэцэнтралізацыі як дзяржаўных, так і царкоўна-рэлігійных структур.

Пачаткам Рэфармацыі ў Беларусі лічыцца заснаванне канцлерам ВКЛ Мікалаем Радзівілам Чорным у 1553 г. у Берасці першага кальвінісцкага збору (абшчыны). Пры падтрымцы Мікалая Радзівіла Чорнага пратэстанцкія абшчыны з малітоўнымі дамамі, школамі, шпіталямі, друкарнямі былі заснаваны ў многіх беларускіх гарадах.

Рэфармацыя стала яшчэ адным сродкам барацьбы Вялікага Княства за незалежнасць, спробай узмацнення палітычнай ролі

ВКЛ. Яна паспрыяла ўсталяванню міжканфесійнай талерантнасці на землях Беларусі – права свабоды веравызнання ў ВКЛ было заканадаўча замацавана ў Статуце ВКЛ 1588 г.

Хуткае распаўсюджанне Рэфармацыі і павелічэнне яе прыхільнікаў сур'ёзна занепакоіла прадстаўнікоў каталіцкай царквы. Па ініцыятыве папы рымскага ў Еўропе пачалася *контррэфармацыя* – рэлігійна-палітычны рух, які меў на мэце рэстаўрацыю пазіцый, страчаных каталіцызмам падчас Рэфармацыі. Рым адхіліў магчымасць кампрамісу з пратэстантамі, пацвердзіў безумоўны аўтарытэт папы ў справе веры, замацаваў набажэнства выключна на лацінскай мове, увёў жорсткую царкоўную цэнзуру, а ў 1542 г. у Рыме была ўтворана інквізіцыя.

Моцны ўдар па пратэстантызму ў ВКЛ нанесла дзейнасць *ордэна езуітаў*, якая мела адкрыта пракаталіцкі характар. Талерантнасць ВКЛ стварала шырокія магчымасці для яго паспяховай дзейнасці. У сваёй барацьбе з рэфармацыйнымі ідэямі езуіты адводзілі вялікую ўвагу адукацыі, развіццю культуры, выхаванню моладзі. Разам з тым яны выкарыстоўвалі прымусовыя і гвалтоўныя меры: зачынялі пратэстанцкія і праваслаўныя школы і друкарні, знішчалі кнігі апанентаў, учынялі пагромы. З цягам часу Контррэфармацыя перамагла, талерантнасць у ВКЛ была скасавана і заменена дзяржаўным каталіцызмам.

На хвалі Контррэфармацыі была заключана ***Берасцейская царкоўная унія*** (1596) і ўзнікла *уніяцкая* (*грэка-каталіцкая*) *царква*. Па сутнасці, унія стала працягам незалежніцкай палітыкі, якую спрабавала праводзіць эліта ВКЛ пры дапамозе пратэстантызму ў часы Рэфармацыі. Ідэя аб'яднання каталіцкай і праваслаўнай хрысціянскіх канфесій узнікла адразу пасля афіцыйнага царкоўнага расколу 1054 г., але стала рэальнай для ВКЛ толькі ў канцы XVI ст. Прыхільнікі уніі былі не толькі ў лоне праваслаўнай, але і каталіцкай царквы. Кіраўніцтва праваслаўнай царквы праз унію спадзявалася вярнуць сабе некалі вядучае становішча ў ВКЛ (адным з арганізатараў уніі стаў епіскап *Іпацій Пацей*). Каталіцкія кіраўнікі праз аб'яднанне цэркваў марылі дабіцца перамогі над праваслаўем і пашырыць свой уплыў ва Усходняй Еўропе.

Падрыхтоўка уніі доўжылася з 1590 па 1596 г., і акт аб'яднання ўрачыста быў абвешчаны на Берасцейскім царкоўным саборы 1596 г. У адпаведнасці з ім на тэрыторыі ВКЛ утваралася новая царква, якая ўзначальвалася кіеўскімі мітрапалітамі і мела наступныя адметныя рысы:

- прызнавала вяршэнства папы рымскага;
- захоўвала праваслаўную абраднасць, царкоўнаславянскую мову набажэнства (літургіі) і юліянскі каляндар;
- прызнавала каталіцкую дагматыку;
- праводзіла пропаведзі на мясцовай (старабеларускай) мове.

У першую чаргу уніяцкая царква была разлічана на шляхту, якая пасля ўтварэння Рэчы Паспалітай, спадзеючыся хутка атрымаць зямлю і дзяржаўныя пасады, пераходзіла ў каталіцтва. Але ўтрымаць шляхту пры сваім абрадзе і мове уніяцкая царква не змагла. Таму унія стала верай непрывілеяванага праваслаўнага насельніцтва – сялян і мяшчан.

Стаўка пры распаўсюджванні новай рэлігіі была зроблена на добраахвотнае далучэнне да яе, аднак пазбегнуць прымусу не ўдалося, што выклікала супраціўленне праваслаўных вернікаў. У канцы XVIII ст. каля 75% насельніцтва Беларусі былі уніятамі. З цягам часу уніяцкая царква стала адным з фактараў існавання беларускага этнасу – менавіта яна захоўвала старабеларускую мову і народныя традыцыі.

Берасцейская царкоўная унія была ліквідавана Полацкім царкоўным саборам у 1839 г.

***6. Палітычная сітуацыя на землях Беларусі ў першай палове XVII ст.*** Канец XVI – пачатак XVII ст. характарызаваўся значнай стабілізацыяй эканамічнага і палітычнага жыцця ў ВКЛ. Пасля заканчэння ў 1583 г. Лівонскай вайны стала магчымым правесці на ўсходзе Беларусі аграрныя пераўтварэнні, якія ў сярэдзіне XVI ст. былі ажыццёўлены ў цэнтры і на захадзе краіны. Гэтыя мерапрыемствы садзейнічалі хуткаму аднаўленню гаспадаркі, якая была разбурана падчас вайны. У гэты перыяд ВКЛ заставалася адным з асноўных пастаўшчыкоў збожжа на рынкі Заходняй Еўропы.

Ва ўмовах спакою працягвалі развівацца гарады і мястэчкі Беларусі. Значна павялічылася іх колькасць, што тлумачылася зафіксаваным у Статуце 1588 г. правам шляхты ўтвараць мястэчкі на ўласных землях. Пераважную большасць мяшчанства складалі беларусы (да 80%). Яўрэі сярод гарадскіх жыхароў да сярэдзіны XVII ст. налічвалі толькі ад 5 да 8%. Агульная лічба насельніцтва беларускіх паветаў была ў той час прыкладна 2,9 млн. чалавек, з якіх 75% – сяляне, каля 15–17% – мяшчане, 8–10% – шляхта.

У знешняй палітыцы Рэчы Паспалітай на пачатку XVII ст. асноўным накірункам становіцца ўсходні. Лівонская вайна прынесла страты не толькі Беларусі, але і значна аслабіла Маскоўскую дзяржаву, вычарпаўшы яе матэрыяльныя і людскія рэсурсы. Пасля смерці ў 1584 г. Івана IV Грознага вялікім князем стаў яго сын Фёдар, які ў 1598 г. памёр, не пакінуўшы нашчадкаў. Дынастыя Рурыкавічаў перарвалася, і радавітае баярства Масквы ўцягнулася ў барацьбу за ўладу.

Выкарыстаць у сваіх інтарэсах складаную сітуацыю свайго даўняга саперніка і ўмяшацца ў яго ўнутраныя справы імкнулася і Рэч Паспалітая. Для гэтага часткай шляхты ВКЛ і нават самім каралём Жыгімонтам Вазай былі падтрыманы ў 1604 і ў 1607 гг. паходы на Маскву двух самазванцаў, вядомых у гісторыі пад імёнамі Ілжэдзмітрыя I і Ілжэдзмітрыя II, якія выдавалі сябе за малодшага сына Івана IV, царэвіча Дзмітрыя, «цудам ацалелага» пасля замаху на яго жыццё ў 1591 г. У 1609 г. Жыгімонт Ваза без згоды вальнага сойма распачаў адкрытую вайну супраць Маскоўскай дзяржавы.

У выніку пераможных ваенных дзеянняў на маскоўскім троне два гады знаходзіўся сын Жыгімонта каралевіч Уладзіслаў (1610–1612). Але сабранае Мініным і Пажарскім у 1612 г. народнае апалчэнне прымусіла Уладзіслава разам з войскам пакінуць Маскву. Баяры абралі царом Міхаіла Раманава, і ў Маскоўскай дзяржаве ўсталявалася дынастыя Раманавых. Вайна скончылася ў 1619 г. падпісаннем Дэўлінскага перамір'я, паводле якога да Кароны адышлі Чарнігаўская і Северская землі, а Вялікае княства Літоўскае вярнула страчаны яшчэ ў 1514 г. Смаленск і ўключыла ў свой склад гарады Мажайск, Дарагабуж і Вязьму.

Нягледзячы на пераможны вынік, пераважная большасць шляхты ВКЛ засталася незадаволеная вайной. Асабліва гэта тычылася шляхты ўсходніх паветаў, маёнткі якой найбольш пацярпелі ў ходзе ваенных дзеянняў. Акрамя таго, яны разумелі, што такі поспех тлумачыўся, у першую чаргу, нестабільнай унутранай сітуацыяй у Маскве, якая з цягам часу будзе імкнуцца ўзяць рэванш, а значыць, гэтая перамога – перадумова новай вайны.

Так і здарылася. Смерць у 1632 г. Жыгімонта Вазы і наступіўшы за ёй перыяд бескаралеўя ў Рэчы Паспалітай схілілі маскоўскага цара Міхаіла Раманава да адкрытых ваенных дзеянняў. Маскоўскае войска хутка захапіла Мсціслаў, Сураж, Крычаў, Усвяты, узяло ў аблогу Смаленск, Полацк, Віцебск. Але проба сіл для Маскоўскай дзяржавы скончылася няўдала, і ў 1634 г. яна капітулявала. У тым самым годзе новаабраны кароль Польшчы і вялікі князь Літоўскі Уладзіслаў IV падпісаў з маскоўскім царом «вечны мір», які пацвердзіў умовы Дэулінскага пагаднення. Аднак абодва бакі разумелі хісткасць і нетрываласць заключанага «вечнага міру».

Такім чынам у XVI – пачатку XVII ст. беларускія землі ў складзе ВКЛ дасягнулі значных поспехаў. У гэты час ВКЛ стала пастаянным пастаўшчыком збожжа на рынкі Заходняй Еўропы, а развіццё культуры і грамадска-палітычнага жыцця сведчыла пра цесныя ўзаемакантакты ВКЛ з еўрапейскімі краінамі. Разам з тым нестабільнасць знешнепалітычнай сітуацыі на ўсходнім накірунку стварала пэўныя перашкоды для далейшага паспяховага развіцця краіны, што стала найбольш відавочным у наступнае разбуральнае стагоддзе (другая палова XVII – сярэдзіна XVIII ст.).

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Адраджэнне (Рэнесанс)*** – эпоха ў развіцці духоўнай культуры Еўропы ў пераходны перыяд ад сярэднявечча да новага часу (XIV – першая палова XVII ст.). На тэрыторыі Беларусі эпоха Рэнесансу датуецца XVI – першай паловай XVII ст.

***Валока*** – пазямельная адзінка (21,36) і адзінка падаткаабкладання ў ВКЛ, уведзеная падчас аграрнай рэформы сярэдзіны XVI ст.

***Канфедэрацыя*** – у Рэчы Паспалітай часовы палітычны саюз шляхты для дасягнення пэўнай мэты шляхам узброенай барацьбы.

***Контррэфармацыя*** – рэлігійна-палітычны рух у Еўропе ў другой палове XVI–XVII ст., узначалены папствам і накіраваны супраць *Рэфармацыі*.

***Liberum veto (ліберум вета)*** – права соймавых дэпутатаў у Рэчы Паспалітай на свабоду забароны разгляду таго ці іншага пытання на сойме, спыненне пасяджэння сойма і адмену ўсіх прынятых на ім пастаноў. Абмежавана рашэннем канвакацыйнага сойма 1764 г., ліквідавана канстытуцыяй 3 мая 1791 г.

***Рокаш*** – від узброенай шляхецкай апазіцыі каралеўскай уладзе Рэчы Паспалітай у XVI–XVII ст., канфедэрацыя, накіраваная супраць караля.

***Рэфармацыя*** – шырокі сацыяльна-палітычны і ідэалагічны рух у Еўропе ў XVI ст., накіраваны супраць рымска-каталіцкай царквы і яе ролі ў палітычнай сістэме грамадства.

***Статут ВКЛ 1588 г. (III Статут ВКЛ)*** – звод законаў дзяржаўнага, адміністрацыйнага, ваеннага, судовага феадальнага права, які быў выдадзены на старабеларускай мове і дзейнічаў на землях Беларусі і Літвы да 1840 г.

***Фальварак*** – феадальная гаспадарка, заснаваная на працы прыгонных сялян і арыентаваная на вытворчасць збожжа на продаж.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Дакажыце альбо абвергніце наступныя тэзісы:

а) вялікая аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст. была выклікана як унутранымі, так і знешнімі прычынамі;

б) рэформа спрыяла эканамічнаму і культурнаму росквіту ВКЛ;

в) рэформа паскорыла працэс запрыгоньвання сялянства.

2. Дайце характарыстыку сацыяльна-эканамічных наступстваў для беларускіх зямель у выніку заключэння Люблінскай уніі і ўтварэння Рэчы Паспалітай.

3. Вызначце агульныя і асаблівыя рысы Адраджэння і Рэфармацыі на землях Беларусі.

4. Дайце ацэнку знешнепалітычнай дзейнасці ўлад ВКЛ і Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.

# ТЭМА 6. БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII СТ.

1. *Войны сярэдзіны – другой паловы XVII ст. і іх уплыў на развіццё Беларусі.*
2. *ВКЛ у Паўночнай вайне (1700 – 1721).*
3. *Культура Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст.*

***1. Войны сярэдзіны – другой паловы XVII ст. і іх уплыў на развіццё Беларусі.*** Другая палова XVII ст. – пачатак XVIII ст. сталі самым цяжкім часам у беларускай гісторыі. Ён атрымаў назву «*разбуральнага*», або «*крывавага стагоддзя*», паколькі ў гэты перыяд усю Рэч Паспалітую ахапіла паласа працяглых войнаў і палітычнай смуты. Распачаўся ён з казацкага паўстання ва Украіне пад кіраўніцтвам гетмана Запарожскага войска Багдана Хмяльніцкага.

***Казацка-сялянская вайна (1648–1651 гг.)***. Змагаючыся за незалежнасць Украіны, Б. Хмяльніцкі меў на мэце стварэнне ўласнай дзяржавы, у межы якой хацеў уключыць і паўднёвыя землі Беларусі – Падняпроўе і Палессе. Каб заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва, на землях Беларусі распаўсюджваліся *гетманскія універсалы*, у якіх Хмяльніцкі заклікаў жыхароў уздымацца на барацьбу супраць «паноў і ляхаў». Б. Хмяльніцкі нават пасылаў на Палессе казацкія *загоны*, якія ўзначальвалі Галавацкі, Галота, Нябаба, Гаркуша і іншыя яго паплечнікі. Гэтыя атрады адыгралі ролю каталізатара ў пачатку народнага руху на тэрыторыі Паўднёвай Беларусі.

Звесткі пра перамогі Хмяльніцкага над каронным войскам у маі 1648 г. пад Корсунем і Жоўтымі Водамі спрыялі ўцягванню ва ўзброеную барацьбу сялян і гарадскіх нізоў Беларусі, асабліва на памежных з Украінай тэрыторыях. Казацка-сялянскія атрады авалодалі Гомелем, Лоевам, Чачэрскам, Брагінам, Бабруйскам, Пінскам, Кобрынам і некаторымі іншымі гарадамі.

Па сваім характары вайна ў Беларусі мела яскрава выражаны *антыфеадальны, антыкаталіцкі і антыуніяцкі* характар. Дзейнасць казацка-сялянскіх атрадаў заключалася найперш у руйнаванні і рабаванні шляхецкіх маёнткаў, а таксама праследаванні і фізічным вынішчэнні уніятаў і каталікоў, якія вымушаны былі ратавацца ўцёкамі ўглыб краіны. Не пазбеглі казацкіх рэпрэсій і прадстаўнікі іудзейскага веравызнання.

На ўтаймаванне паўстанцаў было накіравана спецыяльна сабранае войска ВКЛ на чале з гетманам Янушам Радзівілам, якое ў першай палове 1649 г. здолела ўзяць пад свой кантроль поўдзень Беларусі. Рашаючая бітва, у якой галоўныя сілы казакаў былі разбітыя, адбылася 6 ліпеня 1651 г. пад Лоевам. Армія ВКЛ, развіваючы поспех, 4 жніўня 1651 г. увайшла ў Кіеў. Паводле Белацаркоўскага пагаднення, падпісанага ў верасні 1651 г., Хмяльніцкі абавязваўся вывесці ўсе казацкія загоны з Беларусі. Гэта прывяло да спынення супраціўлення народных мас Беларусі, якія аказаліся пазбаўленымі арганізаванай ваеннай падтрымкі.

Чатыры гады вайны адмоўным чынам адбіліся на эканоміцы і дэмаграфічнай сітуацыі ў Беларусі. Найбольш пацярпелі паўднёвыя землі, дзе спачатку казацка-сялянскія атрады рабавалі і знішчалі феадальныя маёнткі разам з сем'ямі, а потым, помсцячы, войска Радзівіла спальвала разам з насельніцтвам вёскі і цэлыя гарады. У краіне абвастрыліся сацыяльнае становішча і канфесійная сітуацыя.

І галоўнае, заклікаючы сялян да паўстання, Хмяльніцкі зусім не дбаў пра самастойнасць беларускага народа, які ў той час ажыццяўляў сваю дзяржаўнасць у складзе Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай. Украінскі гетман хацеў уключыць (інкарпараваць) паўднёвую Беларусь у склад сваёй казацкай дзяржавы. Каб захаваць сваю ўладу і забяспечыць спадчыннае панаванне дынастыі гетманаў Хмяльніцкіх, ён у 1654 г. заключыў з рускім царом пагадненне аб уваходжанні Украіны на правах аўтаноміі ў склад Маскоўскай дзяржавы (*Пераяслаўская рада*) і яшчэ здолеў адыграць адмоўную ролю ў гісторыі Беларусі.

Казацка-сялянская вайна з'явілася прадвеснікам больш раз-

буральных ваенных дзеянняў, якія паклалі пачатак сапраўднаму «крываваму патопу» на тэрыторыі ўсёй Рэчы Паспалітай.

***Вайна Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай за беларускія землі (1654–1667 гг.).*** Ва ўмовах нестабільнасці ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай у 1653 г. Масква разарвала дыпламатычныя адносіны з Варшавай, і непазбежнасць вайны стала відавочнай. Яна пачалася ў маі 1654 г. і стала самай жудаснай па сваіх выніках вайной у гісторыі Беларусі.

Дзеля дасягнення сваіх палітычных інтарэсаў маскоўскія ўлады традыцыйна разыгралі канфесійную карту – напярэдадні вайны ў Беларусь пасылаліся спецыяльныя *царскія граматы*, мэтай якіх была спроба пераканаць насельніцтва ў тым, што рускі цар Аляксей Міхайлавіч пачынае барацьбу з мэтай абароны праваслаўя. Тым, хто не акажа супраціву, гарантавалася царская міласць, іншых чакала бязлітасная расправа. Каб далучыць беларускія землі да сваёй дзяржавы, рускі цар накіраваў на тэрыторыю Беларусі 100-тысячнае войска, на дапамогу якому Хмяльніцкі паслаў 20 тыс. казакоў з Украіны.

ВКЛ не было падрыхтаванае да вайны, агульная колькасць войска налічвала толькі 10–12 тыс. чалавек. Дзякуючы перавазе сіл, а таксама актыўнай агітацыі, скіраванай да праваслаўнага насельніцтва, рускай арміі за адзін год удалося захапіць амаль увесь усход Беларусі. Некаторыя гарады здаваліся без бою – Магілёў, Крычаў, Шклоў, Новы Быхаў. Іншыя аказвалі мужнае супраціўленне, напрыклад, Віцебск, Дуброўна, Гомель, Мсціслаў. Няскораным застаўся Стары Быхаў. Рускія ваяводы атрымалі загад бязлітасна знішчаць гарады, якія аказвалі супраціўленне. Яскравым прыкладам можа служыць абарона Мсціслава, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай «*Трубяцкая разня*» (1654 г.). Пасля чатырохдзённай аблогі і магутнага штурму рускія войскі ўварваліся ў Мсціслаўскі замак і «*народ розны шляхецкі, мяшчан і яўрэяў у пень высеклі*». Паводле дакументаў, у Мсціслаўскім замку загінулі каля 15 тыс. чалавек.

Сітуацыя ўскладнялася тым, што ў вайну супраць Рэчы Паспалітай уступіла і Швецыя. У такіх умовах, каб выратаваць краіну, вялікі гетман ВКЛ Януш Радзівіл стаў ініцыятарам заклю-

чэння дагавору са Швецыяй. Дагавор прадугледжваў аб'яднанне ВКЛ і Швецыі на роўных правах, а шведскі кароль Карл Х Густаў прызнаваўся вялікім князем ВКЛ. Ён абавязваўся выгнаць маскоўскае войска за межы Беларусі. Таксама дэкларавалася свабода веравызнання. Гэтае пагадненне, якое аўтаматычна скасоўвала Люблінскую унію, вядома ў гісторыі як ***Кейданскі дагавор*** (1655 г.). Аднак ён не дапамог выратаваць Вільню ад захопу маскоўскім войскам у жніўні 1655 г. Апроч таго, большасць шляхты захавала вернасць каралю Рэчы Паспалітай Яну Казіміру, і праз год Кейданскі дагавор фактычна страціў сваю сілу.

У 1656 г. Рэч Паспалітая і Маскоўская дзяржава падпісалі двухгадовае перамір'е, і рускія войскі на акупаваных беларускіх тэрыторыях паказалі свой сапраўдны твар захопнікаў. Гэта быў жудасны час для беларускага насельніцтва, адбывалася сапраўднае «паляванне на людзей», паколькі адной з асноўных мэтаў Маскоўскай дзяржавы быў вываз мясцовага насельніцтва. Служылыя рускія людзі мелі спецыяльны царскі дазвол *«имать полон»* (браць палонных). Гандаль «литовским полоном» стаў важнай крыніцай даходаў. Вывозіліся пераважна маладыя жанчыны, дзеці, рамеснікі, заможныя сяляне разам з інвентаром і цяглавай жывёлай. Тыя, хто застаўся на акупаваных тэрыторыях, зведалі рабаўніцтва, марадзёрства і гвалт з боку рускіх войскаў. Праследаванням падвяргаліся каталікі, уніяты, іудзеі і іншыя прадстаўнікі неправаслаўнага веравызнання.

Рабаванні і злоўжыванні рускіх войскаў прывялі да пачатку і хуткай актывізацыі на тэрыторыі Беларусі партызанскай барацьбы супраць захопнікаў. У афіцыйных дакументах Маскоўскай дзяржавы партызаны называліся *шышамі*, адзначалася іх асаблівая небяспека для разрозненых фарміраванняў рускіх. Шышамі былі ў асноўным мясцовыя сяляне, атрадамі якіх звычайна камандавалі шляхціцы. Да моцнай хвалі партызанскага руху і гарадскіх паўстанняў супраць акупантаў у 1660 г., пасля падпісання міра са Швецыяй, далучыліся і войскі ВКЛ і Кароны. Такім чынам рух народнага супраціўлення аб'яднаў прадстаўнікоў розных станаў і канфесій. Вызваленчая барацьба набыла характар *усенароднай*.

Працяглая вайна скончылася на пачатку 1667 г. заключэннем Андрусаўскага міра. Згодна з яго ўмовамі, да Маскоўскай дзяржавы адыходзілі Смаленская і Северская землі, а таксама Левабярэжная Украіна.

***Вынікі вайны для Беларусі.*** Па сваіх наступствах гэта была самая стратная вайна для беларускага народа за ўсю яго гісторыю: колькасць насельніцтва зменшылася на 53% – з 2 млн. 876 тыс. чалавек у 1650 г. да 1 млн. 352 тыс. чалавек у 1667 г. Ва ўладаннях на ўсходзе Беларусі скарачэнне колькасці жыхароў дасягала 80–90%. Ваенныя дзеянні, голад, эпідэміі і, галоўнае, маскоўскі палон зменшылі насельніцтва не толькі колькасна, але і якасна. Лепшыя беларускія рамеснікі-майстры, сяляне, моладзь, вывезеныя падчас вайны, заставаліся ў межах Маскоўскай дзяржавы і працавалі на яе карысць (толькі ў Маскве ў 70-я гады XVII ст. яны складалі 10% ад усяго пасадскага насельніцтва).

На тэрыторыі ж Беларусі наступіў глыбокі эканамічны крызіс. Звыш за 60% ворыўнай зямлі ляжала ў пустках, не хапала ні рабочых рук, ні цяглавай жывёлы для яе апрацоўкі. Сялянства не мела магчымасцяў не толькі выплачваць феадальную рэнту, але і весці гаспадарку, неабходную для простага існавання сям'і.

Важную ролю ў працэсе вываду эканомікі краіны з пасляваеннага крызісу адыгралі гаспадарчыя мерапрыемствы, праведзеныя ўладай у дзяржаўных маёнтках – каралеўскіх сталовых эканоміях, староствах і дзяржавах. Асаблівасцю дзяржаўнай палітыкі аднаўленчага перыяду другой паловы XVII ст. стала *імкненне да ўзнаўлення патэнцыялу сялянскай гаспадаркі*. Адбывалася гэта праз увядзенне спецыяльна распрацаванай сістэмы льготных умоваў гаспадарання, у аснову якой была пакладзена палітыка ачыншавання – ліквідацыя фальваркаў і перавод сялян з адпрацовачнай рэнты на грашовую (з паншчыны на чынш).

Для ўвядзення ў гаспадарчае абарачэнне як мага большай плошчы земляў, павелічэння колькасці насельніцтва і цяглавай жывёлы ў найбольш разбураных уладаннях (асабліва на ўсходзе Беларусі) дзяржава актыўна ўжывала практыку «слабод» з частковым або поўным вызваленнем насельніцтва ад феадальнай рэнты на тэрмін

ад пяці да пятнаццаці гадоў, а таксама дазваляла розныя формы апрацоўкі зямлі – «у наезд», «з долі ўраджаю» і інш.

Аб эфектыўнасці аднаўленчай палітыкі дзяржавы сведчыла масавае вяртанне сялян у сталовыя эканоміі. Акрамя таго, узважаная палітыка скарбу па паслабленню павіннаснага абкладання насельніцтва стала прыкладам для многіх (безумоўна, не для ўсіх) прыватных уласнікаў.

Такім чынам, не адмаўляючы сутнасці феадальнай дзяржавы, неабходна падкрэсліць, што пасля войнаў сярэдзіны – другой паловы XVII ст. яна з'яўлялася не толькі апаратам, механізм якога быў накіраваны на эксплуатацыю насельніцтва. У тыя часы дзяржава выступіла ў першую чаргу са стваральнымі функцыямі, імкнучыся не толькі атрымаць як мага больш прыбыткаў у скарб, але і забяспечыць (заканадаўча, матэрыяльна, тэхнічна і інш.) стабільнае развіццё гаспадаркі і абавязкова даць магчымасць для жыцця і аднаўлення гаспадаркі селяніна – асноўнай вытворчай сілы феадальнай эпохі. Да пачатку XVIII ст. эканамічны крызіс быў пераадолены і гаспадарка Беларусі дасягнула даваеннага ўзроўню.

***Змяненне канфесійнай сітуацыі.*** Нягледзячы на тое, што ВКЛ здолела выйсці з эканамічнага крызісу, агульная дэструкцыя, выкліканая наступствамі вайны 1654–1667 гг., кардынальна змяніла грамадскае жыццё ў краіне – сацыяльную структуру насельніцтва, моўна-культурную і канфесійную сітуацыі.

У сярэдзіне XVII ст. карэнным чынам мяняецца становішча праваслаўнай царквы ў краіне – ад рэлігійнай талерантнасці і верацярпімасці часоў Уладзіслава IV і Яна Казіміра ўлады Рэчы Паспалітай узялі курс на абмежаванне яе правоў. Звязана гэта было з тым, што праваслаўная царква ў ВКЛ мела прамаскоўскую арыентацыю і нярэдка аказвала падтрымку рускім войскам. Апроч таго, у 1685 г. Кіеўская мітраполія афіцыйна была пераведзеная з-пад падпарадкавання Канстанцінопалю пад юрысдыкцыю Маскоўскага патрыярхату, і маскоўскія ўлады пачалі лічыць, што маюць «законныя» правы ўмешвацца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай для «абароны правоў праваслаўных».

Другая палова XVII ст. стала перыядам хуткага заняпаду права-

слаўя і пашырэння уніі на тэрыторыі Беларусі. У 1673 г. сойм пазбавіў права праваслаўных набываць шляхецтва, а ў 1699 г. – займаць выбарныя магістрацкія пасады. Палітычныя правы фактычна сталіся прэрагатывай толькі каталікоў. Праваслаўная беларуская шляхта масава пераходзілі ў каталіцтва, разам з прыняццем якога выбіралі і польскія культурныя прыярытэты, што непазбежна вяло да пала_нізацыі і заняпаду беларускай культуры. Апагеем такой палітыкі стаў 1696 г., калі па рашэнні сойма ўсё справаводства ў ВКЛ пераводзілася на польскую мову. Адпаведна польскай станавілася і адукацыя, што не спрыяла з'яўленню ўласна беларускай інтэлігенцыі і на доўгі час замарудзіла фармаванне беларускай нацыі.

***Змяненне дэмаграфічнай сітуацыі ў гарадах.*** У другой палове XVII – пачатку XVIII ст. у гарадах Беларусі назіраўся эканамічны і культурны заняпад, які быў выкліканы наступствамі папярэдніх войнаў. Калі ў XVII ст. на тэрыторыі Беларусі налічвалася 37 гарадоў і 320 паселішчаў местачковага тыпу, то ў сярэдзіне XVIII ст. гарадоў і гарадскіх паселішчаў засталося 228, а колькасць жыхароў у іх зменшылася ў 2,5 раза. Акрамя таго, адбыліся змены ў канфесійным і нацыянальным складзе насельніцтва беларускіх гарадоў. Калі да сярэдзіны XVII ст. у іх у асноўным жылі праваслаўныя, а беларускі этнас складаў 80% агульнай колькасці гараджан, то да сярэдзіны XVIII ст. значна павялічылася колькасць яўрэяў.

Гэты працэс пачаўся пасля вайны 1654–1667 г., наступствы якой негатыўна адбіваліся і на гандлёвых сувязях паміж горадам і вёскай. Пасля ўвядзення дзяржавай сістэмы льгот і «слабод» гараджане ахвотна перасяляліся туды, дзе былі свабодныя хаты і шмат пустой зямлі, за карыстанне якой яны на працягу ад 5 да 15 гадоў вызваляліся ад усіх падаткаў і павіннасцяў. Таму асноўнай масай жыхароў у гарадах сталі яўрэі, якія не мелі права працаваць на зямлі і карыстацца льготамі.

Такім чынам, беларускі горад з канца XVII ст. па большасці насельніцтва стаў яўрэйскім, палітычная эліта была прадстаўлена спаланізаванай і акаталічанай шляхтай, а беларускі этнас пачаў атаясамлівацца толькі з сялянствам, якое складала большасць насельніцтва краіны.

***2. ВКЛ у Паўночнай вайне (1700–1721 гг.).*** На пачатку XVIII ст. Рэч Паспалітая аказалася ўцягнутай у жорны чарговай вайны, а беларускія земліператварыліся ў асноўны тэатр ваенных дзеянняў.

Галоўнай прычынай вайны стала жаданне Даніі, Саксоніі і Расіі, якія ўтварылі так званы «Паўночны саюз», абмежаваць панаванне Швецыі на Балтыйскім моры. Да гэтых краін далучылася і Рэч Паспалітая, каралём якой з 1697 г. з'яўляўся саксонскі курфюрст Аўгуст II Моцны.

Пачатак вайны аказаўся няўдалым для саюзнікаў: на працягу 1700–1701 гг. шведская армія па чарзе перамагла войскі Даніі, Расіі і Саксоніі і на пачатку 1703 г. уварвалася на землі ВКЛ. Шведы хутка занялі Вільню, Гародню, крыху пазней – Варшаву і Кракаў, а Аўгуст II ратаваўся ўцёкамі.

Знешнепалітычнае становішча Княства ўскладнялася ўнутраным супрацьстаяннем у грамадстве: атрымаўшыя паразу ад сваіх палітычных сапернікаў 17 лістапада 1700 г. у бітве пад Алькенікамі Сапегі імкнуліся ўзяць рэванш і бачылі ў асобе Карла XII свайго саюзніка, а антысапегаўская шляхецкая партыя на чале з Агінскімі і Вішнявецкімі шукала падтрымкі ў расійскага цара Пятра I. У ліпені 1704 г. арганізаваная Карлам XII Варшаўская канфедэрацыя выбрала каралём познаньскага ваяводу Станіслава Ляшчынскага. У адказ на гэта прыхільнікі Аўгуста II аб'ядналіся ў Сандамірскую канфедэрацыю і заключылі ў жніўні 1704 г. *Нарвенскі саюз* з Расіяй супраць Швецыі. Такім чынам на тэрыторыі ВКЛ апынуліся дзве варожыя арміі, а Беларусь да 1709 г. стала асноўнай арэнай, дзе Пётр I і Карл XII з дапамогай зброі высвятлялі свае адносіны, рабавалі і знішчалі краіну і разам з тым яшчэ больш садзейнічалі расколу і канфрантацыі ў шляхецкім стане Рэчы Паспалітай.

Як заўсёды, асноўны цяжар вайны прыняло на сябе простае беларускае насельніцтва, у якога і руская, і шведская арміі прымусова забіралі правіянт і фураж, а астатняе, каб не даставалася праціўніку, спальвалі, пакідаючы мясцовы люд практычна без сродкаў існавання.

У 1706 г. ваенныя дзеянні складваліся не на карысць саюзнікаў Аўгуста II. У студзені армія Карла XII на тры месяцы блакавала

рускі гарнізон у Гродне, а ў лютым былі разбіты саксонскія войскі. Шведы пачалі рабаўнічы марш па землях Беларусі. Былі абрабаваны, спустошаны і часткова спалены Карэлічы, Клецк, Ляхавічы, Пінск, Мір, Нясвіж і іншыя гарады. У такіх умовах пад націскам шведаў у 1706 г. Аўгуст II вымушаны быў афіцыйна адмовіцца ад улады на карысць Станіслава Ляшчынскага. На бок новага караля перайшлі і некаторыя буйныя магнацкія роды (Радзівілы, Пацы, Вішнявецкія), але частка шляхты не прызнала Ляшчынскага законным каралём, і грамадзянская вайна ў ВКЛ працягвалася.

Ля вёскі Лясная 28 верасня 1708 г. руская армія разбіла корпус Левенгаўпта з вялікім абозам правіянту для войска Карла XII, а 27 чэрвеня 1709 г. адбылася Палтаўская бітва, дзе шведскае войска пацярпела сакрушальнае паражэнне, і ваенная ініцыятыва перайшла да Пятра I. У 1709 г. на трон Рэчы Паспалітай ізноў узышоў Аўгуст II. Хоць шведы былі выгнаныя з Рэчы Паспалітай і ваенныя дзеянні на яе тэрыторыі спыненыя, Пётр I не спяшаўся выводзіць свае войскі з беларускіх земляў. Прысутнасць у мірны час чужаземнага войска на тэрыторыі сваёй дзяржавы не падалося шляхце небяспечнай з'явай, і яна па-ранейшаму працягвала барацьбу за першынство ў краіне, чым бесперапынна паслабляла ўнутры- і знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай.

***Вынікі вайны.*** Паўночная вайна не прынесла тэрытарыяльных зменаў Рэчы Паспалітай, аднак прынесла незлічоныя беды беларускаму народу, на плечы якога выпаў асноўны цяжар вайны. Яшчэ цалкам не аправіўшыся ад войнаў сярэдзіны – другой паловы XVII ст., Беларусь ізноў страціла трэцюю частку свайго насельніцтва, больш за 40% ворыўнай зямлі ляжала ў пустках. Моцна пацярпелі і беларускія гарады. Яскравым прыкладам з'яўляецца лёс г. Магілёва, які пасля разбурэння шведскай арміяй быў 8 верасня 1708 г. дашчэнту спалены па загадзе Пятра I. У выніку некалі магутны гандлёвы цэнтр у Беларускім Падняпроўі так і не змог аднавіць сваёй былой велічы.

З аднаго боку, аднаўленчы перыяд першай паловы XVIII ст. павінен быў быць лягчэйшым, паколькі скарбам ужо былі распрацаваныя і праверaныя на практыцы рычагі і механізмы гаспадарчай адбудовы ў другой палове XVII ст. Аднак аб'ектыўныя эканамічныя

цяжкасці, звязаныя з ваенным ліхалеццем, ускладняліся яшчэ і тым, што на пачатку XVIII ст. разбурэнне напаткала не поўнасцю аднаўленую і ўмацаваную сельскую гаспадарку. Таму разам з выкарыстаннем ужо вядомых мер і льготаў дзяржава вымушаная была шукаць новыя дзейсныя спосабы эфектыўнага гаспадарчага адраджэння. У гэты перыяд пашырылася сялянская каланізацыя (асабліва на ўсходзе Беларусі), узрасла роля грашовых падаткаў. Аднаўленчы перыяд першай паловы XVIII ст. быў больш працяглым па часе: калі ў мінулым стагоддзі для адбудовы гаспадаркі спатрэбілася каля трыццаці год, то ў пачатку XVIII ст., нягледзячы на меншыя разбурэнні, эканоміка выходзіла з крызісу амаль паўстагоддзя.

Другая палова XVII і пачатак XVIII ст. для эканомікі Беларусі былі, бадай што, самымі цяжкімі. «Страчанае стагоддзе» – так можна ахарактарызаваць гэты час адносна гаспадарчай гісторыі нашай краіны. Калі ў XVII–XVIII ст. у перадавых краінах Еўропы адбываўся працэс хуткага накаплення капіталу, а ў 60-я гады XVIII ст. у Англіі ўжо пачаўся прамысловы пераварот, то Вялікае княства Літоўскае двойчы аказвалася перад неабходнасцю ўздымаць з руінаў гаспадарку, разбураную войнамі. Працяглыя і спусташальныя ваенныя дзеянні штучна перарвалі натуральны працэс эканамічнага жыцця, і гаспадарка Беларусі гэтага перыяду не развівалася, а вырашала праблемы хутчэйшай адбудовы.

***Унутрыпалітычная дэцэнтралізацыя.*** Ваенныя дзеянні адмоўна адбіліся не толькі на эканамічным становішчы краіны, але і сталі прычынай унутрыпалітычнай дэцэнтралізацыі, якая выявілася ў барацьбе магнацкіх груповак за ўладу.

Яшчэ ў канцы XVI ст. у Рэчы Паспалітай склаўся комплекс шляхецкіх прывілеяў, якія ўтварылі так званыя «залатыя шляхецкія вольнасці». Галоўнымі сярод іх з'яўляліся роўнасць усіх шляхціцаў перад законам, права на свабоду выбараў караля, на свабоду галасавання (liberum veto), недатыкальнасць асобы шляхціца і яго маёнтка (права імунітэту), права ўтвараць канфедэрацыі і права рокаша.

Пасля войнаў сярэдзіны – другой паловы XVII ст. на фоне агульнадзяржаўнага эканамічнага крызісу і пагаршэння матэрыяльнага становішча большасці сярэдняй і дробнай шляхты палітычныя

правы заставаліся адзіным, што рэальна магла захаваць шляхта ў нязменнасці. Галоўную сваю задачу яна бачыла не ў карпатлівай працы на карысць дзяржавы, а ў захаванні існуючай палітычнай сістэмы.

Вельмі хутка згубнасць «залатых шляхецкіх вольнасцяў» стала відавочнай. Усялякія прапановы новаўвядзенняў з боку ўлады расцэньваліся дэпутатамі сонмаў як замах на іх даўнія правы і блакаваліся. Усё часцей на пасяджэннях соймаў паслы звярталіся да права «ліберум вета» і грэбавалі дзяржаўнымі справамі дзеля ўласных інтарэсаў. Фактычна ў другой палове XVII ст. распачаўся крызіс парламентарнай сістэмы Рэчы Паспалітай, які за стагоддзе ператварыў шляхецкую рэспубліку ў шляхецкую анархію.

Эканамічны крызіс другой паловы XVII ст. прывёў да паглыблення маёмаснай дыферэнцыяцыі ўнутры шляхецкага саслоўя. Усё большую вагу ў Княстве сталі адыгрываць магнацкія роды – Радзівілы, Сапегі, Пацы, Вішнявецкія, якія, валодаючы вялікімі зямельнымі латыфундыямі, не жадалі падпарадкоўвацца вярхоўнай уладзе, ператварыліся фактычна ва ўдзельных князёў і называлі сябе «ўладарамі Вялікага Княства». Яны абкружалі сябе збяднелай у час вайны дробнай шляхтай, з якой утваралі ўласную *кліентэлу* – давалі ёй зямельныя ўладанні і патрабавалі за гэта вернасці і адданай службы ў іх прыватным войску.

Найбольш знакамітыя магнацкія роды вялі паміж сабой барацьбу за першынство ў краіне. У 50-я – пачатку 60-х гг. XVII ст. унутрыпалітычнае жыццё ў ВКЛ вызначалася панаваннем роду Радзівілаў, у сярэдзіне 60-х – пачатку 70-х гг. – Пацаў, а ў 90-я гады – Сапегаў. Нашчадкі гэтага аднаго з самых старажытных родаў ВКЛ на рубяжы XVII–XVIII ст. здолелі заняць амаль усе асноўныя дзяржаўныя пасады і хацелі ператварыць у жыццё ідэю вялікага гетмана Яна Казіміра Сапегі, якая заключалася ў разрыве уніі з Польшчай і ўсталяванні незалежнасці ВКЛ. Сапежынская ўсяўладнасць выклікала незадаволенасць іншых магнацкіх сем'яў, у першую чаргу Агінскіх і Вішнявецкіх. Складанасць унутрыпалітычнай сітуацыі дапаўнялася яшчэ і бескаралеўем, якое наступіла ў 1696 г. пасля смерці Яна III Сабескага і якое імкнуліся выкарыстаць суседнія краіны, каб пасадзіць на трон Рэчы Паспалітай выгадную для сябе фігуру.

Выбраны каралём саксонскі курфюрст Фрыдрых-Аўгуст ІІ (Моцны) (1697–1733 гг.) імкнуўся згладзіць канфлікт паміж магнацкімі родамі ў ВКЛ, але напачатку XVIII ст. канфрантацыя толькі ўзмацнілася і набыла характар грамадзянскай вайны. 18 лістапада 1700 г. пад Алькенікамі адбылася рашаючая бітва паміж войскам Сапегаў, якое складалася з кліентэлы, наёмнікаў і нават сялян, і паспалітым рушэннем, якое сабрала шляхта ВКЛ. Сапегі былі разбіты, а шляхта прыняла пастанову, па якой Сапегі страчвалі ўсе дзяржаўныя пасады і ўладанні ў ВКЛ.

Паўночная вайна не спыніла барацьбы магнацкіх груповак за ўладу ў першай палове XVIII ст., што яшчэ больш спрыяла ўмяшальніцтву ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай іншых дзяржаваў. Краіны-суседзі – Расія, Аўстрыя і Прусія прыкладалі шмат намаганняў для таго, каб не даць парушыць «дэмакратычныя» парадкі ў Рэчы Паспалітай і тым самым замацаваць *шляхецкую анархію*. У 1717 г. аднадзённы «*нямы*» сойм у Варшаве, пастановы якога, прадыктаваныя расійскім урадам, прымаліся без абмеркавання, яшчэ больш абмежаваў уладу караля. Колькасць войска скарачалася ў ВКЛ да 6 тыс. жаўнераў, а ў Кароне – да 18 тысяч. Акрамя таго, у 1720 г. Пётр I і прускі кароль Фрыдрых Вільгельм дамовіліся не дапусціць магчымасці палітычнага і эканамічнага рэфармавання Рэчы Паспалітай. У 1726 г. да гэтай дамовы далучылася Аўстрыя.

У 1733 г. большасцю галасоў каралём Рэчы Паспалітай быў абраны Станіслаў Ляшчынскі, але Расія і Аўстрыя пры падтрымцы расійскага войска дамагліся, каб новым манархам быў абвешчаны чарговы прадстаўнік саксонскай дынастыі *Аўгуст III Прыгожы* (1733–1763 гг.).

Змаганне магнацкіх груповак пры новым манарху працягвалася. Напачатку кааліцыя Чартарыйскіх, Сапегаў, Масальскіх і Салагубаў аб'ядналася супраць палітычнага дамінавання ў краіне роду Радзівілаў. Потым супрацьстаянне ішло ў асноўным паміж Чартарыйскімі і Радзівіламі. Найбольш выразна гэтая барацьба праяўлялася ў працы агульнадзяржаўных соймаў, дзе супернікі актыўна прымянялі «ліберум вета». У выніку ўсе соймы, за выключэннем сойма 1736 г., былі сарваны. Рашэнні, неабходныя для дзяржавы

і грамадства, не прымаліся. Аўгуст ІІІ, які ў знешняй палітыцы арыентаваўся на Расію, дзяржаўнымі справамі амаль не займаўся, а большасць свайго часу праводзіў у Саксоніі. Унутрыпалітычны крызіс працягваўся, дзейнасць цэнтральнай улады практычна была паралізаваная.

***3. Культура Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст.*** Беларуская культура ў другой палове XVII–XVIII ст. развівалася ў вельмі неспрыяльных умовах. Як адзначалася вышэй, пасля войнаў другой паловы XVII ст. змянілася канфесійная сітуацыя на землях Беларусі – ад талерантнасці да рэлігійнай нецярпімасці, што не магло не паўплываць на агульны стан культуры. Больш за тое, пасля пераводу ў 1696 г. усяго справаводства на польскую мову распачалася адкрытая паланізацыя і акаталічванне, у першую чаргу шляхты. Манаполію на адукацыю захапіў касцёл, што вылілася ў клерыкалізацыю культуры. Былі забытыя дасягненні «залатога веку» (Рэнесансу), паўсюдна ў Рэчы Паспалітай панаваў рэлігійны фанатызм.

У галіне адукацыі абсалютнае першынство трымала каталіцкая царква. Вядучае месца ў сістэме арганізацыі навучання і яго якасці належала ордэну *езуітаў*. Езуіцкія школы былі адчыненыя практычна ва ўсіх вялікіх гарадах Беларусі і многіх мястэчках. На навучанне ў іх прымаліся не толькі каталікі, але і прадстаўнікі іншых хрысціянскіх канфесій. Адной з галоўных задач езуітаў было пашырэнне праз адукацыю ўплыву каталіцкай царквы на жыццё грамадства.

З 1720-х гг. у Беларусі былі шырока прадстаўленыя навучальныя ўстановы каталіцкага манаскага ордэна *піяраў* (Шчучын, Воранава, Геранёны, Зэльва Віцебск, Ліда і інш.). У піярскіх школах (*калегіумах*) вывучалі, як і ў езуіцкіх навучальных установах, лацінскую і старажытнагрэчаскую мовы, рыторыку, астраномію, геаметрыю, філасофію і інш. Але ў адрозненне ад езуітаў піяры з дапамогай сваёй сістэмы адукацыі ставілі задачу навучання і выхавання моладзі, а не місіянерскую і палітычную дзейнасць.

Дзейнічаў заснаваны ў 1579 г. Віленскі ўніверсітэт (напачатку езуіцкі калегіум, потым акадэмія). З 1580 г. у г. Полацку таксама

быў створаны езуіцкі калегіум – першая сярэдняя навучальная ўстановы ордэна езуітаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Навучаннем моладзі займаліся і праваслаўныя праз школы створаныя пры царкоўных *брацтвах* (Вільня, Магілёў, Брэст). Пратэстанты таксама стваралі свае навучальныя ўстановы: *арыянскія* школы ў Іўі, Клецку, Любчы, Лоску, Нясвіжы, Наваградку; *кальвінісцкія* школы ў Слуцку, Віцебску, Мінску, Глыбокім, Заслаўі, Івянцы, Оршы, Магілёве.

Галоўным мастацкім стылем у той час было *барока*, якое асабліва выявілася ў архітэктуры (дынамічнасць кампазіцыі, кантраснасць маштабаў, ілюзія бязмежнай прасторы і г. д.). У адпаведнасці з гэтым стылем у гарадах і вёсках будаваліся касцёлы, манастыры і магнацкія сядзібы. На другую палову XVII–XVIII ст. прыпадае этап сталага (позняга) барока. У царкоўнай архітэктуры гэта выявілася ў пабудове касцёлаў з двума вежамі, наданнем пабудовам большай пластыкі, вытанчанасці, лёгкасці, імкненнем уверх. У 1730-я гады ў царкоўным дойлідстве сфармаваўся своеасаблівы архітэктурны стыль – *віленскае барока.* Яго аўтар – *Ян (Іаган) Крыштоф Глаўбіц,* які пабудаваў шмат касцёлаў у Вільні, касцёл Яна Хрысціцеля ў Сталавічах, царкву Магілёўскага Спаскага манастыра, перабудаваў Полацкі Сафійскі сабор.

Віленскаму барока былі ўласцівыя вытанчанасць прапорцый, лёгкасць і ажурнасць пабудоў, пышны дэкор фасада, прыгожасць ўнутранай аздобы пабудоў.

На рубяжы XVII–XVIII ст. развівалася тэатральнае жыццё ў ВКЛ. Найбольш былі распаўсюджаны тэатры пры езуіцкіх навучальных установах, існаваў народны лялечны тэатр – *батлейка.* У якасці мецэнатаў культуры выступалі ў першую чаргу магнаты, якія мелі ва ўласных маёнтках прыгонныя тэатры. Яны нават пасылалі найбольш таленавітых прыгонных акцёраў вучыцца за мяжу. Адным з першых у XVIII ст. Францішкай Уршуляй Радзівіл быў заснаваны прыгонны тэатр у Нясвіжы. Вядомы быў таксама слонімскі тэатр Міхала Агінскага.

Нягледзячы на цяжкасці ў развіцці культуры, Беларусь мела ў тыя часы знакамітых асобаў, якімі па праву ганарыцца і сён-

ня. Сярод іх грамадскія і царкоўныя дзеячы, аўтары падручнікаў *Мялецій Сматрыцкі* (1572–1633) і *Сімяон Полацкі* (1629–1680); *Казімір Лышчынскі* (1634–1689), які за свой трактат «Аб неіснаванні бога» быў спалены на вогнішчы інквізіцыі; *Казімір Семяновіч* (каля 1600 – пасля 1651), які выдаў кнігу «Вялікае мастацтва артылерыі», а таксама ўпершыню ў свеце стварыў праект шматступенчатай ракеты; *Ілля Капіевіч* (1651–1714), які выдаў больш за 20 падручнікаў па граматыцы і рыторыцы.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Ачыншаванне*** – перавод сялян з адпрацовачнай рэнты на грашовую.

***Дысідэнты*** – агульная назва ўсіх некаталікоў у Рэчы Паспалітай.

***Загоны*** – назва казацкіх атрадаў у войску Б. Хмяльніцкага.

***Канвакацыйны сойм*** – сойм у Рэчы Паспалітай, які вызначаў месца і час выбараў караля.

***Каранацыйны сойм*** – сойм у Рэчы Паспалітай, на якім адбываліся выбары караля.

***Люстрацыя*** – перыядычны перапіс дзяржаўнай маёмасці з мэтай вызначэння яе даходнасці.

***Мануфактура*** – прамысловае прадпрыемства, заснаванае на ўжыванні падзелу працы і ручной рамеснай тэхнікі.

***Слабада*** – поўнае або частковае вызваленне сялян ад павіннасцяў на тэрмін ад 5 да 15 гадоў.

***Элекцыйны сойм*** – сойм у Рэчы Паспалітай, на якім кароль прысягаў выконваць умовы, паводле якіх адбылося яго выбранне.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Чаму перыяд другой паловы XVII – першай паловы XVIII ст. у беларускай гісторыі называецца «разбуральным стагоддзем»?

2. Параўнайце перыяды аднаўлення гаспадаркі на землях Беларусі ў другой палове XVII і першай палове XVIII ст. Вызначце падабенства і адрозненні.

3. Вызначце асноўныя прыкметы архітэктурнага стылю «віленскае барока».

# ТЭМА 7. БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII СТ.

1. *Унутрыпалітычная сітуацыя ў сярэдзіне XVIII ст.*
2. *Спробы мадэрнізацыі жыцця ў другой палове XVIII ст. Рэформы А. Тызенгаўза.*
3. *Падзелы Рэчы Паспалітай. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі 1794 г.*
4. *Культура Беларусі ў другой палове XVIII ст.*

***1. Унутрыпалітычная сітуацыя ў сярэдзіне XVIII ст.*** У сярэдзіне XVIII ст. на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў краіне аказвалі ўплыў дзве магнацкія групоўкі: 1) «Фамілія» – прыхільнікі роду Чартарыйскіх, якія выступалі за неабходнасць правядзення эканамічных і палітычных рэформ у краіне; 2) «рэспубліканцы» – прадстаўнікі розных магнацкіх родаў, якіх з сярэдзіны XVIII ст. узначальваў Караль Станіслаў Радзівіл («Пане Каханку»). Пасля смерці ў 1763 г. Аўгуста III гэтыя групоўкі актыўна ўключыліся ў барацьбу за вылучэнне свайго кандыдата на трон Рэчы Паспалітай. Больш слабая «Фамілія» для палітычнай перамогі папрасіла ваенную падтрымку ў Кацярыны II. Такім чынам пры дапамозе расійскага ваеннага, палітычнага і фінансавага ўдзелу на сойме 1764 г. чарговым (і, як аказалася, апошнім) каралём Рэчы Паспалітай быў абраны пляменнік канцлера ВКЛ Міхала Фрэдэрыка Чартарыйскага ўраджэнец Беларусі *Станіслаў Панятоўскі* (1764–1795), які пры каранацыі ўзяў імя Аўгуст.

Такім чынам абранне Станіслава Аўгуста Панятоўскага, стаўленіка прагрэсіўнай магнацкай групоўкі, сведчыла, што Рэч Паспалітая ў другой палове XVIII ст. выбрала новы вектар развіцця – шлях рэформаў. Разам з тым перамога на выбарах пры апоры на іншаземнае войска чарговы раз адчыняла дзверы ўмяшальніцтву замежных краін ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай, што ў да-

лейшым і прывяло да знікнення дзяржавы ў выніку трох падзелаў яе тэрыторыі паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй (1772, 1793, 1795).

**2. *Спробы мадэрнізацыі жыцця ў другой палове XVIII ст.*** Магнаты і шляхта, якія хацелі палепшыць сітуацыю ў краіне і імкнуліся правесці рэформы ў эканоміцы і палітыцы, аб'ядналіся вакол Станіслава Аўгуста і «Фаміліі». Яны і склалі ядро ў *каралеўскай партыі*, якая павінна была стварыць апору ўлады і ўзняць яе аўтарытэт.

Спробы рэфармавання пачаліся на канвакацыйным сойме 1764 г., дзе, між іншым, было вырашана:

- абмежаваць практыку ўжывання права «ліберум вета» па эканамічных пытаннях, якія сталі прымацца простай большасцю галасоў;
- заснаваць Скарбавую камісію ВКЛ – Эканамічную Раду Літоўскага скарбу, якая з'яўлялася спецыяльным дзяржаўным органам па кіраванню фінансамі, кантролю за збіраннем і размеркаваннем падаткаў, ажыццяўленню судовых функцый па фінансавых справах, нагляду за гандлем і ўвогуле за гаспадарчай сітуацыяй у краіне;
- адмяніць ўнутрыдзяржаўныя гандлёвыя пошліны і замяніць іх адзіным «генеральным падаткам»;
- увесці ў дзяржаве адзіную сістэму мераў і вагі;
- стварыць разгалінаваную сістэму зносін для актывізацыі гандлю ў краіне і інш.

Разам з тым кароль, выбраны з дапамогай Расіі, вельмі хутка стаў адчуваць супрацьдзеянне з боку магнатэрыі і найбольш знакамітых і заможных родаў. Пры ажыццяўленні свайго палітычнага і эканамічнага курсу Станіслаў Аўгуст мог разлічваць толькі на асабіста адданых яму людзей, адным з якіх быў *Антоній Тызенгаўз*.

Займаючы пасады надворнага літоўскага падскарбія, гарадзенскага старосты, генеральнага адміністратара ўсіх каралеўскіх эканомій у ВКЛ, А. Тызенгаўз распачаў сістэму палітычных і эканамічных новаўвядзенняў і пераўтварэнняў, мэтай якіх было фінансавае ўмацаванне каралеўскай улады, пазбаўленне караля

залежнасці ад магнатаў, палітычная падтрымка С. Панятоўскага ўнутры краіны.

Ва ўмовах, калі большасць магнатэрыі выступала супраць новаабранага караля, апору апошняму трэба было не столькі шукаць, колькі ствараць. Гэтым і заняўся А. Тызенгаўз. Аснову прыдворнай партыі склалі «новыя людзі», якія прыйшлі да каралеўскага двара разам з С. Панятоўскім і А. Тызенгаўзам або дзякуючы ім. Гэта былі часцей за ўсё чыноўнікі сярэдняга і дробнага маштабу, трымальнікі ці адміністратары сталовых маёнткаў, а таксама прадстаўнікі дробнай і сярэдняй шляхты, якія разлічвалі нешта атрымаць ад уладаў. Не сакрэт, што былі тут і людзі, якія падтрымлівалі караля ў асноўным са сваіх перакананняў ці з іншых, неэканамічных, меркаванняў. Менавіта праз такую партыю, складзеную з адданых яму людзей, збіраўся ўмацаваць свой аўтарытэт і сваё становішча ў краіне Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Пра значэнне партыі, а разам з тым пра давер да яе кіраўнікоў сведчыць тое, што ў Кароне на чале партыі стаў брат караля Міхал Панятоўскі, а ў ВКЛ – А. Тызенгаўз.

Рэзідэнцыяй каралеўскай партыі, цэнтрам эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця ў ВКЛ у другой палове XVIII ст. стала Гародня: у горадзе, згодна з пастановай сойма 1673 г., праходзіў кожны трэці сойм Рэчы Паспалітай (акрамя *канвакацыйных*, *элекцыйных* і *каранацыйных*), для чаго ў 1737–1742 гг. быў пабудаваны новы каралеўскі палац; у Гародні праходзілі пасяджэнні Скарбавай камісіі і знаходзіўся яе архіў. Тут збіраліся на свае сходы прыхільнікі караля, выпрацоўваліся планы і прымаліся папярэднія рашэнні па шмат якіх справах. Часта такія зборы адбываліся напярэдадні дзяржаўных соймаў ці мясцовых соймікаў, пасля чаго іх удзельнікі маглі выступаць з узгодненых пазіцый. У распараджэнні каралеўскай партыі быў нават свой друкаваны орган – «Гродзенская газета», якая выдавалася з 1776 г. намаганнем А. Тыхзенгаўза.

***Рэформы А. Тызенгаўза ў дзяржаўных уладаннях. Аграрная рэформа.*** Ажыццяўленне сваіх рэфарматарскіх планаў А. Тызенгаўз распачаў з правядзення аграрных пераўтварэнняў у сталовых эканоміях ВКЛ, якія з’яўляліся асноўнай крыніцай папаўнення каралеўскага скарбу, з мэтай павелічэння іх прыбытковасці.

***Асноўныя мерапрыемствы рэформы.***

1. Рэформа пачалася з *люстрацыі* – дакладнай рэвізіі ў сталовых эканоміях ВКЛ. У першую чаргу, неабходнасць вызначэння іх даходнасці тлумачылася тым, што пры сістэме «слабодаў» і іншых ільгот, якія ўводзіліся ў папярэдні перыяд пасляваеннай адбудовы гаспадаркі, многія сяляне значна пашырылі свае надзелы, але гэта не знайшло адлюстравання ў інвентарах. У выніку збор падаткаў і выкананне сялянамі павіннасцяў ажыццяўляліся не з рэальнага ўчастка, а з замацаванага за пэўнай сям'ёй у даўніх дакументах, памеры якога звычайна былі значна меншыя за рэальны надзел.

2. Зямля, якая надавалася сялянам, падзялялася на дзве часткі – *сядзібную* (*аселую*) і *прыёмную*. З мэтай упарадкавання землекарыстання і падаткаабкладання кожная сялянская сям'я абавязаная была ўзяць ¼ частку валокі ў якасці сядзібнага надзелу, з якога прызначаліся асноўныя падаткі і павіннасці. Зямля, якая заставалася, атрымала назву прыёмнай і магла разбірацца сялянамі на добраахвотных пачатках у любой колькасці (у залежнасці ад наяўнасці яе ў маёнтку і ад гаспадарчых магчымасцяў той ці іншай сям'і) пераважна за дадатковы чынш.

3. Для павелічэння прыбытковасці каралеўскіх уладанняў па ініцыятыве А. Тызенгаўза ў іх *аднаўляліся фальваркі*, якія былі ліквідаваны ў другой палове XVII ст. Вяртанне да фальваркавай сістэмы было выклікана ростам цэн на збожжа на рынках Заходняй Еўропы. Адзначым, што гэта была не простая рэанімацыя фальваркаў, паколькі ўжываліся новыя формы апрацоўкі глебы, ліквідавалася сістэма «параў» і ўводзіліся шматпольныя севазвароты, паляпшалася жывёлагадоўля.

4. У сталовых эканоміях уводзілася паншчына ў памеры 2 дні ў тыдзень з асноўнага надзелу (з ¼ часткі валокі). У выніку сялянства падзялілася на дзве катэгорыі – *цяглыя*, якія адпрацоўвалі паншчыну, і *зямяне*, галоўнай павіннасцю якіх была выплата грашовай рэнты.

5. Рэформа прадугледжвала стварэнне ў вёсках «камунальных магазінаў» і «камунальных касаў», у якія сяляне былі абавязаныя рабіць натуральныя і грашовыя ўзносы. У «камунальныя»

ці «збожжавыя магазіны» ўзносы рабіліся ўсімі відамі зерня, якое прызначалася на выпадак агульнага неўраджаю альбо для пазыкі пацярпелым ад стыхійных бедстваў ці проста бедным. Грошы з «камунальных касаў» ішлі на добраўпарадкаванне вёсак, утрыманне дактароў, фельчараў, радзільных дамоў і да т. п. Існавалі таксама «правілы ўнутранага распарадку» для сельскага насельніцтва эканомій: сяляне не мелі права прымаць у сваіх дамах бадзяг, гультаёў, заразных і хворых людзей; павінны былі засцерагаць сваю жывёлу ад заразы; на таргі і кірмашы абавязаныя былі ездзіць толькі ў каралеўскія мястэчкі.

Відавочна, што рэформа А. Тызенгаўза мела шмат падабенстваў з вялікай аграрнай рэформай сярэдзіны XVI ст. – валочнай памерай. Аднолькавай была ідэя перамеру ворыўных земляў, стварэння фальваркаў у якасці гаспадарак па вырошчванню збожжа на продаж, падзел сялян на катэгорыі паводле іх асноўных павіннасцяў. Абедзве рэформы значна павялічылі даходы каралеўскага скарбу. Але пры гэтым павіннасны ціск у выніку рэформы А. Тызенгаўза ўзрос у некалькі разоў. Для параўнання, у час валочнай памеры паншчына вызначалася ў памеры 2 дні ў тыдзень з валокі, а ў другой палове XVIII ст. – 2 дні ў тыдзень з надзелу, г. зн., з ¼ часткі валокі. Таму сяляне ў большасці сваёй не прынялі рэформы. Формы пратэсту былі розныя: ад простых уцёкаў з уладанняў да адкрытых сялянскіх выступленняў, як, напрыклад, у 1768 г. у Берасцейскай эканоміі і ў 1769 г. у Шавельскай (на тэрыторыі сучаснай Літвы).

***«Вялікі мануфактурны план» А. Тызенгаўза.*** У другой палове XVIII ст. Рэч Паспалітая востра адчувала патрэбу ў высакаякаснай прамысловай прадукцыі, неабходнай, у першую чаргу, для арміі і флоту, якой уласная прамысловасць забяспечыць не магла.

Першае на тэрыторыі Беларусі прамысловае прадпрыемства мануфактурнага тыпу – *шкляная гута* – было заснаваная ў 1717 г. ва ўладанні князёў Радзівілаў у Налібоках, а ў 1737 г. другая шкляная мануфактура была пабудаваная Ганнай Радзівіл ва Ўрэччы. На прадпрыемствах выраблялiся аконнае шкло, шкляны посуд, крышталёвыя вырабы, люстэркі і інш. Акрамя таго, Радзівілам належалі шырока вядомыя фабрыка шпалераў у Карэлічах, мануфактуры

габеленаў у Міры і Альбуці, фаянсавая мануфактура ў Свержані, Слуцкая фабрыка шаўковых паясоў, Нясвіжская суконная мануфактура. Усяго на сваіх землях Радзівілы мелі 23 мануфактуры.

Працавалі мануфактуры і ў маёнтках некаторых іншых магнатаў: паперня, суконная і палатняная фабрыкі князя Сапегі ў Ружанах (Слонімскі павет), шкляныя заводы графа Салагуба ў мястэчку Ілля (Менскі павет), гетмана Масальскага ў маёнтку Мыш (Наваградскі павет) і інш. Прыватнаўласніцкія мануфактуры, створаныя магнатамі ў сваіх уладаннях, пераважна абслугоўваліся працай залежных сялян, наёмныя работнікі былі тады рэдкасцю. Гэтая акалічнасць уплывала, натуральна, як на арганізацыю вытворчасці, так і ў пэўнай ступені на вынікі працы прадпрыемстваў.

Але ў другой палове XVIII ст. неабходнасць заснавання мануфактур была ўсвядомлена на дзяржаўным узроўні, і менавіта дзяржаўная ўлада выступіла ў той час ініцыятарам стварэння мануфактур. Адноўленая да сярэдзіны XVIII ст. гаспадарка, а таксама паляпшэнне кан'юктуры на рынках Еўропы стварылі станоўчы падмурак для арганізацыі прамысловай вытворчасці ў краіне, у тым ліку і ў каралеўскіх сталовых эканоміях ВКЛ.

Дзяржаўнае мануфактурнае будаўніцтва ў Рэчы Паспалітай звязваецца з дзейнасцю А. Тызенгаўза, які спецыяльна ездзіў за мяжу, дзе знаёміўся з арганізацыяй і дзейнасцю шэрагу прамысловых прадпрыемстваў, а таксама пасылаў туды сваіх прадстаўнікоў для вывучэння вопыту вядзення прамысловай вытворчасці. Праз стварэнне спецыяльнай падтрымкі прамысловасці сваёй краіны, своеасаблівай сістэмы «пратэкцыянізму», А. Тызенгаўз хацеў за невялікі тэрмін часу арганізаваць у аграрнай краіне развітую прамысловасць.

Цэнтрам гаспадарчых рэформаў стала рэзідэнцыя адміністратара каралеўскіх эканомій у ВКЛ – Гародня і яе прадмесце вёска Гарадніца. На Гарадніцы быў пабудаваны прамыслова-культурны цэнтр, які налічваў 85 будынкаў рознага прызначэння. Яны ўтваралі тры асобныя зоны: адміністрацыйную, вытворчую і навучальную. Заснаванне першых мануфактур – суконнай і палатнянай – адбылося ў 1766–1768 гг., а ў 1777 г. гарадзенскі прамысловы цэнтр ужо налічваў 15 прамысловых прадпрыемстваў. Тут дзейні-

чалі гарбарная мануфактура, мануфактура па вытворчасці гармат і ружжаў, вырабаў з золата, свечак, панчошная, тытунёвая, карэтна-экіпажная, металаапрацоўчая, шаўкаткацкая, карункавая, капялюшная, дывановая, шаўковых паясоў, па вырабу ігральных карт, гузікаў, фарбы і іншых тавараў, а таксама цукраварня і паперня.

«Машыны» (станкі), інструменты, іншае абсталяванне і каля 70% сыравіны для гарадзенскіх мануфактур прывозіліся з-за мяжы. На мясцовых рынках куплялася толькі 25% сыравіны, 5% спецыяльна пастаўляла Гарадзенская эканомія (воўну, дрэва, вугаль і да т. п.). Натуральна, што мануфактурная вытворчасць, акрамя ўсяго іншага, стымулявала развіццё розных галін эканомікі ўнутры краіны, у прыватнасці, авечкагадоўлю, лясную і перапрацоўчую прамысловасць.

Агульная колькасць рабочых на гарадзенскіх каралеўскіх мануфактурах у 1777 г. складала больш за 3 000 чалавек. Асартымент мануфактурных тавараў быў вельмі разнастайны. Шаўковыя тканіны выраблялiся на шаўкаткацкай мануфактуры; на палатнянай – муслін, батыст, палатно для абрусаў і сурвэтак; цвікі, рыдлёўкі, замкі, напільнікі і іншыя вырабы з жалеза выраблялі на металаапрацоўчай мануфактуры; на карункавай і залататкацкай плялі каштоўныя карункі, выраблялі залатыя і срэбраныя ніткі, а таксама некаторыя ювелірныя вырабы; мануфактура пацерак у ліку сваёй прадукцыі мела, акрамя саміх пацерак, яшчэ і шкляны посуд; на карэтна-экіпажнай мануфактуры майстравалі экіпажы «накшталт парыжскіх». Кіравалі мануфактурамі наёмныя кваліфікаваныя майстры з Англіі, Францыі, Швейцарыі, Галандыі, Прусіі і іншых краін.

Мануфактуры ствараліся не толькі ў Гародні: суконна-капялюшная мануфактура была адчыненая ў мястэчку Азёры Гарадзенскага павета, тонкасуконная мануфактура – у мястэчку Ласосна Гарадзенскага павета. У Рэчыцы (пад Берасцем) былі заснаваныя суконная мануфактура, шліфавальня, фабрыка для выпрацоўкі медзі, жалезная гута. Усяго ў каралеўскіх эканоміях ВКЛ было створана больш за 20 мануфактур, з іх 16 – у Гародні. Асноўнымі пакупнікамі мануфактурнай прадукцыі быў каралеўскі двор і войска.

Для заснавання такой колькасці прадпрыемстваў А. Тызенгаўзу патрабаваліся вялікія грошы. Больш за 10,5 млн. польскіх злотых былі накіраваныя ў прамысловасць з даходаў, атрыманых пасля правядзення аграрнай рэформы 1765 г. у эканоміях. Апроч таго, сума ў эквіваленце 10 млн. польскіх злотых на просьбу А. Тызенгаўза была ўзятая Станіславам Аўгустам у Галандскім банку.

У аснове мануфактурнай дзейнасці А. Тызенгаўза ляжалі патрыятычныя памкненні – стварыць у краіне ўласную прамысловасць, тым самым павялічыць даходы дзяржаўнага скарбу і забяспечыць эканамічную незалежнасць ад Еўропы.

Неад'емнай часткай рэформаў, ініцыяваных А. Тызенгаўзам, было ўладкаванне шляхоў зносін па сухапутных дарогах і рэках для актывізацыі ўнутранага і знешняга гандлю. У другой палове XVIII ст. былі пабудаваны дзве новыя значныя дарогі: Пінска-Слонімская і Пінска-Валынская. Для стварэння адзінай воднай сістэмы ў 1767–1784 г. быў пабудаваны канал, які злучыў Нёман з Дняпром праз Шчару, Ясельду і Прыпяць, а пабудаваны ў 1781–1784 г. другі канал злучыў Прыпяць з Заходнім Бугам. Такім чынам, стала магчымым вывозіць водным шляхам прадукцыю з беларускіх земляў у чарнаморскія і балтыйскія порты.

Фінансавую стабільнасць павінна была забяспечыць грашовая рэформа, якая распачалася ў Рэчы Паспалітай у 1766 г. і мела на мэце выключыць з абарачэння старыя манеты і ўвесці новую паўнавартасную валюту. У ходзе рэформы была змененая каціроўка шэрагу грашовых адзінак: быў уведзены *талер* у 8 злотых і *злоты* ў 4 сярэбраных або 30 медных грошаў.

Але пры стварэнні мануфактур А. Тызенгаўзам быў дапушчаны шэраг памылак і пралікаў, што ў канчатковым выніку прывяло да згортвання «вялікага мануфактурнага плана» і адстаўкі А. Тызенгаўза:

- была створаная занадта вялікая колькасць разнастайных прадпрыемстваў, якія будаваліся амаль адначасова і вельмі хутка. Здараліся выпадкі, калі будаўніцтва пачыналася, але так і не сканчвалася з прычыны недахопу фінансаў, і часткова ўзведзеныя пабудовы хутка разбураліся;

- будаўніцтва практычна ўсіх мануфактур вялося на пазычаныя грошы, пры гэтым сродкі крэдыту выдаткоўваліся не толькі на будаўніцтва непасрэдна мануфактур, з якіх потым разлічвалі атрымаць прыбытак для пагашэння крэдыту, але і на стварэнне розных установаў навучальнага і культурнага характару. Толькі ў Гародні былі заснаваныя медыцынская акадэмія, бухгалтарская і будаўнічая школы, кадэцкі корпус, а таксама тэатр, аптэка, батанічны сад, друкарня, у якой выдавалася першая ў ВКЛ «*Газета Гродзеньска*». Усё гэта ў прынцыпе не магло даць прыбытку, а для нармальнага функцыянавання патрабавала далейшых датацый;
- аснову асартыменту мануфактурных тавараў складалі прадметы раскошы, а вузкасць мясцовых рынкаў і суадносіны грамадскіх сіл, калі большасць насельніцтва была бедная, не садзейнічалі хуткаму продажу гэтых рэчаў. Мануфактурная вытворчасць не абапіралася на натуральныя патрэбы, апроч таго, гарадзенскія тавары каштавалі часам даражэй за імпартныя з прычыны высокіх цэнаў на замежную сыравіну і аплату працы іншаземных майстроў. Таму фактычна не магла быць арганізавана дастаткова эфектыўная сістэма збыту мануфактурных вырабаў;
- мануфактуры былі заснаваныя на дармовай працы каралеўскіх сялян. Аднак, не маючы ніякіх стымулаў (ні фінансавых, ні падатковых), сяляне, якія працавалі на гарадзенскіх мануфактурах, абсалютна не былі зацікаўленыя ў выніках сваёй працы, што адмоўна адбівалася на якасці прадукцыі.

Такім чынам мануфактуры не былі ў стане забяспечыць рэнтабельнасць вытворчасці звычайнымі капіталістычнымі сродкамі. Яны маглі існаваць толькі дзякуючы фінансам, якія чэрпаліся з розных крыніц, у першую чаргу, з сельскай гаспадаркі каралеўскіх эканомій, што не спрыяла яе развіццю, а, наадварот, паскарала разбурэнне. Акрамя таго, эканамічныя пераўтварэнні ажыццяўляліся на фоне палітычнага крызісу, які стаў вынікам першага падзелу Рэчы Паспалітай: з адыходам да Расійскай імперыі Усходняй Беларусі была згубленая важная крыніца дзяржаўных даходаў,

страта толькі Магілёўскай эканоміі вызначалася амаль у 1 млн. польскіх злотых.

Рэформы А. Тызенгаўза выразна паказалі, што прымусовая праца ці на ворыве, ці ў мануфактурах пры адсутнасці зацікаўленасці работніка ў яе выніках плёну не прыносіла. Таму адміністрацыя каралеўскіх эканомій у 80-я гады XVIII ст. пайшла на ўвядзенне пэўных ільгот: сялянам было скасавана 25 дзён паншчыны ў год і розных іншых пабораў на суму да 15 злотых з сялянскай гаспадаркі; ліквідаваліся непрыбытковыя фальваркі, а сяляне цэлымі вёскамі пераводзіліся на чынш.

Грунтуючыся на эканамічных ведах і ідэях Асветніцтва аб натуральных правах людзей, некаторыя прыватныя ўласнікі сталі праводзіць у сваіх уладаннях прагрэсіўныя эканамічныя і сацыяльныя рэформы. Сярод іх можна вызначыць *Іаахіма Храптовіча*, маршалка Галоўнага трыбунала ВКЛ, і *Паўла Бжастоўскага*, віленскага каморніка, якія ва ўмовах развіцця таварна-грашовых адносін шукалі аптымальныя шляхі для вядзення ўласнай гаспадаркі і вызвалілі сваіх сялян ад паншчыны і асабістай залежнасці (І. Храптовіч – у маёнтку Шчорсы Наваградскага павета, П. Бжастоўскі – ва ўладанні Паўлава Віленскага павета). Апошні стварыў нават своеасаблівую «сялянскую рэспубліку» з вартай, касай дапамогі, школай для сялянскіх дзяцей і інш.

Такім чынам змяненне ў 80-я гады XVIII ст. накірунку гаспадарчай палітыкі (скарбу і некаторых прыватных уласнікаў) у бок паслаблення падаткова-павіннаснага абкладання, змяншэння паншчыны ці нават поўнага вызвалення ад яе сялян і, такім чынам, надзялення іх пэўнай эканамічнай свабодай з'явілася стымулам для развіцця іх гаспадарчай ініцыятывы і агульнага паляпшэння эканамічнай сітуацыі ў краіне.

***3. Падзелы Рэчы Паспалітай. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі 1794 г.*** У эканамічных рэформах, якія праводзіліся ў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. з мэтай умацавання каралеўскай улады і стабілізацыі жыцця, не былі зацікаўлены, з аднаго боку, кансерватыўныя сілы ўнутры самой краіны. Магнаты

не клапаціліся пра моц сваёй краіны, а, абапіраючыся на сваю кліентэлу, выкарыстоўвалі перыяды бескаралеўя для ўласнага ўзвышэння і ўзбагачэння. Яны выступалі супраць абмежавання «залатых шляхецкіх вольнасцяў», за захаванне шляхецкай дэмакратыі, якая да сярэдзіны XVIII ст. ператварылася па сутнасці ў шляхецкую анархію. У выніку непрацаздольным аказаўся вышэйшы дзяржаўны орган Рэчы Паспалітай – вальны сойм: за сто гадоў (з сярэдзіны XVII да сярэзіны XVIII ст.) з 55 яго пасяджэнняў 48 былі сарваны па прычыне ўжывання права «liberum veto».

З другога боку, суседнія дзяржавы – Расія, Прусія і Аўстрыя – ужо з сярэдзіны XVIII ст. вялі перамовы аб магчымасці падзелу Рэчы Паспалітай. Як падставу для ўмяшальніцтва яны выкарысталі канфесійнае пытанне, заявіўшы аб неабходнасці абароны правоў некатолікоў (*дысідэнтаў*). Сапраўды, праваслаўныя і пратэстанты цярпелі ў Рэчы Паспалітай непрыкрыты ўціск з боку ўладаў: у 1668 г. была прынята пастанова, згодна з якой асобы, якія перайшлі з каталіцтва ў праваслаўе ці уніяцтва, павінны былі карацца выгнаннем, а з 1732 г. пратэстанты і праваслаўныя былі пазбаўленыя права выбірацца на соймы і займаць некаторыя дзяржаўныя пасады. Такая сітуацыя не задавальняла дысідэнтаў, якія ў барацьбе за свае правы разлічвалі на дапамогу праваслаўнай Расіі і пратэстанцкай Прусіі.

***Першы падзел Рэчы Паспалітай.*** У 1765 г. Кацярына II узняла пытанне аб ураўнаванні ў правах праваслаўных і пратэстантаў з каталікамі, аднак сойм 1766 г. адмовіўся задаволіць гэтае патрабаванне. Незадаволеныя дысідэнты ў 1767 г. стварылі дзве канфедэрацыі: *праваслаўную* ў Слуцку пад апякунствам Расіі і *пратэстанцкую* ў Торуні пад патранатам Прусіі. На дапамогу канфедэратам Расія адправіла 40-тысячнае войска. Ва ўмовах прысутнасці ў Варшаве расійскага войска сойм у 1768 г. прыняў рашэнне аб ураўнаванні ў правах дысідэнтаў з каталікамі, а таксама пакінуў некранутымі падставовыя прынцыпы старога палітычнага ладу (выбарнасць караля, liberum veto, права стварэння канфедэрацый і інш.).

Праціўнікі прынятых соймам пастаноў у 1768 г. стварылі Барскую канфедэрацыю (ад назвы г. Бар ва Ўкраіне), якая выступала за цэласнасць і незалежнасць дзяржавы. Да Барскай канфедэрацыі

хутка далучылася значная колькасць беларускай і літоўскай шляхты, а таксама мяшчан і сялянства. Па сутнасці, у краіне пачалася грамадзянская вайна. У рашаючай бітве пад в. Сталавічы (каля Баранавіч) 12 верасня 1771 г. прыхільнікі Барскай канфедэрацыі пацярпелі паражэнне ад рускай арміі пад камандаваннем А. Суворава. 5 жніўня 1772 г. у Пецярбургу манархамі Расіі, Аўстрыі і Прусіі была падпісана тайная канвенцыя аб падзеле часткі тэрыторыі Рэчы Паспалітай, паводле якой Расія анексавала беларускія землі на ўсход ад Дзвіны і Дняпра – 92 тыс. кв. км з насельніцтвам 1 млн. 300 тыс. чалавек.

***Спробы выратавання краіны. Другі падзел Рэчы Паспалітай***. Падзеі 1772 г. выразна паказалі, што захаваць цэласнасць і незалежнасць краіны можна толькі ў выпадку правядзення радыкальных эканамічных і палітычных рэформаў. З 1773 г. усе соймы пачалі праходзіць у рэжыме канфедэрацый, што дазваляла пазбягаць liberum veto і прымаць рашэнні простай большасцю галасоў. Пастановай сойма 1775 г. была створана *Пастаянная рада* – агульны для ВКЛ і Кароны орган выканаўчай улады, у які ўваходзілі 18 дэпутатаў сойма і 18 сенатараў. Гэтая Рада знаходзілася пад кантролем невялікай групы магнатаў і моцным уплывам рускага пасла, а таму не дамагалася забеспячэння сапраўдных інтарэсаў Рэчы Паспалітай. У выніку яна атрымала назву «рада здрады» і ў 1789 г. была ліквідаваная рашэннем Чатырохгадовага сойма (1788–1792).

На гэтым сойме, які пазней быў названы таксама «Вялікім», было прынята шмат пастаноў, мэтай якіх было забеспячэнне незалежнасці Рэчы Паспалітай. Сярод найбольш важных рашэнняў – павелічэнне колькасці войска да 100 тыс. чалавек, стварэнне Ваеннай камісіі, пашырэнне правоў мяшчан, дазвол шляхце займацца рамяством і гандлем, вяртанне магдэбургскага права гарадам, якія былі пазбаўленыя яго ў 1776 г., і інш.

Кульмінацыйнай падзеяй Чатырохгадовага сойма стала прыняцце 3 мая 1791 г. Канстытуцыі («*Урадавай Уставы*») Рэчы Паспалітай. Гэта быў другі ў свеце (пасля Канстытуцыі ЗША 1787 г.) і першы ў Еўропе дакумент, прысвечаны арганізацыі дзяржаўнай улады ў краіне і рэгуляванню правоў яе грамадзян. Паводле Канстытуцыі

Рэч Паспалітая абвяшчалася прававой дзяржавай з вяршэнствам закона і падзелам улады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Да найбольш важных зменаў адносіліся:

– адмена выбарнасці каралёў і ўстанаўленне спадчыннасці трона;
– адмена «залатых шляхецкіх вольнасцяў»;
– змяненне структуры і характару дзейнасці судовых органаў і абвяшчэнне прынцыпу ажыццяўлення правасуддзя толькі судом.

Такім чынам Канстытуцыя 3 мая захоўвала феадальна-прыгонніцкі лад, але адначасова стварала больш выгадныя ўмовы для развіцця мануфактурнай вытворчасці і гандлю, надзяляла больш шырокімі правамі гарадскіх жыхароў. Менш за ўсё зменаў яна ўносіла ў прававое становішча сялян, дэкларатыўна адзначыўшы толькі недапушчальнасць самавольства паноў у адносінах да залежнага сельскага насельніцтва. Разам з тым відавочна, што Канстытуцыя мела прагрэсіўны характар, ператварала дзяржаўныя органы ўлады ў здольныя да рашучых дзеянняў. Але, па сутнасці, гэта была Канстытуцыя польскага народа і польскай дзяржавы, паколькі яна ліквідавала федэратыўны падзел на Карону і Княства, адмяніла паасобныя органы дзяржаўнай улады ВКЛ і Кароны, абвясціла каталіцызм дзяржаўнай рэлігіяй, а Рэч Паспалітую – унітарнай дзяржавай польскага народа. Усё гэта непазбежна вяло да паланізацыі беларускага народа.

Але ў поўнай меры Канстытуцыю не ўдалося ажыццявіць. Рэакцыйныя кансерватыўныя колы магнатаў і шляхты звярнуліся да Кацярыны II з просьбай аб дапамозе ў барацьбе супраць Канстытуцыі. Пад пратэктаратам Кацярыны II вясной 1792 г. была ўтворана Таргавіцкая канфедэрацыя, якая сваім Актам скасавала ўсе пастановы Вялікага сойма. Упэўненасці канфедэратам надало 100-тысячнае расійскае войска і пераход на іх бок Станіслава Аўгуста. Карыстаючыся момантам, на пачатку 1793 г. свае войскі на тэрыторыю Рэчы Паспалітай увяла Прусія. Завяршэннем гэтых падзей стаў другі падзел Рэчы Паспалітай, дамова аб якім была падпісаная 23 студзеня 1793 г. у Пецярбургу. Згодна з ёю, да Расіі адыходзілі беларускія землі па лініі Друя – Пінск.

У складаных умовах у 1793 г. праходзіў «нямы» Гарадзенскі сойм. Прыхільнікі Таргавіцкай канфедэрацыі пры дапамозе расійскага войска, якое абкружыла гарадзенскі каралеўскі палац – месца правядзення сойма, дамагліся недапушчэння на сойм патрыятычных сіл, адмены Канстытуцыі 3 мая і зацвердзілі акт другога падзелу краіны.

***Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.*** Адказам на другі падзел Рэчы Паспалітай і апошняй спробай выратавання краіны з'явілася нацыянальна-вызваленчае паўстанне, якое ўзначаліў ураджэнец Беларусі і герой вайны паўночнаамерыканскіх калоній за незалежнасць (1775–1783) *Тадэвуш Касцюшка*. Акт паўстання быў абвешчаны на галоўнай плошчы Кракава 24 сакавіка 1794 г. Мэтамі паўстання былі аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г., вяртанне Канстытуцыі 3 мая і працяг рэформ, а дэвізам – «*Вольнасць, цэласнасць, незалежнасць*».

У красавіку да паўстанцаў (*інсургентаў*) далучылася патрыятычная беларуска-літоўская шляхта. Паўстаннем на землях ВКЛ кіраваў палкоўнік *Якуб Ясінскі*, вядомы сваімі радыкальнымі поглядамі, прыхільнік Французскай рэвалюцыі і праціўнік прыгону. Удзельнікаў паўстання ў ВКЛ не задавальняла Канстытуцыя 3 мая, паколькі яна ліквідавала дзяржаўнасць ВКЛ. Таму яны пачалі праводзіць палітыку з пэўнымі элементамі незалежнасці ВКЛ ад Кароны, палітыку так званага «ліцвінскага сепаратызму», а саміх інсургентаў сталі называць «*віленскімі якабінцамі*». У выніку створаная Найвышэйшая Літоўская Рада – выканаўчы орган паўстання ў ВКЛ – выступала з больш радыкальнымі дэмакратычнымі патрабаваннямі ў параўнанні з кіраўнікамі паўстання ў Польшчы.

Напачатку паўстанцы мелі поспех, яны ўзялі ўладу ў Вільні, Гародні, Берасці, Наваградку, Слоніме, Лідзе, Пінску, Ваўкавыску і іншых гарадах. Да паўстання далучылася значная частка шляхты на чале з *Міхалам Клеафасам Агінскім*, які напісаў «*Марш паўстанцаў 1794 года*». Актыўна дапамагалі інсургентам і ўзброеныя косамі сяляне (*касінеры*), якія спадзяваліся на адмену прыгоннага права. Гэтаму садзейнічаў выдадзены Т. Касцюшкам 7 мая 1794 г. «*Паланецкі універсал*», у якім сяляне абвяшчаліся асабіста свабоднымі і ім га-

рантавалася апека ўрада, але разам з тым зямля заставалася ва ўласнасці шляхты. Т. Касцюшку палохала рэвалюцыйная праграма Я. Ясінскага. Ён абвінаваціў правадыра «віленскіх якабінцаў» у дзеяннях, накіраваных супраць «уніі братніх народаў», і 4 чэрвеня 1794 г. адхіліў ад кіраўніцтва паўстаннем. У той жа час расійскія ўлады абяцалі амністыю сялянам-паўстанцам і раздачу ім земляў шляхціцаў, якія бралі ўдзел у паўстанні. Акрамя таго, на падаўленне паўстання Кацярына II паслала войска пад кіраўніцтвам А. Суворава. У рашаючай бітве пад Мацяёвіцамі 10 кастрычніка 1794 г. армія інсургентаў была разбітая, а паранены Т. Касцюшка трапіў у палон.

У Пецярбургу 24 кастрычніка 1795 г. была падпісаная канвенцыя аб апошнім падзеле Рэчы Паспалітай, у выніку якога некалі моцная дзяржава перастала існаваць. Усе беларускія землі, апроч Беласточчыны, былі ўключаныя ў склад Расійскай імперыі. 25 лістапада 1795 г. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падпісаў у Гародні акт адмовы ад трона. Пачаўся новы этап змагання за беларускую ідэнтычнасць, за права беларускага народа на дзяржаўную незалежнасць.

***4. Культура Беларусі ў другой палове XVIII ст.*** Другая палова XVIII ст. стала якасна новым этапам у эканамічным і палітычным развіцці ВКЛ і ўсёй Рэчы Паспалітай. У гэты час у краіне пачалі распаўсюджвацца ідэі *Асветніцтва* – антыфеадальнай, буржуазнай ідэалогіі перыяду станаўлення капіталізму, якая прапаведавала прыярытэт асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы. Прыхільнікі Асветніцтва імкнуліся пераадолець недахопы існуючага грамадскага ладу, рэфармаваць яго сацыяльную і дзяржаўную структуры, палітыку, паводзіны людзей *шляхам распаўсюджання навукі, ведаў, асветы, прапаганды ідэй справядлівасці і гуманізму*. Ідэолагам Асветніцтва стаў французскі філосаф *Вальтэр*, які выступаў за адмену саслоўных прывілеяў і надаваў вялікую ролю ў змене грамадства «адукаваным манархам».

Асветніцтва, як грамадска-палітычны і культурны рух, у канцы XVII–XVIII ст. ахапіў усю Еўропу. На тэрыторыю Беларусі ідэі Асветніцтва пачалі пранікаць яшчэ ў канцы XVII ст., але па сапраўднаму эпоха Асветніцтва пачалася тут у другой палове

XVIII ст. У адрозненне ад краін Заходняй Еўропы, дзе праваднікамі ідэй Асветніцтва была буржуазія, на тэрыторыі ВКЛ галоўнай сілай гэтага руху сталі прадстаўнікі адукаванай і дэмакратычнай па сваіх поглядах шляхты.

Распаўсюджанне ідэй Асветніцтва на тэрыторыі Рэчы Паспалітай супала з перыядам глыбокага ўнутры- і знешнепалітычнага крызісу і, разам з тым, з перыядам некаторай стабілізацыі гаспадарчага жыцця. У пэўнай ступені неабходнасць зменаў была ўсвядомлена часткай патрыятычнай эліты Рэчы Паспалітай. Адбылася своеасаблівая «мадэрнізацыя ў розумах», для якой важнае значэнне меў асветніцкі спосаб разумення прагрэсу, у першую чаргу, як аддзялення (ці супрацьпастаўлення) сучаснасці і мінулага. Верагодна, упершыню *традыцыя,* якая была да гэтага часу бясспрэчным аўтарытэтам (*«старыны не рушыць»*), з другой паловы XVIII ст. стала падвяргацца крытыцы, і з уласцівым для тых часоў аптымізмам пачала даказвацца перспектыўнасць увядзення палітычных і эканамічных навацый для паляпшэння становішча грамадства і дзяржавы. У гэты час выходзіла шмат кніг, у якіх прапагандаваўся еўрапейскі вопыт гаспадарання ў вёсцы і ў горадзе. Аўтары эканамічнай літаратуры заклікалі шляхту не баяцца новаўвядзенняў, выкарыстоўваць замежныя напрацоўкі, але не забываць свае традыцыі (здабыткі) і спалучаць іх з рэаліямі грамадскага і гаспадарчага развіцця.

Пад уплывам Асветніцтва на тэрыторыі Беларусі пачалі распаўсюджвацца ліберальныя ідэі французскіх *фізіякратаў.* Фізіякраты лічылі, што зямля і земляробства з’яўляюцца асноўнымі крыніцамі багацця, а сельскагаспадарчая праца з’яўляецца адзінай вытворчай працай. Адным з першых, хто пачаў у Беларусі крытыку прыгоннага права і выступіў супраць жорсткага абыходжання ўласнікаў з сялянамі, быў прыхільнік фізіякратаў *Міхал Карповіч.*

Некаторыя землеўладальнікі перабудоўвалі парадак гаспадарання ў сваіх маёнтках з мэтай адмены ў іх прыгону. Так, граф *Іахім Храптовіч* у маёнтках Шчорсы (Навагрудскі павет) і Вішнева (Ашмянскі павет) адмяніў паншчыну і перавёў сялян на грашовую рэнту.

На землях Рэчы Паспалітай пашырылася свецкая адукацыя. Пад кіраўніцтвам *Станіслава Канарскага* была праведзеная школь-

ная рэформа. У 1773 г. для кіраўніцтва народнай асветай у Рэчы Паспалітай была створаная спецыяльная ўстанова – *Адукацыйная камісія*, якая зрабіла спробу вызваліць адукацыю ад прамога ўплыву каталіцкай царквы. Адукацыйная камісія зацвердзіла адзіны для ўсіх школ краіны статут навучання. Ён прадугледжваў стварэнне сістэмы адукацыі з трох тыпаў школ: пачатковых (*парафіяльных*), сярэдніх *(акруговых і падакруговых)* і вышэйшых (*Галоўная школа ВКЛ – Віленскі ўніверсітэт)*. Забяспечвалася *ўсесаслоўнасць навучання*, калі ў школах вучыліся дзеці як прывілеяваных, так і непрывілеяваных саслоўяў. За 20 гадоў дзейнасці Адукацыйнай камісіі на тэрыторыі Беларусі было заснавана 20 школ сярэдняй ступені навучання ў такіх гарадах, як Гародня, Пінск, Мазыр, Бабруйск і інш.

Новай з’явай стала стварэнне ў Беларусі першых прафесійных навучальных устаноў. Дзякуючы намаганням А. Тызенгаўза ў Гародні і Паставах з 1770-х гадоў дзейнічалі медыцынская, акушэрская, ветэрынарная, чарцёжная і рысавальная школы. У Гародні была адкрыта медыцынская школа, якой кіраваў француз *Жан Эмануэль Жылібер* (1741–1814 гг.). У школе дзейнічалі шпіталь, анатамічны кабінет, заалагічны сад, музей, бібліятэка.

У архітэктуры ў канцы XVIII ст. на змену барока канчаткова прыходзіць *класіцызм.* У стылі класіцызму было створана або перабудавана шмат палаца-паркавых ансамбляў (Гомель, Ружаны, Слонім, Дзярэчын і інш.).

У другой палове XVIII ст. назіраецца росквіт прыгоннага тэатра на тэрыторыі Беларусі. Адным з найбольш вядомых стаў *Нясвіжскі тэатр* Радзівілаў, пры якім дзейнічала балетная, музычная і тэатральная школы. Знакамітым быў і *Слонімскі тэатр* Міхала Казіміра Агінскага (1730–1800 гг.).

А. Тызенгаўз стварыў *тэатр у Гародні.* У ім працавалі замежныя артысты, балетмайстры, музыканты, спевакі і харэографы. Для падрыхтоўкі ўласных артыстаў з ліку прыгонных сялян была адкрыта тэатральная школа. Праграма навучання ў ёй была вельмі разнастайная і ўключала ў сябе танец, спевы, нотную грамату, тэорыю музыкі і кампазіцыю. Выкладаліся і агульнаадукацыйныя прадметы – пісьмо, арыфметыка, французская і італьянская

мовы, а таксама рукадзелле. Выхаванцы гэтай школы артысты балета Е. Валінскі, Д. Пякарская-Сітанская, М. Рымінскі пазней праславіліся ў польскім тэатры.

Пры дварах многіх магнатаў існавалі ўласныя *аркестры і капелы,* у якіх выконвалі ў тым ліку і творы мясцовых кампазітараў *Міхала Клеафаса Агінскага, Яна Давіда Голанда, Мацея Радзівіла* і інш.

Такім чынам, культура Беларусі ў другой палове XVIII ст. развівалася нягледзячы на палітычны заняпад і праблемы, якія існавалі ў эканоміцы краіны і асабліва ў знешнепалітычным жыцці.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ

***Адукацыйная камісія*** – установа па кіраванню народнай асветай у Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

***Анексія*** – гвалтоўнае далучэнне, захоп.

***Асветніцтва*** – антыфеадальная ідэалогія XVIII ст., якая прапаведавала прыярытэт адукацыі, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы.

***Ачыншаванне*** – перавод сялян з адпрацовачнай рэнты на грашовую.

***Дысідэнты*** – агульная назва ўсіх некаталікоў у Рэчы Паспалітай.

***Загоны*** – назва казацкіх атрадаў у войску Б. Хмяльніцкага.

***Канвакацыйны сойм*** – сойм у Рэчы Паспалітай, які вызначаў месца і час выбараў караля.

***Каранацыйны сойм*** – сойм у Рэчы Паспалітай, на якім адбываліся выбары караля.

***Люстрацыя*** – перыядычны перапіс дзяржаўнай маёмасці з мэтай вызначэння яе даходнасці.

***Мануфактура*** – прамысловае прадпрыемства, заснаванае на ўжыванні падзелу працы і ручной рамеснай тэхнікі.

***Слабада*** – поўнае або частковае вызваленне сялян ад павіннасцяў на тэрмін ад 5 да 15 гадоў.

***Элекцыйны сойм*** – сойм у Рэчы Паспалітай, на якім кароль прысягаў выконваць умовы, паводле якіх адбылося яго выбранне.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Дайце характарыстыку ўнутрыпалітычных сілаў Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

2. Якія ўмовы спрыялі распаўсюджванню ідэй Асветніцтва ў Рэчы Паспалітай?

3. Вызначце і прааналізуйце прычыны падзелаў Рэчы Паспалітай. Ці можна было, на Ваш погляд, прадухіліць падзел дзяржавы?

# І. Беларускія землі ў старажытныя часы.

| | |
|---|---|
| каля 2,6 млн. гадоў таму газад. | – выдзяленне чалавека з жывёльнага свету, з’яўленне першых людзей на Зямлі (у Афрыцы і Паўднёвай Азіі). |
| каля 600 тыс. гадоў таму назад. | – рассяленне людзей на тэрыторыі Еўропы. |
| каля 100–40 тыс. гадоў таму назад. | – адыход буйнога валдайскага абледзянення, *з’яўленне першых людзей на тэрыторыі Беларусі*; стаянкі першабытных людзей каля вёсак *Абідавічы Быхаўскага раёна, Свяцілавічы Веткаўскага раёна і Падлужжа Чачэрскага раёна.* |
| 100–2 тыс. гадоў да н. э. | – ***каменны век*** (палеаліт, мезаліт, неаліт) – першабытная эпоха. Галоўныя заняткі людзей: паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва (*прысвойваючая гаспадарк*а). Матрыярхат. Ранняя родавая абшчына. |
| 100–11 тыс. гадоў да н. э. | – ***палеаліт*** (ранні каменны век) – першыя спробы пранікнення чалавека неандэртальскага тыпу (ад даліны Неандэр-таль у Германіі, дзе ў 1856 г. былі знойдзены рэшткі шкілета выкапнёвага чалавека) на тэрыторыю Беларусі. Сведчанне – *крамянё-выя вырабы* архаічнага тыпу на стаянках каля вёсак *Абідавічы Быхаўскага раёна, Клеявічы Касцюковіцкага раёна, Падлужжа Чачэрскага раёна, Свяцілавічы Веткаўскага раёна.* |
| 40–30 тыс. гадоў таму назад. | – засяленне тэрыторыі Беларусі людзьмі сучаснага антрапалагічнага тыпу – *краманьён-цамі* (назва ад грота Кра-Маньён у Францыі, дзе ў 1868 г. знайшлі рэшткі людзей такога ты-пу). Стаянкі першабытнага чалавека каля вёс-кі *Юравічы Калінкавіцкага раёна* (каля 26 тыс. гадоў таму назад) і каля вёскі *Бердыж Чачэр-скага раёна* (23–24 тыс. гадоў таму назад). |

| | |
|---|---|
| 40 тыс. гадоў да н. э. – 3–2 тыс. гадоў да н. э. | – *даіндаеўрапейскі перыяд гісторыі Беларусі.* |
| прыблізна 35 тыс. гадоў таму назад. | – утварыліся парныя саюзы, якія складалі раннюю родавую абшчыну. |
| 15 тыс. гадоў таму назад. | – адступленне з тэрыторыі Беларусі апошняга ледавіка. |
| 12–10 тыс гадоў таму назад. | – канчатковае засяленне тэрыторыі Беларусі першабытным чалавекам. |
| 12–10 тыс. гадоў таму назад. | – у фінальнапалеалітычны час (пасля адступлення ледавіка) на тэрыторыі Беларусі існавалі розныя культурныя супольнасці *(археалагічныя культуры)*: *грэнская* (культура позняга палеаліту і ранняга мезаліту); *свідэрская*; *арэнсбургская і лінгбійская*. |
| 12–8 тыс. гадоў да н. э. | – *грэнская* археалагічная культура (Падняпроўе). |
| 10–8 тыс. гадоў да н. э. | – *арэнсбургская і лінгбійская* археалагічныя культуры (поўнач Беларусі). |
| сярэдзіна 9 – пачатак 8 тыс. да н. э. | – *свідэрская* археалагічная культура (паўднёвы захад і захад Беларусі). |
| 9–5 тыс. гадоў да н. э. | – ***мезаліт*** (сярэдні каменны век). Поўнае адступленне ледавіка, змяненне клімату і знікненне мамантаў. Вынаходніцтва лука і стрэлаў. Усталяванне аселага ладу жыцця. *Суцэльнае засяленне чалавекам тэрыторыі Беларусі.* Росквіт прысвойваючай гаспадаркі – палявання, рыбалоўства і збіральніцтва. Археалагічныя культуры мезаліту: *грэнская*, *днепра-дзяснінская ці сожская*, *кундская*, *нёманская мезалітычная.* |
| 8–5 тыс. гадоў да н. э. | – *грэнская* археалагічная культура (Падняпроўе) – засталася з палеаліту. |
| 6–5 тыс. гадоў да н. э. | – *днепра-дзяснінская ці сожская* археалагічная культура (беларускае Падняпроўе і Усходняе Палессе) – (на яе аснове ўзнікла *верхнедняпроўская* археалагічная культура ў неаліце). |

| | |
|---|---|
| 8–5 тыс. гадоў да н. э. | – *кундская* археалагічная культура (поўнач Беларусі) ад стаянкі Кунда ў Эстоніі (лічыцца постсвідэрскай). |
| 8–5 тыс. гадоў да н. э. | – *нёманская мезалітычная* археалагічная культура (Літва, паўночны захад Беларусі). |
| 7–8 тыс. гадоў да н. э. | – з'яўленне на тэрыторыі Беларусі першага сталага (*аўтахтоннага*) насельніцтва. |
| канец 5–3 тыс. гадоў да н. э. | – ***неаліт*** (новы каменны век). Панаванне натуральнай гаспадаркі і разам з тым *пачатак пераходу да вытворчай гаспадаркі* – земляробства і жывёлагадоўлі. Шахтавая здабыча крэмню (каля пасёлка *Краснасельскі Ваўкавыскага раёна*). З'яўленне *керамічнай вытворчасці* (без ганчарнага круга) і *ткацтва*. Група неалітычных помнікаў каля вёскі *Камень Пінскага раёна.*<br>Археалагічныя культуры неаліту: *днепра-данецкая, верхнедняпроўская, нёманская, нарвенская, дзяснінская, тыповай грабеньчата-ямкавай керамікі, лейкападобных кубкаў, шарападобных амфар.* |
| канец 5-га – пачатак 2-га тысячагоддзя да н. э. | – *днепра-данецкая* археалагічная культура (Усходняе Палессе). |
| канец 5-га – пачатак 3-га тысячагоддзя да н. э. | – *верхнедняпроўская* археалагічная культура (Падняпроўе). |
| 4–3 тысячагоддзе да н. э. | – *нёманская* археалагічная культура (Панямонне і басейн Верхняй Прыпяці). |
| 4–3 тысячагоддзе да н. э. | – *нарвенская* археалагічная культура (басейн Віліі). |
| другая палова 4-га – 3 тысячагоддзе да н. э. | – *дзяснінская* археалагічная культура (басейн Дзясны і ўсход Пасожжа). |
| другая чвэрць – канец 3-га тысячагоддзя да н. э. | – археалагічная культура *тыповай грабеньчата-ямкавай керамікі* (раён Нарачы, Лепеля, Пастаў, Паазер'я). Прадстаўнікі гэтай культуры прыкладна ў II чвэрці 3-га тысячагоддзя да н. э. прыйшлі з поўначы і пацяснулі нарвенцаў – сярэдзіна-канец 3-га тысячагоддзя да н. э. |

| | |
|---|---|
| сярэдзіна 4-га – трэцяя чвэрць 3-га тысячагоддзя да н. э. | – археалагічная культура *лейкападобных кубкаў* (Заходняя Беларусь). |
| 3-е тысячагоддзе да н. э. | – археалагічная культура *шарападобных амфар* (сярэдняе Паросcе). |
| 3–2 тыс. гадоў да н. э. – IV–V ст. н. э. | – *балцкі этап* гісторыі Беларусі (засяленне тэрыторыі Беларусі балцкімі плямёнамі). |
| пачатак II тысячагоддзя да н. э. – VIII ст. да н. э. | – ***бронзавы век*** (век бронзы і медзі).<br>*Прыход на тэрыторыю Беларусі плямён індаеўрапейцаў. Распаўсюджанне жывёлагадоўлі і матычнага земляробства.* З'яўленне медных і бронзавых прыладаў працы, зброі і ўпрыгожанняў, якія вельмі дорага каштавалі. На тэрыторыі Беларусі большасць прыладаў працы працягвала выраблядца з крэменю. Пачатак пераходу да патрыярхату. Утварэнне вялікіх патрыярхальных сем'яў і пераход да суседска-родавай абшчыны. Засяленне тэрыторыі Беларусі індаеўрапейцамі.<br>Археалагічныя культуры бронзавага века: *сярэднедняпроўская*, *шнуравой керамікі*, *прыбалтыйская (жуцаўская)*, *паўночнабеларуская*, *тшцінецкая і сосненская*, *лужыцкая*. |
| другая палова 3-га – першая палова 2-га тысячагоддзя да н. э. | – *сярэднедняпроўская* археалагічная культура (Верхняе і Сярэдняе Падняпроўе). |
| пачатак – сярэдзіна 2-га тысячагоддзя да н. э. | – археалагічная культура *шнуравой керамікі (ці культура баявых сякер)* (беларускае Палессе). Назва індаеўрапейскіх плямён, якія прыйшлі на тэрыторыю Беларусі. Характэрныя прылады – каменныя свідраваныя сякеры і гліняныя гаршчкі, аздобленыя адбіткам шнура. Прадстаўнікі гэтай культуры карысталіся бронзавымі прыладамі працы і ўмелі іх вырабляць. |

| | |
|---|---|
| першая палова 2-га тысячагоддзя да н. э. | – *прыбалтыйская (жуцаўская)* археалагічная культура (паўночны захад Беларусі і паўднёвы ўсход Прыбалтыкі). |
| канец 3-га – першая палова 2-га тысячагоддзя да н. э. | – *паўночнабеларуская* археалагічная культура (Віцебшчына, поўнач Міншчыны і поўдзень Пскоўшчыны). |
| XV–XI стст. да н. э. | – *тшцінецкая і сосненская* археалагічныя культуры (поўдзень Беларусі). |
| XV–XIV стст. да н. э. | *лужыцкая* археалагічная культура (паўднёвы захад Беларусі). |
| II–VII стст. | – распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі *салярнай арнаментыкі* (малюнкаў сонца). |
| сярэдзіна II тысячагоддзя да н. э. | – распаўсюджанне пахавальнага абраду трупаспалення, звязанага з абагаўленнем Сонца і агню як жыватворчых сіл. |
| VII ст. да н. э. – V ст. н. э. | – ***жалезны век*** у Беларусі. Людзі навучыліся здабываць жалеза з балотнай руды пры дапамозе *печаў-домніц* і вырабляць з яго прылады працы і зброю. Галоўны занятак насельніцтва – падсечна-агнявое (ляднае) земляробства. Адбываецца распад роду на асобныя сем'і і пераход да патрыярхату. Археалагічныя культуры жалезнага века: *мілаградская*, *паморская*, *штрыхаванай керамікі*, *днепра-дзвінская*, *зарубінецкая*, *вельбарская*, *кіеўская (познезарубінецкая)*. |
| VII–III стст. да н. э. | – *мілаградская* археалагічная культура (Паўднёвая і часткова Цэнтральная Беларусь). Назва ад вёскі Мілаград Рэчыцкага раёна. Выкарыстоўвалі жалезныя прылады працы. Жылі ў зямлянках і паўзямлянках. Некаторыя вучоныя звязваюць прадстаўнікоў гэтай культуры з неўрамі, пра якіх пісаў Герадот. Магчыма, што гэта былі старажытныя славяне. |
| VII–II ст. да н. э. | – *паморская* археалагічная культура (паўднёвы захад Беларусі). |

| | |
|---|---|
| VII–VI ст. да н. э. – IV ст. н. э. | – археалагічная культура *штрыхаванай керамікі* (Паўночна-Заходняя і Сярэдняя Беларусь). Носьбіты гэтай культуры выраблялі гліняны посуд пакрыты хаатычнай штрыхоўкай, што была зроблена пучком травы ці саломы па яшчэ неабпаленай гліне. |
| VIII ст. да н. э. – V ст. н. э. | – *днепра-дзвінская* культура (паўночны ўсход Беларусі) – археалагічная культура ўсходнебалцкіх плямён. Галоўныя заняткі насельніцтва: жывёлагадоўля, паляванне і рыбалоўства. Жылі ва ўмацаваных пасёлках-гарадзішчах. |
| III ст. да н. э. – II ст. н. э. | – *зарубінецкая* археалагічная культура (поўдзень Беларусі). Плямёны гэтай культуры – продкі славянскага насельніцтва Падняпроўя. Рассяляліся на гарадзішчах, пабудаваных у папярэдні час прадстаўнікамі мілаградскай культуры. Галоўныя заняткі насельніцтва: земляробства, жывёлагадоўля і паляванне. Назва – ад могільніка каля *вёскі Зарубінцы на Кіеўшчыне.* |
| II–IV стст. н. э. | – *вельбарская* археалагічная культура (паўднёвы захад Беларусі). Яе прадстаўнікамі былі германскія плямёны готаў (гунаў, гітонаў), якія прыйшлі на тэрыторыю беларускага Пабужжа і Верхняй Прыпяці. Назва – ад могільніка *Вельбарк у Ніжнім Павісленні.* |
| II–V стст. н. э. | – *кіеўская (познезарубінецкая)* археалагічная культура (паўднёвы ўсход Беларусі). Паселішчы рымскага часу. Людзі жылі на *гарадзішчах.* Узніклі *саюзы плямён.* Насельніцтва мела сувязі з паўночнымі правінцыямі Рымскай імперыі. Змяшанае балта-славянскае насельніцтва. Некаторыя даследчыкі лічаць насельнікаў познезарубінецкай культуры старажытнаславянскімі плямёнамі. Даследавана паселішча каля *вёскі Адаменка Быхаўскага раёна*, грунтовы могільнік каля *вёскі Тайманава Быхаўскага раёна.* |

| | |
|---|---|
| I–II стст. н. э. | – самая старажытная назва славян – «*венеды*» была дадзена ім рымскімі аўтарамі I – II ст. н. э. (Тацыт). |

## II. Беларускія землі ў IV – IX стст.

| | |
|---|---|
| IV–VII стст. н. э. | – эпоха Вялікага перасялення народаў. |
| IV–XII стст. н. э. | – археалагічная культура *ўсходнелітоўскіх курганоў* (паўночны захад Беларусі). |
| V–XV стст. н. э. | – Сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі. |
| V–X стст. н. э. | – Ранняе Сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі. Археалагічныя культуры Ранняга Сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі: *пражская (раннеславянская)*, *усходнелітоўскіх курганоў*, *каменных курганоў*, *банцараўская і калочынская*, *тушамлінская*. |
| V–VII стст. н. э. | – *пражская (раннеславянская)* археалагічная культура (паўднёвы захад Беларусі). |
| V–XII стст. н. э. | – археалагічная культура *каменных курганоў* (Верхняе і Сярэдняе Панямонне). |
| V–VIII стст. н. э. | – *банцараўская* археалагічная культура (цэнтральная і паўночная частка тэрыторыі Беларусі). Насельніцтва мела прыкметы культуры як славян, так і балтаў. Жылі на неўмацаваных паселішчах. Жытлы з печамі-каменкамі. Назва – ад гарадзішча каля вёскі *Банцараўшчына* пад Мінскам, на беразе ракі Свіслач каля вадасховішча Дразды. Вядомы *доўгія курганы* з пахаваннямі перыяду існавання банцараўскай культуры па абрадзе трупаспалення на Віцебшчыне, якія належалі *крывічам-палачанам*, гарадзішча каля вёскі Нікадзімава Горацкага раёна. |
| V–VIII стст. н. э. | – *калочынская* археалагічная культура (поўдзень Беларусі). Большасць даследчыкаў лічаць гэтую культуру балцкай, якая знаходзілася пад моцным уплывам славян. Назва – ад паселішча каля *вёскі Калочын* Рэчыцкага раёна. |

| | |
|---|---|
| IV–VIII стст. н. э. | – *тушамлінская* археалагічная культура (Смаленскае Падняпроўе і Падзвінне і ўсход Беларусі). |
| VI ст. н. э. | – у гэты час гісторыкі называлі славянскія плямёны *антамі і склавінамі*. |
| VI–VII стст. н. э. | – у VI–VII стст. славяне падзяліліся на тры вялікія групы: *заходніх* (продкі палякаў, чэхаў і славакаў); *паўднёвых* (продкі балгар, сербаў, харватаў, славенцаў, македонцаў, чарнагорцаў); *усходніх* (продкі беларусаў, украінцаў і рускіх). |
| VI–VII стст. н. э. | – *пражская* археалагічная культура, належала раннім славянам. Помнікі гэтай культуры размешчаны на тэрыторыі Еўропы, абмежаванай з усходу р. Дняпром, з захаду р. Эльбай, з поўдня р. Дунаем і з поўначы ракой Прыпяццю. Першыя даследаванні помнікаў гэтай культуры праведзены каля г. Прага, Чэхія. У Беларусі рэшткі такога славянскага паселішча выяўлены каля г. *Петрыкава*, каля вёскі *Хатомель Столінскага раёна.* |
| VII–VIII стст. н. э. | – масавае рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі. |

## III. Беларускія землі ў канцы IX – сярэдзіне XIII ст.

| | |
|---|---|
| 859 г. | – першае ўпамінанне ў «Аповесці мінулых часоў» пра крывічоў. Яны плацілі даніну варагам. |
| 862 г. | – першае ўпамінанне ў «Аповесці мінулых часоў» пра г. Полацк. |
| 860-я гг. | – стварэнне балгарскім асветнікам Кірылам Салунскім алфавіта, які быў пакладзены і ў аснову беларускай азбукі. |
| 862–882 гг. | – княжанне ў г. Кіеве Аскольда і Дзіра – адных з першых вядомых кіеўскіх князёў. Абодва забіты ў 882 г. наўгародскім князем Алегам, які захапіў г. Кіеў. Полацкае княства апынулася ў залежнасці ад Алега. |

| | |
|---|---|
| 865 (867) г. | – кіеўскія князі Аскольд і Дзір здзейснілі паход на г. Полацк і, паводле звестак В. М. Тацішчава, «воеваша полочан много зла сотвориша». |
| да 879 г. | – княжанне Рурыка, родапачынальніка скандынаўскай дынастыі *Рурыкавічаў*; у 862 г. – князь Ладагі, у 864 г. запрошаны ў г. Ноўгарад. Пасля яго смерці стаў княжыць Алег. |
| 882–912 гг. | – княжанне ў г. Кіеве князя Алега. |
| 885 г. | – першае ўпамінанне ў «Аповесці мінулых часоў» пра радзімічаў (паход князя Алега на радзімічаў). |
| 907 г. | – удзел крывічоў і радзімічаў у паходзе кіеўскага князя Алега на г. Царград (Канстанцінопаль). |
| 912–945 гг. | – княжанне кіеўскага князя Ігара (сын князя Рурыка, памёр бяздзетным, забілі драўляне, калі спрабаваў сабраць дадатковую даніну). |
| 944 г. | – удзел крывічоў у паходзе кіеўскага князя Ігара супраць Візантыі. |
| 945–964 гг. | – гады княжання кіеўскай княгіні Вольгі – (жонкі князя Ігара?). |
| 960-я – 980 гг. | – княжанне ў г. Полацку князя Рагвалода. |
| 964–972 гг. | – княжанне ў г. Кіеве Святаслава Ігаравіча, які быў двойчы жанаты: княжна Прадслава нарадзіла яму сына Яраполка, а паланянка Малуша (дачка драўлянскага князя Мала) – сыноў Алега і Уладзіміра. |
| 970–980 гг. | – княжанне ў г. Кіеве Яраполка (сына кіеўскага князя Святаслава Ігаравіча і княжны Прадславы). |
| 974 г. | – па сведчанні Віцебскага летапісу Панцырнага і Аверкі XVIII ст. у гэтым годзе г. Віцебск быў заснаваны княгіняй Вольгай; першае ўпамінанне горада – 1021 г. у Сафійскім 1-м летапісе. |

| | |
|---|---|
| 980–1015 гг. | – княжанне ў г. Кіеве князя Уладзіміра Свястаславіча, сына кіеўскага князя Святаслава Ігаравіча ад Малушы (паланянкі), брата князя Алега. Княжыў у г. Ноўгарадзе ў 970–977 і 979–980 гг., у 980 г. захапіў г. Полацк, з 980 г. у г. Кіеве. Уладзімір меў 18 дзяцей, з іх Ізяслаў Уладзіміравіч – сын Уладзіміра і полацкай князёўны Рагнеды – заснавальнік беларускай дынастыі Ізяславічаў (працяг дынастыі Рагвалодавічаў). |
| 980 г. | – згадка ў летапісе пра полацкага князя Рагвалода і яго дачку Рагнеду, захоп г. Полацка ноўгарадскім князем Уладзімірам Святаславічам і забранне ім князёўны Рагнеды за жонку. |
| 980 г. | – першае ўпамінанне ў «Аповесці мінулых часоў» пра г. Тураў. |
| 983 г. | – першае ўпамінанне ў летапісах пра яцвягаў – былі пераможаны ў выніку ваеннага паходу кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. |
| 984 г. | – паход кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча на радзімічаў. |
| 988 г. | – хрышчэнне Русі. Кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч прымусіў кіеўлян хрысціцца і прыняць хрысціянскую веру. |
| 988–1015 гг. | – княжанне ў г. Тураве Святаполка (у 1015–1019 гг. – кіеўскі князь Святаполк «Акаянны»). |
| пасля 990 – 1001 гг. | – княжанне ў Полацкім княстве Ізяслава, сына кіеўскага князя Уладзімера і полацкай князёўны Рагнеды. |
| 992 г. | – утварэнне епархіі ў г. Полацку. Першы вядомы полацкі епіскап Міна. |
| канец X ст. | – самы старажытны помнік пісьменства на тэрыторыі Усходняй Еўропы – надпіс на пячатцы полацкага князя Ізяслава Уладзіміравіча. Знойдзена ў 1954 г. у г. Ноўгарадзе. |

| | |
|---|---|
| XI ст. | – напісанне «Тураўскага евангелля», самай ранняй рукапіснай царкоўнай кнігі ў Беларусі, што захавалася. |
| 1000 г. | – княгіня Рагнеда, жонка кіеўскага князя Уладзімера і маці полацкага князя Ізяслава была перад смерцю пастрыжана ў манашкі пад імем Анастасія. |
| 1003–1043 гг. | – княжанне ў г. Полацку Брачыслава Ізяславіча. |
| 1005 г. | – утварэнне епархіі ў г. Тураве. Першы вядомы тураўскі епіскап Фама. |
| 1009 г. | – першае ўпамінанне назвы «Літва» ў запісах невялікага нямецкага горада Кведлінбурга. |
| 1015–1019 гг. | – княжанне ў г. Кіеве Святаполка «Акаяннага» (у 988–1015 гг. княжыў у г. Тураве). |
| 1019 г. | – першае ўпамінанне ў «Аповесці мінулых часоў» пра г. Берасце (Брэст) (з 1199 г. – у складзе Галіцка-Валынскага княства). |
| 1019–1054 гг. | – княжанне ў г. Кіеве Яраслава Мудрага. |
| 1021 г. | – полацкі князь Брачыслаў напаў на г. Ноўгарад. Бітва на рацэ Судаміры з кіеўскім князем Яраславам. |
| 1021 г | – першае ўпамінанне г. Віцебска ў Сафійскім 1-м летапісе. Датай узнікнення горада лічыцца 974 г. па легендзе Віцебскага летапісу Панцырнага і Аверкі XVIII ст. |
| 1030–1093 гг. | – княжанне ў г. Кіеве Усевалада Яраслававіча, сына Яраслава Мудрага. |
| 1040 г. | – паведамленне пра Літву ў «Аповесці мінулых часоў». |
| 1044 г. | – першае ўпамінанне пра г. Навагародак (Навагрудак) у пісьмовых крыніцах у сувязі з паходам Яраслава Мудрага на Літву. |
| 1044–1101 гг. | – княжанне Усяслава Брачыславіча (Чарадзея) ў г. Полацку. |
| 1054 г. | – падзел хрысціянства як сусветнай рэлігіі на дзве галіны – заходнюю (каталіцызм) і ўсходнюю (праваслаўе). |

| | |
|---|---|
| 1059 г. | – першае ўпамінанне пра г. Копысь («Ніканаўскі летапіс»). |
| 50-я гады XI ст. | – будаўніцтва ў г. Полацку Сафійскага сабора (завершаны да 1066 г.). |
| 1065 г. | – паход князя Усяслава Чарадзея на г. Пскоў. |
| 1065 г. | – першае ўпамінанне пра г. Браслаў («летапіс Быхаўца»). |
| 3 сакавіка 1067 г. | – бітва на р. Нямізе паміж войскам кіеўскіх князёў Яраславічаў і полацкага князя Усяслава, першае ўпамінанне пра г. Менск (Мінск) ў «Аповесці мінулых часоў». |
| 1067 г. | – першае ўпамінанне ў «Аповесці мінулых часоў» пра г. Оршу. |
| 15 верасня 1068 г. | – паўстанне ў г. Кіеве, выбранне паўстаўшымі гараджанамі князя Усяслава Брачыславіча (Чарадзея) кіеўскім князем. |
| 1069–1069 гг. | – княжанне ў г. Кіеве полацкага князя Усяслава Брачыславіча (Чарадзея). |
| 1077, 1078 гг. | – паходы князя Уладзіміра Манамаха разам з бацькам, кіеўскім князем Усеваладам Яраслававічам, на г. Полацк. |
| 1078 г. | – першае ўпамінанне пра гарады Друцк і Лагойск («Павучанне Уладзіміра Манамаха»). |
| 1084 г. | – князь Уладзімір Манамах па даручэнні свайго бацькі кіеўскага князя Усевалада Яраслававіча захапіў і разбурыў г. Менск. |
| 1087–1113 гг. | – княжанне ў г Тураве князя Святаполка Ізяславіча. |
| 1097 г. | – Любецкі з’езд князёў, юрыдычнае замацаванне пачатку падзела Рускай зямлі на асобныя княствы. Усяслаў Чарадзей на з’ездзе не прысутнічаў, што сведчыць пра тое, што Полацкае княства ў гэты час ужо было незалежным ад Кіева. |
| 1097 г. | – першае ўпамінанне ў «Аповесці мінулых часоў» пра г. Пінск. |

| | |
|---|---|
| 1101 г. | – смерць Усяслава Брачыславіча (Чарадзея), пачатак феадальнай раздробленасці на беларускіх землях. З Полацкага княства ў самастойныя ўдзелы вылучыліся з прылеглымі тэрыторыямі гарады Менск, Віцебск, Друцк, Ізяслаўль (Заслаўе), Лагожск (Лагойск). |
| 1101–1119 гг. | – княжанне Глеба Усяславіча ў г. Менску. |
| каля 1104 – 23 мая 1167 гг. | – гады жыцця прападобнай Ефрасінні Полацкай (полацкай князёўны Прадславы), асветніцы і святой заступніцы беларускай зямлі. Памерла ў час свайго паломніцтва ў г. Іерусалім. |
| 1105 г. | – упамінанне пра першага вядомага полацкага епіскапа Міну. |
| 1113–1125 гг. | – княжанне ў Кіеве Уладзіміра Манамаха (сына Усевалада, унука Яраслава Мудрага). Ад Уладзіміра Манамаха адышло некалькі адгалінаванняў: князі суздальскія, смаленскія, валынскія, галіцкія. |
| 1116 г. | – менскі князь Глеб Усяславіч разрабаваў частку Тураўскага княства і спаліў г. Слуцк – першае ўпамінанне пра горад у «Аповесці мінулых часоў». |
| 1116 г. | – паход кіеўскага князя Мсціслава на г. Менск. |
| 1117 г. | – паходы менскага князя Глеба Усяславіча на Смаленскую і Ноўгарадскую землі. |
| 1119 г. | – паход кіеўскага князя Мсціслава на г. Менск. |
| 1125–1132 гг. | – княжанне ў г. Кіеве Мсціслава Уладзіміравіча. У 1116 і 1119 гг. здзейсніў паходы на г. Менск, у 1127 г. – паход на Полацкую зямлю. Пасля яго смерці Кіеўская Русь распалася на Кіеўскае, Чарнігаўскае, Смаленскае, Тураўскае, Уладзіміра-Суздальскае, Галіцкае, Валынскае і інш. княствы. |
| 1127 г. | – першае ўпамінанне пра г. Барысаў («Лаўрэнцьеўскі летапіс»). |

| | |
|---|---|
| 1127 г. | – першае ўпамінанне пра г. Гродна (Гародня) (Іпацьеўскі, Лаўрэнцьеўскі і Радзівілаўскі летапісы). |
| 1127 г. | – першае ўпамінанне пра г. Клецк. |
| 1127 г. | – паход кіеўскага князя Мсціслава на Полацкую зямлю. |
| 1129 г. | – кіеўскі князь Мсціслаў захапіў полацкіх князёў і выслаў іх з сем'ямі ў Візантыю. |
| 1130–1182 гг. | – гады жыцця беларускага асветніка і прапаведніка Кірылы Тураўскага, з 1158 г. – тураўскага епіскапа. |
| 1132 г. | – веча г. Полацка выбрала князем Васільку – унука Усяслава Чарадзея. |
| 1136 г. | – першае ўпамінанне пра г. Крычаў («Устаўная грамата смаленскага князя Расціслава Мсціславіча»). |
| 1142 г. | – першае ўпамінанне пра г. Гомель («Кіеўскі летапіс»). |
| 1142 г. | – першае ўпамінанне пра г. Рагачоў («Іпацьеўскі летапіс»). |
| 1144–1151 гг. | – княжанне ў г. Полацку Рагвалода Барысавіча (у 1151 г. выгнаны вечам). |
| 1147 г. | – першае ўпамінанне пра г. Брагін («Іпацьеўскі летапіс»). |
| 1152–1161 гг. | – будаўніцтва ў г. Полацку Спаса-Ефрасінеўскай царквы дойлідам Іаанам па заказу Ефрасінні Полацкай. |
| 1155 г. | – першае ўпамінанне ў летапісе пра г. Мазыр. |
| 1156 г. | – першае ўпамінанне ў летапісе пра г. Мсціслаў («Іпацьеўскі летапіс»). |
| 1157 г. | – 10-тыднёвая абарона г. Турава ад войскаў кіеўскага князя Ізяслава Давыдавіча і яго саюзнікаў. |
| 1157–1162 гг. | – княжанне ў Тураве Юрыя Яраславіча, заснавальніка самастойнай тураўскай княжацкай дынастыі. |

| | |
|---|---|
| 1158 г. (1159 г.) | – Кірыла Тураўскі выбраны тураўскім вечам і князем на епіскапскую кафедру. |
| 1159 г. | – першае ўпамінанне пра г. Чачэрск («Іпацьеўскі летапіс»). |
| 1160 г. | – вылучэнне Слуцкага ўдзельнага княства з Тураўскай зямлі. |
| 1161 г. | – стварэнне майстрам-ювелірам Лазарам Богшам па даручэнні Ефрасінні Полацкай Уздзвіжанскага крыжа для Спаскай царквы г. Полацка – выдатнага помніка старабеларускага эмальернага мастацтва. |
| 1180 г. | – утварэнне Мсціслаўскага удзельнага княства. Першы князь – Мсціслаў Раманавіч. |
| 1180-я гг. | – будаўніцтва Барысаглебскай (Каложскай царквы) у г. Гродне. |
| пасля 1187 г. | – стварэнне паэмы «Слова аб паходзе Ігаравым». |
| 1199 г. | – утварэнне Галіцка-Валынскага княства, у склад якога ў XIII ст. уваходзілі паўднёва-заходнія землі Беларусі. |
| XII ст. | – складванне ў г. Кіеве старажытнага летапісу ўсходніх славян «Аповесць мінулых гадоў». |
| 1201 г. | – заснаванне крыжакамі г. Рыгі. |
| 1202 г. | – утварэнне рыцарскага Ордэна мечаносцаў у Прыбалтыцы. |
| 1203–1410 гг. | – гады змагання нашых продкаў з нямецкімі крыжакамі. |
| 1203 і 1206 гг. | – першае адкрытае сутыкненне Полацка з крыжакамі – паходы супраць рыцараў полацкага князя Уладзіміра. Полацкае княства першым з беларускіх княстваў уступіла ў змаганне з крыжакамі. |
| 1203 г. | – полацкі князь Уладзімір узяў у аблогу нямецкія крэпасці Ікскюль і Гольм. |
| 1208 г. | – страта Полацкім княствам крэпасці Кукенойс на р. Заходняй Дзвіне. |

| | |
|---|---|
| 1209 г. | – страта Полацкім княствам крэпасці Герцыке на р. Заходняй Дзвіне. |
| 1212 г. | – лівы перасталі плаціць даніну Полацкаму княству (дагавор паміж полацкім князем Уладзімірам і рыжскім архіепіскапам Альбертам). |
| 1212 г. | – дагавор г. Полацка з г. Рыгай аб свабодным плаванні купцоў па р. Заходняй Дзвіне. |
| 1213 г. | – першае ўпамінанне пра г. Рэчыцу («Густынскі летапіс»). |
| 1216 г. | – падрыхтоўка палачанамі разам з эстамі і літоўцамі паходу супраць нямецкіх рыцараў. Паход быў адкладзены з прычыны раптоўнай смерці полацкага князя Уладзіміра. |
| вясна 1223 г. | – з’яўленне ва Усходняй Еўропе мангола-татарскіх орд Чынгісхана. |
| 1223 г. | – дагавор гарадоў Смаленска і Полацка з г. Рыгай. |
| 1229 г. | – гандлёвае і палітычнае пагадненне паміж Смаленскім, Полацкім і Віцебскім княствамі, з аднаго боку, і Рыгай і Гоцкім берагам (Готландам) – з другога («Смаленская гандлёвая праўда»). |
| 1230 г. | – пачатак дзейнасці Тэўтонскага ордэна ў Прыбалтыцы. |
| 1235 г. | – упамінанне ў Іпацьеўскім летапісе наваградскага князя Ізяслава. |
| 1235 г. | – упамінанне ў летапісе пра «Літву Міндоўга». |
| 1236 г. | – літоўцы нанеслі моцнае паражэнне ордэну Мечаносцаў пад г. Шаўляем. |
| 1237 г. | – аб’яднанне ордэна Мечаносцаў з Тэўтонскім – заснаванне Лівонскага ордэна. |
| 1237 г. | – разгром валынскім князем Данілам Раманавічам рыцараў-крыжаносцаў пад г. Драгічынам. |
| 1237–1241 гг. | – нашэсце мангола-татараў на Русь. |

| | |
|---|---|
| 1230-я – 1263 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Міндоўга. |
| 1240 г. | – захоп мангола-татарамі г. Кіева, пачатак набегаў мангола-татарскіх орд на тэрыторыю паўднёвай Беларусі. |
| 15 ліпеня 1240 г. | – бітва ноўгарадскага князя Аляксандра Яраславіча са шведскімі рыцарамі на рацэ Няве *(Неўская бітва).* У гэтай бітве вызначыўся Якаў Палачанін. |
| 1241 г. | – уварванне на Берасцейшчыну мангола-татараў. |
| 1242 г. | – бітва на Чудскім возеры, дзе наўгародскі князь Аляксандр ушчэнт разбіў войска крыжакоў. |
| 1246 г. | – Міндоўг прыняў праваслаўе і стаў Навагародскім князем. |
| 1248 г. | – стварэнне кааліцыі супраць князя Міндоўга ў складзе галіцка-валынскіх князёў Данілы і Васілька, пляменніка Міндоўга Таўцівіла, Лівонскага ордэна і інш. |

# IV. Беларускія землі ў сярэдзіне XIII – XIV ст.

| | |
|---|---|
| 1252 г. | – першае ўпамінанне пра гарады Ваўкавыск, Слонім («Іпацьеўскі летапіс»). |
| 1253 г. | – хрышчэнне князя Міндоўга ў каталіцтва і каранаванне яго каралём Літвы ў г. Навагародку. |
| 1253 г. | – паход галіцка-валынскіх князёў з удзелам тураўскіх і пінскіх войскаў на г. Навагародак. |
| 1258, 1259, 1275, 1287 гг. | – набегі мангола-татар на землі ВКЛ. |
| 1260 г. | – жамойцкае войска разбіла крыжакоў каля *возера Дурбе.* |
| 1261 г. | – Міндоўг разарваў пагадненне з крыжакамі і ўступіў у саюз супраць іх з Аляксандрам Неўскім, а таксама з князямі г. Полацка і г. Віцебска. |

| | |
|---|---|
| 1263 г. | – забойства князя Міндоўга. |
| 1263–1264 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Траняты. |
| 1264–1266 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Войшалка. |
| 22 снежня 1264 г. | – мірны і гандлёвы дагавор г. Полацка і г. Віцебска з г. Рыгай і Готландам. |
| 1267 г. | – першае ўпамінанне пра г. Магілёў («Магілёўская хроніка»). |
| 1267–1270 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Шварна. |
| 1268 г. | – забойства Войшалка, сына князя Міндоўга. |
| 1270–1282 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Трайдзеня. |
| 1274 г. | – першае ўпамінанне пра г. Капыль («Галіцка-валынскі летапіс»). |
| 1284 г. | – нападзенне крыжакоў на г. Гродна і Гарадзенскую зямлю. |
| 1287 г. | – першае ўпамінанне пра г. Кобрын («Іпацьеўскі летапіс»). |
| 1290–1294 гг. | – два паходы крыжакоў на землі ВКЛ. |
| 1293–1316 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Віценя. |
| 1293 г. | – вялікі князь Віцень прыняў герб «Пагоня», які адначасова стаў і дзяржаўным гербам Вялікага Княства Літоўскага. |
| 1295 г. | – нападзенне крыжакоў на г. Гродна і Гарадзенскую зямлю. |
| 1296 г. | – нападзенне крыжакоў на г. Гродна і Гарадзенскую зямлю (двойчы). |
| XIII ст. | – на балцкіх землях, не захопленых крыжакамі, выдзяляюцца дзве вялікія вобласці – Аўкштайція (Сярэдняе і Верхняе Панямонне, у тым ліку і тэрыторыя цяперашняй Гродзенскай вобласці) і Жамойць (Ніжняе Панямонне каля Балтыйскага мора). Адзін з раёнаў Аўкштайціі – Літва – стаў цэнтрам аб’яднання балцкіх плямён. |

| | |
|---|---|
| XIII ст. | – напісанне «Аршанскага евангелля». |
| 1307 г. | – у адпаведнасці з дагаворам («радам») Полацкае княства ўвайшло ў склад Вялікага Княства Літоўскага. |
| 1309 г. | – перанясенне рэзідэнцыі Тэўтонскага ордэна з Венецыі ў прускі замак Мальбарк. |
| 1311 г. | – нападзенне крыжакоў на г. Гродна і Гарадзенскую зямлю (тройчы). |
| 1314 г. | – перамога войска пад камандаваннем Давыда Гарадзенскага над крыжакамі пад г. Навагародкам. |
| 1315 г. | – далучэнне да Вялікага Княства Літоўскага Берасцейскай зямлі. |
| 1316–1341 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Гедыміна. |
| 1320 г. | – уваходжанне ў склад Вялікага Княства Літоўскага Віцебскага княства. |
| 1320–1330-я гг. | – уваходжанне ў склад Вялікага Княства Літоўскага Турава-Пінскай зямлі. |
| 1323 г. | – вялікі князь Гедымін перанёс сталіцу Вялікага Княства Літоўскага з Навагародка ў Вільню. |
| 1323 г. | – пачатак будаўніцтва замка ў г. Лідзе. |
| 1325–1399 гг. | – жыццё і дзейнасць Андрэя Полацкага, сына вялікага князя Альгерда і віцебскай князёўны Марыі Яраслаўны. Князь полацкі, пскоўскі і трубчэўскі. |
| 1326 г. | – Давыд Гарадзенскі па даручэнні Гедыміна ўзначаліў войска Вялікага Княства Літоўскага ў паходзе на г. Брандэнбург. Падчас паходу быў здрадніцкі забіты мазавецкім рыцарам Андрэем Гостам. |
| каля 1326 г. | – уваходжанне ў склад Вялікага Княства Літоўскага Менскага княства. |
| 1328 г. | – нападзенне крыжакоў на г. Гродна і Гарадзенскую зямлю (тройчы). |
| 1331 г. | – перамога войскаў Вялікага Княства Літоўскага над крыжакамі на рацэ Акмяне. |

| | |
|---|---|
| 1341–1345 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Яўнута (аднаго з сямі сыноў Гедыміна, але не старэйшага). |
| 1345 г. | – змова сыноў Гедыміна Альгерда і Кейстута супраць Яўнута (скінулі яго з вялікакняжацкага трона і далі ва ўладанне Заслаўскае княства, самі падзялілі тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага на дзве часткі і сумесна кіравалі). |
| 1345–1377 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Альгерда (сумесна з братам Кейстутам). |
| 1348 г. | – бітва з нямецкімі рыцарамі на р. Стрэве (прытоку р. Нёмана). Бітва не выявіла пераможцы. |
| першая палова XIV ст. | – у Беларусі з’явілася татарскае насельніцтва. |
| 1355 г. | – далучэнне да Вялікага Княства Літоўскага Бранскага княства. |
| 1355 г. | – у г. Навагародак канстанцінопальскім патрыярхам быў прызначаны *мітрапаліт Раман*. |
| 1358 г. | – далучэнне да Вялікага Княства Літоўскага Мсціслаўскага княства. |
| 1360-я гг. | – уваходжанне ў склад Вялікага княства Літоўскага Мазырскай і Брагінскай валасцяў. |
| 1362 г. (1363 г.) | – разгром войскамі Вялікага Княства Літоўскага пад кіраўніцтвам вялікага князя Альгерда татар на рацэ Сініе Воды. У выніку да Вялікага Княства Літоўскага былі далучаны Кіеўская, Чарнігаўская, Валынская, Падольская і Пераяслаўская землі. |
| каля 1364 – каля 1420 гг. | – жыццё і дзейнасць мітрапаліта Рыгора Цамблака. |
| 1366 г. | – адбіццё палачанамі крыжацкай аблогі г. Полацка. |
| 1368 г. | – войскі вялікага князя Альгерда першы раз хадзілі на г. Маскву. |

| | |
|---|---|
| 1370 г. | – другі паход вялікага князя Альгерда на г. Маскву. |
| 1372 г. | – трэці паход вялікага князя Альгерда на г. Маскву. |
| 1373, 1375 гг. | – паходы полацкага войска на чале з Андрэем Полацкім на Лівонію. |
| 1377–1392 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Ягайлы. |
| 8 верасня 1380 г. | – Кулікоўская бітва паміж войскамі Залатой Арды і вялікага князя маскоўскага Дзмітрыя Іванавіча (Данскога). Паражэнне татараў. Удзел у бітве ўзялі Андрэй і Дзмітрый Альгердавічы. |
| 1382 г. | – у Крэўскім замку забіты князь Кейстут. |
| 1382 г. | – у гістарычнай крыніцы г. Полацк названы крэпасцю Белай Русі. |

## V. Беларускія землі ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст.

| | |
|---|---|
| 14 жніўня 1385 г. | – заключэнне Крэўскай уніі – саюза Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства. |
| 1386–1434 гг. | – вялікі князь Ягайла займае пасаду польскага караля пад іменем Уладзіслава II. Пачатак персанальнай уніі Вялікага Княства Літоўскага і каралеўства Польшчы, усталяванне ў Еўропе дынастыі Ягелонаў. |
| 1386 г. | – выступленне супраць вялікага князя Ягайлы полацкага князя Андрэя Альгердавіча. |
| 27 красавіка 1387 г. | – першае ўпамінанне пра г. Бабруйск (у прывілеі вялікага князя Ягайлы князю Скіргайлу). |
| 1387 г. | – утварэнне Віленскага каталіцкага біскупства. |
| 1387 г. | – г. Вільня атрымаў Магдэбургскае права. |
| 1387 г. | – прывілей вялікага князя Ягайлы, які юрыдычна замацоўваў палітычныя і эканамічныя правы феадалаў каталіцкага веравызнання. |

| | |
|---|---|
| 16 снежня 1388 г. | – першае ўпамінанне пра г. Маладзечна (у прысяжным лісце князя Дзмітрыя Альгердавіча вялікаму князю ВКЛ Ягайлу). |
| 1389–1392 гг. | – узброеная барацьба феадалаў Вялікага Княства Літоўскага на чале з князем Вітаўтам супраць вялікага князя Ягайлы. |
| 1390 г. | – г. Берасце атрымаў магдэбургскае права. |
| 5 жніўня 1392 г. | – Востраўскае пагадненне паміж князямі Вітаўтам і Ягайлам аб падзеле ўлады. |
| 1392–1430 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Вітаўта. |
| 1393, 1396 гг. | – мяцяжы супраць улады вялікага князя ў г. Віцебску. |
| 1394 г. | – у Вялікае Княства Літоўскае ўцёк са сваёй дружынай хан Тахтамыш. |
| 1395 г. | – вялікі князь Вітаўт падпарадкаваў сабе г. Смаленск. |
| 1395 г. | – першае ўпамінанне пра мястэчка Мір у летапісе. |
| 1397–1398 гг. | – пасяленне вялікім князем Вітаўтам крымскіх татар у Вялікім Княстве Літоўскім. |
| 1398 г. | – вялікі князь Вітаўт усталяваў кантроль над г. Ноўгарадам. |
| 1398 г. | – пагадненне Вялікага Княства Літоўскага і Ордэна на востраве Салін, па якому вялікі князь Вітаўт абвяшчаўся «каралём Літвы і Русі». |
| 12 жніўня 1399 г. | – паражэнне войска Вялікага Княства Літоўскага ад татар у бітве на рацэ Ворскле. |
| 1401 г | – Віленска-Радамская ўнія Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай. Вітаўт стаў пажыццёвым уладаром ВКЛ і набыў тытул вялікага князя літоўскага. |
| 1402 г. | – апошняя аблога крыжакамі Гарадзенскага замка. |
| 1404 г. | – уключэнне г. Смаленска ў склад Вялікага Княства Літоўскага. |

| | |
|---|---|
| 1404 г. | – усталяванне мяжы паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім княствам Маскоўскім па рэках Угра і Ака. |
| 1408 г. | – тайная нарада князёў Вітаўта і Ягайлы ў г. Навагародку, дзе было прынята рашэнне пачаць у 1409 г. вайну з Тэўтонскім ордэнам. |
| 6 жніўня 1409 г. | – Тэўтонскі ордэн аб'явіў вайну Ягайлу. |
| 1409–1411 гг. | – «Вялікая вайна» Вялікага Княства Літоўскага і Польскага каралеўства супраць Тэўтонскага ордэна. |
| 15 ліпеня 1410 г. | – Грунвальдская бітва, перамога аб'яднаных войскаў Вялікага Княства Літоўскага і Кароны Польскай над Тэўтонскім ордэнам. |
| 1411 г. | – Торуньскі мір (мір, заключаны Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай з Тэўтонскім ордэнам у г. Торунь). |
| 1413 г. | – заключэнне Гарадзельскай уніі ў замку *Гародла* на рацэ Заходні Буг (цяпер у Грубешоўскім павеце Люблінскага ваяводства, Польшча).<br>Выдадзены тры граматы. Першая – аб надзяленні польскімі феадаламі феадалаў-каталікоў Вялікага Княства Літоўскага сваімі гербамі і прыняцці іх у гербавае брацтва. Другая – феадалы-каталікі Вялікага Княства Літоўскага прымалі гэтыя гербы і абяцалі палякам вечны мір і саюз. Трэцяя – Вітаўт і Ягайла абяцалі прызначаць на дзяржаўныя пасады толькі феадалаў-каталікоў, якія прынялі гербы. |
| 1415 г. | – у г. Навагародку адбыўся царкоўны сабор, які прызнаў мітрапалітам кіеўскім у ВКЛ *Рыгора Цамблака* і абвясціў незалежнасць праваслаўнай царквы ВКЛ ад кіеўскага мітрапаліта ў г. Маскве. |
| 1416 г. | – перанос праваслаўнай мітрапаліцкай кафедры з г. Кіева ў г. Вільню. |

| | |
|---|---|
| 1427 г. | – Вялікае Княства Літоўскае падпарадкавала сабе Вярхоўскія княствы (у вярхоўях ракі Ака). |
| 1429 г. | – з'езд у г. Луцку са спробай правесці каранацыю вялікага князя Вітаўта. |
| 1430–1432 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Свідрыгайлы. |
| 1431 г. | – палякі аб'явілі вялікаму князю Свідрыгайлу вайну і пачалі баявыя дзеянні на Валыні. |
| 1432–1436 гг. | – грамадзянская вайна ў Вялікім Княстве Літоўскім, у часе якой дзяржава часова была падзелена на Вялікае Княства Літоўскае з цэнтрам у г. Вільні і Вялікае Княства Рускае з цэнтрам у г. Полацку. |
| 1 верасня 1432 г. | – спроба мяцежнікаў забіць вялікага князя Свідрыгайлу ў г. Ашмянах. |
| 1432–1440 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча. |
| 1432 і 1434 гг. | – прывілеі вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча аб ўраўнаванні ў правах праваслаўных феадалаў з каталікамі. |
| 1 верасня 1435 г. | – бітва пад г. Вількамірам (Укмерге, Літва) – паражэнне вялікага князя Свідрыгайлы. |
| 1439 г. | – заключэнне уніі паміж каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі на царкоўным саборы ў г. Фларэнцыя (Фларэнційская ўнія). |
| 1440 г. | – змова супраць вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча і яго забойства ў Трокскім замку. |
| 1440–1492 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Казіміра IV Ягелончыка (сына Ягайлы і Соф'і Гальшанскай). |
| 1441 г. | – атрыманне магдэбургскага права г. Слуцкам. |
| 1442 г. | – ваенны канфлікт паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім. |
| 1446 г. | – створаны агульнадзяржаўны летапісны звод – *Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.* |
| 1446 г. | – першае ўпамінанне пра г. Нясвіж. |

| | |
|---|---|
| 1447 г. | – прыняцце агульназемскага прывілея Казіміра IV Ягелончыка, якім былі замацаваны шырокія правы баяр Вялікага Княства Літоўскага ў палітычным, сацыяльным і эканамічным жыцці дзяржавы. Прывілей паклаў пачатак юрыдычнаму афармленню асабістай залежнасці сялян ад феадала. |
| 31 жніўня 1449 г. | – пагадненне паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім. За ВКЛ прызнавалася права на Смаленшчыну, княствы ў вярхоўях р. Ака. |
| 1453 г. | – заваяванне сталіцы праваслаўнага свету – г. Канстанцінопаля туркамі. |
| 1458 г. | – канчатковае адасабленне праваслаўнай царкоўнай арганізацыі Вялікага Княства Літоўскага ад маскоўскай, непасрэднае яе падпарадкаванне канстанцінопальскаму патрыярху. |
| 29 лютага 1468 г. | – выданне *Судзебніка Казіміра* – першага кодэкса крымінальна-працэсуальнага права ў Вялікім Княстве Літоўскім, складзенага на аснове мясцовага звычаёвага права і судова-адміністрацыйнай практыкі. |
| каля 1470 – каля 1533 г. | – жыццё і дзейнасць М. Гусоўскага, аўтара напісанай на лацінскай мове «Песні пра зубра» (1523 г.). |
| 1474–1569 гг. | – за гэты час крымскія татары зрабілі 75 набегаў на землі Вялікага Княства Літоўскага. |
| 1480 г. | – заключэнне саюза Крымскага ханства з Маскоўскай дзяржавай. Пасля гэтага крымскія татары сталі рэгулярна здзяйсняць набегі на землі Вялікага Княства Літоўскага. |
| 1481 г. | – няўдалая змова Алелькавічаў супраць вялікага князя Казіміра IV Ягелончыка. |
| 1486 г. | – першае ўпамінанне ў Метрыцы Вялікага Княства Літоўскага пра г. Масты. |
| каля 1490 – каля 1551 гг. | – жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны, беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара. |

| | |
|---|---|
| 1492–1494 гг. | – першая адкрытая вайна паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім у серыі міждзяржаўных войнаў канца XV – першай паловы XVI ст. Завяршылася Маскоўскім пагадненнем 1494 г. Была ўстаноўлена новая мяжа паміж дзяржавамі. Права на Вяземскае княства і княствы ў вярхоўях р. Ака прызнана за Маскоўскай дзяржавай. ВКЛ адмовілася ад прэтэнзій на гарады Ноўгарад, Пскоў, Разань, Цвер. |
| 1492–1506 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Аляксандра. |
| 1492 г. | – прывілей вялікага князя Аляксандра аб правядзенні ўнутранай і знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага толькі з адабрэння Рады. |
| 1494 г. | – атрыманне магдэбургскага права г. Высокае. |
| 1496 г. | – атрыманне магдэбургскага права г. Гродна (Гародняй). |
| 1497 г. | – татарскія загоны былі разбіты на Мазыршчыне. |
| 1498 г. | – атрыманне магдэбургскага права г. Полацкам. |
| 1499 г. | – атрыманне магдэбургскага права г. Мінскам. |
| XV–XVII стст. | – складванне беларуска-літоўскага летапісання. |
| ліпень 1500 г. | – паражэнне войска Вялікага Княства Літоўскага ад маскоўскага войска на рацэ *Вядроша.* |
| 1500–1503 гг. | – другая вайна паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім у серыі міждзяржаўных войн канца XV – першай паловы XVI ст. Завяршылася прыняццем «перамірных грамат» 2 красавіка 1503 г. у г. Маскве паводле якіх абвяшчалася шасцігадовае перамір'е (1503–1509 гг.) і вызначаліся новыя межы паміж дзяржавамі. ВКЛ страціла гарады Бранск, Веліж, Гомель, Дарагабуж, Любеч, Мцэнск, Ноўгарад-Северскі, Пуціўль, Старадуб, Сярпейск, Хоцім, Чарнігаў і інш. |

| | |
|---|---|
| 1503 г. | – атрыманне магдэбургскага права г. Камянцом. |
| 1503 г. | – далучэнне г. Гомеля да Маскоўскага княства. |
| 1503 г. | – татарскія загоны былі разбіты пад г. Давыд-Гарадком. |
| 1504 г. | – утварэнне Полацкага ваяводства. |
| 1505, 1508 гг. | – татарскія загоны былі разбіты пад г. Слуцкам. |
| да 1506 г. | – атрыманне магдэбургскага права г. Ваўкавыскам. |
| 1506 г. | – утварэнне Віцебскага ваяводства. |
| 5 жніўня 1506 г. | – разгром войскамі Вялікага Княства Літоўскага пад камандаваннем Міхаіла Глінскага пад г. Клецкам войска Крымскага ханства. Узята каля 4 тыс. палонных. |
| 1506–1548 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Жыгімонта Старога. |
| 1506–1508 гг. | – трэцяя вайна паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім у серыі міждзяржаўных войнаў канца XV – першай паловы XVI ст. Скончылася падпісаннем 19 верасня 1508 г. пагаднення аб «вечным міры», у якім былі пацверджаныя межы, зафіксаваныя ў папярэдніх міждзяржаўных пагадненнях. |
| 1507 г. | – утварэнне Навагародскага ваяводства. |
| 1508 г. | – мяцеж Міхаіла Глінскага. |
| 1511 г. | – атрыманне магдэбургскага права г. Навагародкам. |
| 1512–1522 гг. | – чацвёртая вайна паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім у серыі міждзяржаўных войнаў канца XV – першай паловы XVI ст. Скончылася Маскоўскім пагадненнем 1522 г., якое мела кампрамісны характар і прадугледжвала пяцігадовае перамір’е, па завяршэнні якога планавалася падпісаць «вечны мір». ВКЛ страціла г. Смаленск, які апынуўся ў складзе Маскоўскай дзяржавы. |

| | |
|---|---|
| 8 верасня 1514 г. | – бітва пад г. Оршай, разгром войскам Вялікага Княства Літоўскага пад камандаваннем К. Астрожскага маскоўскага войска. |
| 6 жніўня 1517 г. | – выданне Францішкам Скарынам у Празе першай беларускай і ўсходнеславянскай кнігі – «*Псалтыр*». |
| 1517 г. | – выступленне прафесара Вітэнбергскага ўніверсітэта Марціна Лютэра, пачатак рэфармацыйнага руху ў Еўропе, які завяршыўся афармленнем пратэстантызму. |
| 1518 г. | – вялікі князь Жыгімонт Стары ажаніўся з Бонай Сфорца, прадстаўніцай знакамітага міланскага роду. |
| 1520-я гг. | – магнаты Іллінічы пачалі ўзвядзенне палацава-замкавага комплексу ў мястэчку Мір. |
| 1522–1525 гг. | – выдавецкая дзейнасць Францішка Скарыны ў г. Вільні (у 1522 г. выйшла «Малая падарожная кніжыца», у 1525 г. – «Апостал»). |
| 1523 г. | – выданне М. Гусоўскім напісанай на лацінскай мове «Песні пра зубра». |
| 29 верасня 1529 г. | – прыняцце Першага Статута Вялікага Княства Літоўскага. |
| 1529 г. | – на сейме Вялікага Княства Літоўскага дэпутаты абвясцілі Жыгімонта Аўгуста пераемнікам яго бацькі, Жыгімонта Старога. |
| 1529 г. | – узнік тэрмін *«пратэстантызм»,* пасля таго, як некалькі князёў і група гарадоў Свяшчэннай Рымскай імперыі выступілі з пратэстам супраць рашэння імператара аб забароне далейшага распаўсюджвання некаталіцкіх хрысціянскіх рухаў. |
| 1530–1593 гг. | – жыццё і дзейнасць Сымона Буднага – беларускага гуманіста, асветніка, рэлігійнага рэфарматара, філосафа, аднаго з заснавальнікаў Нясвіжскай друкарні, дзе ён выдаў у 1562 г. на старабеларускай мове «Катэхізіс». |

| | |
|---|---|
| 1530-я гг. | – пачатак валочнай памеры ў Пінскім і Клецкім княствах па ініцыятыве вялікай княгіні Боны Сфорца. |
| 1531 г. | – атрыманне магдэбургскага права г. Слонімам. |
| 1534 г. | – іспанскі шляхціц Ігнацій Лаёла заснаваў для барацьбы з рэфармацыяй каталіцкі манаскі ордэн Таварыства Ісуса (езуіты). |
| 1534–1537 гг. | – пятая вайна паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Вялікім Княствам Маскоўскім у серыі міждзяржаўных войнаў канца XV – першай паловы XVI ст. У лютым 1537 г. у г. Маскве быў падпісаны мір, які прызнаваў г. Гомель з зямлёй за Вялікім Княствам Літоўскім, а Себеж і Завалочча – за Маскоўскай дзяржавай. У астатнім межы заставаліся без змяненняў. Прадугледжвалася пяцігадовае перамір'е да 25 сакавіка 1542 г. |
| каля 1540–1599 або 1600 гг. | – жыццё і дзейнасць Васіля Цяпінскага – беларускага пісьменніка, гуманіста, кнігавыдаўца. В. Цяпінскі стварыў друкарню, дзе ў 1570–1580-я гг. выдаў паралельна на царкоўнаславянскай і беларускай мовах перакладзенае ім на беларускую мову «Евангелле» з уласнай прадмовай. |
| 1540-я гг. – першая палова XVII ст. | – правядзенне ў дзяржаўных уладаннях Вялікага Княства Літоўскага гаспадарчай рэформы – *валочнай памеры ці аграрнай рэформы Жыгімонта Аўгуста.* |
| 1545–1563 гг. | – дзейнасць Трыдэнцкага сабора, на якім кіраўнікі каталіцкай царквы адхілілі магчымасць кампрамісу з пратэстантамі. |
| 1548–1572 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім вялікага князя Жыгімонта Аўгуста, сына Жыгімонта Старога. На ім завяршылася дынастыя Ягелонаў, ён зацвердзіў Статут ВКЛ 1566 г., правёў аграрную рэформу ў дзяржаўных уладаннях. |

# VI. Беларусь у сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст.

| | |
|---|---|
| XVI ст. – пач. XX. ст. | – Новы час на тэрыторыі Беларусі. |
| сярэдзіна XVI ст. | – стварэнне *«Хронікі Быхаўца»* – найбольш поўнага летапіснага зводу беларуска-літоўскага летапісання. |
| 1550 г. | – пачатак пашырэння ў Беларусі ідэй *Рэфармацыі*. |
| 1553 г. | – заснаванне ў г. Берасці кальвінскай абшчыны, першай пратэстанцкай абшчыны на тэрыторыі Беларусі. |
| 1553 г. | – у г. Берасці заснавана першая на тэрыторыі сучаснай Беларусі рэфармацыйная друкарня, якая дзейнічала да 1570-х гг. |
| 1 красавіка 1557 г. | – выданне *«Уставы на валокі»*, асноўнага дакумента Вялікай аграрнай рэформы (валочнай памеры). |
| 1557 г. | – заснаванне Віленскага пратэстанцкага збору. |
| 1557–1633 гг. | – жыццё і дзейнасць Льва Іванавіча Сапегі, вядомага дзяржаўнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага. |
| 1558 г. | – Лівонскі ордэн адмовіўся плаціць даніну за эстонскія землі і г. Юр’еў (сучасны Тарту) маскоўскаму цару Івану IV. |
| 1558–1583 гг. | – Лівонская (Інфлянцкая) вайна. Для Вялікага Княства Літоўскага закончылася ў 1582 г. падпісаннем *Ям-Запольскага перамір’я* з Маскоўскай дзяржавай. Для Маскоўскага княства вайна скончылася заключэннем *Плюскага перамір’я* (на рацэ Плюса) са Швецыяй у жніўні 1583 г., паводле якога шведы завалодалі паўночнай часткай Эстоніі. |
| 31 жніўня 1559 г. | – падпісанне пагаднення (першага) ў г. Вільні паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Інфлянцкім ордэнам аб тым, што апошні пераходзіць пад пратэкцыю вялікага князя Жыгімонта Аўгуста. |

| | |
|---|---|
| 28 лістапада 1561 г. | – падпісанне пагаднення (другога) ў г. Вільні паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Інфлянцкім ордэнам, паводле якога ордэнскія ўладанні ў Інфлянтах перайшлі пад супольную ўладу ВКЛ і Кароны Польскай, а магістр ордэна Г. Кетлер стаў васалам вялікага князя Жыгімонта Аўгуста. |
| 1562 г. | – войскі Івана Грознага спустошылі гарады Мсціслаў, Шклоў, Копысь, Оршу, Віцебск. |
| 1562 г. | – палявы сейм Вялікага Княства Літоўскага пад г. Віцебскам, на якім шляхта патрабавала ад вялікага князя Жыгімонта Аўгуста правесці супольны сейм з палякамі «каб разам караля выбіраць, мець агульную абарону, супольна соймікаваць і права аднолькавае ўжываць». |
| 1562 г. | – Сымон Будны выдаў у г. Нясвіжы першую ў межах сучаснай Беларусі друкаваную кнігу на старабеларускай мове – «Катэхізіс». |
| 15 лютага 1563 г. | – войскі Івана Грознага захапілі г. Полацк. |
| 1563 г. | – віленскі прывілей Жыгімонта Аўгуста аб ураўнаванні ў правах хрысціянскай шляхты Вялікага Княства Літоўскага незалежна ад веравызнання (вярхоўныя пасады ў дзяржаве маглі займаць прадстаўнікі шляхты любога хрысціянскага веравызнання). |
| 1563 г. | – выданне Брэсцкай, альбо Радзівілаўскай бібліі ў рэфармацыйнай друкарні Мікалая Радзівіла Чорнага ў г. Берасці. |
| 26 студзеня 1564 г. | – войска Вялікага Княства Літоўскага пад камандаваннем гетмана М. Радзівіла Рудога нанесла паражэнне рускім войскам пад камандаваннем ваяводы Пятра Шуйскага ў бітве на *рацэ Уле* каля г. Чашнікаў. |
| 1564 г. | – пачатак *контррэфармацы*і ў Вялікім Княстве Літоўскім і Кароне Польскай, калі Жыгімонт Аўгуст прызнаў дэкрэты Трыдэнцкага сабора і пагадзіўся на допуск у краіну езуітаў. |

| | |
|---|---|
| 1565 г. | – адміністрацыйная і судовая рэформы ў Вялікім Княстве Літоўскім. ВКЛ падзялялася на ваяводствы, паветы і воласці. Беларускія землі ўваходзілі ў склад Віленскага, Віцебскага, Берасцейскага, Менскага, Мсціслаўскага, Наваградскага, Полацкага і Трокскага ваяводстваў. Уводзіліся павятовыя сеймікі і павятовыя суды. На тэрыторыі Беларусі было 16 паветаў. |
| 1 сакавіка 1566 г. | – прыняцце Другога Статута Вялікага Княства Літоўскага. |
| 1567 г. | – колькасць насельніцтва Беларусі склала 2 млн. 500 тыс. чалавек. |
| 1568–1570 гг. | – дзейнасць друкарні ў г. Заблудаве. |
| 10 студзеня – 1 ліпеня 1569 гг. | – час працы Люблінскага сейма. |
| 1 ліпеня 1569 г. | – падпісанне Люблінскай уніі, утварэнне федэратыўнай Рэчы Паспалітай. |
| 1569 г. | – віленскі біскуп Валяр'ян Пратасевіч запрасіў у Вялікае Княства Літоўскае 13 прадстаўнікоў ордэна езуітаў. |
| 1570 г. | – падпісанне перамір'я ў Інфлянцкай вайне паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай. |
| 24 жніўня 1572 г. | – Варфаламееўская ноч – масавае забойства гугенотаў у г. Парыжы, якое пачалося ў ноч з 23 на 24 жніўня 1572 г. |
| 1572–1592 гг. | – дзейнасць друкарні ў г. Лоску. |
| 1572–1630 гг. | – жыццё і дзейнасць Мялеція Сматрыцкага. |
| 1573 г. | – акт Варшаўскай канфедэрацыі аб свабодзе веравызнання ў Рэчы Паспалітай. |
| 1573–1574 гг. | – княжанне Генрыка Валуа (Валезы), сына фран цузскага караля Генрыха II Валуа. Першы выбарны кароль Рэчы Паспалітай. Падпісаў «*Пакта канвента*» і «*Генрыкавы артыкулы*». |

| | |
|---|---|
| 1576–1586 гг. | – кіраванне ў Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя. З венгерскага роду Баторыяў Шомліа. Вярнуў Вялікаму Княству Літоўскаму г. Полацк пад час Інфлянцкай вайны, запрасіў езуітаў, заснаваў Віленскі ўніверсітэт (акадэмію). |
| 1577 г. | – Пётр Скарга выдаў кнігу «Аб адзінстве царквы Божай...», дзе прапагандаваў ідэю аднаўлення Фларэнційскай уніі 1439 г. |
| жнівень 1579 г. | – войскі Рэчы Паспалітай пад камандаваннем Стэфана Баторыя вызвалілі Полацк. |
| 1579 г. | – заснаванне Віленскай езуіцкай акадэміі (Віленскага ўніверсітэта). |
| каля 1580 г. | – дзейнасць друкарні ў м. Цяпіна. |
| з 1580-х гг. | – ствараліся школы пры праваслаўных брацтвах у Вільні, Магілёве, Брэсце і іншых гарадах. |
| 1 сакавіка 1581 г. | – утварэнне Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага –вышэйшага судовага органа ВКЛ. |
| 1580 г. | – заснаванне ў г. Полацку езуіцкага калегіума – першай сярэдняй навучальнай установы ордэна езуітаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. У 1812 г. на яго базе заснавана Полацкая езуіцкая акадэмія. |
| 15 студзеня 1582 г. | – *Ям-Запольскае перамір'е* паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай на 10 гадоў, якім завяршылася Інфлянцкая вайна. Іван IV адмаўляўся ад завяяваных інфлянцкіх земляў на карысць Рэчы Паспалітай, а Стэфан Баторый згадзіўся вывесці армію з тэрыторыі Маскоўскай дзяржавы. Падпісанне міру зафіксавала паражэнне Маскоўскага царства ў Інфлянцкай вайне. |
| 1582 г. | – у Кёнігсбергу выдадзена *«Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі»* Мацея Стрыйкоўскага, першае сістэматычнае апісанне гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. |

| | |
|---|---|
| жнівень 1583 г. | – *Плюскае перамір'е* (на рацэ Плюса) Маскоўскага княства са Швецыяй у Лівонскай вайне. Да шведаў перайшлі Ям, Капор'е, Івангарад і Карэла з уездамі. Перамір'ем было канчаткова зафіксавана паражэнне Маскоўскай дзяржавы ў Лівонскай вайне 1558–1583 гг. |
| 1587–1593 гг. | – пабудова ў г. Нясвіжы касцёла Божага Цела – першага касцёла ў стылі барока на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Пабудаваны італьянскім архітэктарам Я.М. Бернардоні. |
| 1587–1632 гг. | – княжанне ў Вялікім княстве Літоўскім Жыгімонта Вазы. Сын караля Швецыі Яна III Вазы. Зацвердзіў Статут ВКЛ 1588 г., падтрымаў Берасцейскую царкоўную ўнію 1596 г., падтрымліваў паходы Ілжэдзмітрыя I і Ілжэдзмітрыя II, ініцыятар войнаў Рэчы Паспалітай са Швецыяй за шведскі трон. |
| 28 студзеня 1588 г. | – прыняцце Трэцяга Статута Вялікага Княства Літоўскага. |
| 1589 г. | – утварэнне маскоўскай патрыярхіі. |
| 1595–1596 гг. | – казацкія выступленні пад кіраўніцтвам Северына Налівайкі. |
| 25 снежня 1595 г. | – паражэнне казацкіх атрадаў пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі на Буйніцкім полі пад г. Магілёвам. |
| кастрычнік 1596 г. | – падпісанне Берасцейскай царкоўнай уніі. Утварэнне ўніяцкай (грэка-каталіцкай царквы). |
| 1597 г. | – атрыманне магдэбургскага права г. Віцебскам. |
| 1599 г. | – шведскі сейм скінуў польскага караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазу са шведскага прастолу. |
| 1600–1629 гг. | – вайна паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй. Завяршылася заключэннем перамір'я ў г. Альтмарку (цяпер г. Новы Тарг у Польшчы) на 6 гадоў. |

| | |
|---|---|
| 1604–1605 гг. | – паход Ілжедзмітрыя І на г. Маскву. |
| 20 чэрвеня 1605 г. | – уступленне Ілжедзмітрыя І у г. Маскву. |
| 27 ліпеня 1605 г. | – Ілжэдзмітрый І быў каранаваны ў г. Маскве як цар Дзмітрый І Іванавіч. |
| 27 верасня 1605 г. | – Кірхгольмская бітва ў час вайны Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600–1629 гг. каля вёскі Кірхгольм (цяпер г. Саласпілс, Латвія). Войска Рэчы Паспалітай на чале з гетманамі К. Радзівілам і Я. Хадкевічам разбіла шведскую армію Карла IX, якая страціла дзве трэці свайго складу. |
| 1606 г. | – выступленне жыхароў г. Магілёва на чале з Стахорам Мітковічам супраць гарадскога магістрата. |
| 1607–1610 гг. | – паход Ілжедзмітрыя ІІ на г. Маскву. |
| 1609–1618 гг. | – вайна паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай пасля заключэння Васілём Шуйскім ваеннага саюза са Швецыяй. |
| 1610 г. | – выступленне жыхароў г. Магілёва на чале з Іванам Харкавічам, Міхаілам Чабатаром, Лаўрам Міхайлавічам, Мікітай Мількавічам і Гаўрылам Іванавічам супраць гарадскога магістрата. |
| 24 чэрвеня 1610 г. | – войска Рэчы Паспалітай пад камандаваннем гетмана Станіслава Жалкеўскага нанесла паражэнне расійска-шведскаму войску каля вёскі Клушына. |
| верасень 1610 г. | – войскі Рэчы Паспалітай занялі г. Маскву, рускія баяры абралі царом сына Жыгімонта Вазы Уладзіслава IV. |
| сакавік 1611 г. | – стварэнне ў Маскоўскай дзяржаве першага народнага апалчэння. |
| 1612 г. | – фарміраванне ў Маскоўскай дзяржаве другога народнага апалчэння на чале з грамадзянінам Кузьмой Мініным і князем Дзмітрыем Пажарскім. |
| 1612–1820 гг. | – дзейнасць аршанскага езуіцкага калегіума. |

| | |
|---|---|
| 1613–1645 гг. | – праўленне ў Маскоўскай дзяржаве Міхаіла Фёдаравіча Раманава, заснавальніка дынастыі Раманавых. |
| 1615 г. | – выступленне жыхароў г. Мазыра, незадаволеных дзейнасцю мясцовага старасты. |
| 1615 г. | – дзейнасць друкарні ў мястэчку Бялынічы |
| 1616–1773 гг. | – дзейнасць друкарні ў г. Магілёве. |
| 1617 г. | – заснаванне князем Янушам Радзівілам кальвініснцкай гімназіі ў г. Слуцку. Праіснавала да 1918 г. |
| 1618 г. | – *Дэўлінскае пагадненне* на 14,5 гадоў у выніку завяршэння вайны паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай 1609–1618 гг. Да Рэчы Паспалітай адышлі г. Смаленск і Чарнігава-Северскія землі. |
| 1619 г. | – Мялецій Сматрыцкі ў мястэчку Еўе каля г. Вільні выдаў кнігу «Граматыкі славенскія...». |
| 1622 г. | – падпісанне перамір'я магнатаў ВКЛ са Швецыяй. |
| 12 лістапада 1623 г. | – выступленне жыхароў г. Віцебска супраць уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча, забойства апошняга. |
| 1629 г. | – перамір'е паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй у г. Альтмарку (цяпер г. Новы Тарг у Польшчы) на 6 гадоў. |
| 1629–1680 гг. | – жыццё і дзейнасць Сімяона Полацкага. |
| 1630–1650-я гг. | – дзейнасць друкарні ў мястэчку Куцейна. |
| 1632 г. | – кіеўскім мітрапалітам прызначаны Пётр Магіла. |
| 1632–1634 гг. | – вайна паміж Маскоўскім княствам і Рэччу Паспалітай (Смаленская вайна). Завяршылася ў 1634 г. *Палянаўскім мірам* (у вёсцы Сямлёва на рацэ Палянаўка) тэрмінам на 20 гадоў. Уладзіслаў IV за выкуп адмаўляўся ад сваіх правоў на маскоўскі прастол і тытул. |

| | |
|---|---|
| 1632–1648 гг. | – княжанне Уладзіслава Вазы (у Польшчы – Уладзіслаў IV Ваза). Сын Жыгімонта Вазы. Вярнуў у склад Вялікага Княства Літоўскага г. Смаленск, працягваў барацьбу за шведскі трон. |
| каля 1634–1689 гг. | – жыццё і дзейнасць Казіміра Лышчынскага – беларускага мысліцеля, грамадска-палітычнага дзеяча і педагога, аўтара рукапіснага трактата «Аб неіснаванні Бога». |
| 1635 г. | – дзейнасць друкарні ў мястэчку Буйнічы. |
| 1645–1676 гг. | – гады праўлення ў Маскоўскай дзяржаве Аляксея Міхайлавіча Раманава (Цішайшага). |

# VII. Беларусь у другой палове XVII – першай палове XVIII ст.

| | |
|---|---|
| 1648 г. | – колькасць насельніцтва Беларусі склала 3 млн. 700 тыс. чалавек. |
| 1648–1668 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім Яна Казіміра (у Польшчы – Ян II Казімір Ваза). Сын Жыгімонта Вазы. |
| 1648–1651 гг. | – казацка-сялянская вайна ў Беларусі. |
| 31 ліпеня 1649 г. | – першая Лоеўская бітва – войска пад камандаваннем Януша Радзівіла разбіла казацкія атрады пад камандаваннем Міхайлы Крычэўскага. |
| з 1650-х гадоў. | *– у паўночных раёнах Беларусі з’явілася вялікая група рускіх старавераў.* |
| 1650 г. | – колькасць насельніцтва Беларусі склала 2 млн. 876 тыс. чалавек. |
| 1650 г. | – выйшла кніга Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі». |
| 1651 г. | – Белацаркоўскі дагавор паміж казакамі і Рэччу Паспалітай. |
| каля 1651–1714 гг. | – жыццё і дзейнасць Іллі Капіевіча. |
| 1652–1764 гг. | – з 55 агульнадзяржаўных сеймаў, якія прайшлі ў гэтыя гады, 48 былі сарваны. |

| | |
|---|---|
| 1653 г. | – земскі сабор у Маскве прыняў рашэнне ўключыць Левабярэжную Украіну ў склад Расіі. |
| 8 студзеня 1654 г. | – Пераяслаўская Рада зацвердзіла пераход Левабярэжнай Украіны ў падданства да рускага цара Аляксея Міхайлавіча. |
| 1654–1667 гг. | – вайна паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай за Беларусь. |
| 31 ліпеня 1655 г. | – рускія войскі ўступілі ў г. Вільню. |
| 1655 г. | – Варшаўскі сейм забараніў польскім воінскім часцям пераходзіць без спецыяльнага дазволу межы ВКЛ. |
| 1655–1660 гг. | – першая Паўночная вайна паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай. Завяршылася Аліўскім мірам 1660 г. Ян Казімір адмовіўся ад прэтэнзій на шведскі трон, а Швецыя захавала за сабой землі на поўнач ад р. Заходняй Дзвіны. |
| кастрычнік 1655 г. | – Кейданская ўнія. Кальвіністы Януш і Багуслаў Радзівілы прапанавалі заключыць унію Вялікага Княства Літоўскага са шведскім каралём, якая прадугледжвала аўтаномію ВКЛ пад кантролем Швецыі. Акт уніі падпісала 1172 шляхціца. |
| 1658 г. | – сейм Рэчы Паспалітай пастанавіў выгнаць арыян за межы дзяржавы. |
| 1660 г. | – паражэнне рускага войска на чале з ваяводам І. Хаванскім у *Палонкаўскай бітве* пад г. Ляхавічамі і арміі на чале з ваяводам Ю. Далгарукім ў бітве на *рацэ Басі* пад г. Чавусамі. |
| лістапад 1661 г. | – паражэнне рускага войска на чале з ваяводам І. Хаванскім у *бітве пад Кушлікамі* каля г. Полацка. |
| лістапад 1661 г. | – здаўся войскам Рэчы Паспалітай рускі гарнізон у г. Вільні. |
| 30 студзеня 1667 г. | – Андросаўскае перамір’е тэрмінам на 13,5 гадоў. Завяршыла вайну 1654–1667 гг. Маскоўская дзяржава атрымала Смаленшчыну, Чарнігаўшчыну, Левабярэжную Украіну і г. Кіеў. |

| | |
|---|---|
| 1667 г. | – колькасць насельніцтва Беларусі склала 1 млн. 352 тыс. чалавек. |
| 1668 г. | – сейм Рэчы Паспалітай адыход ад каталіцтва прыраўняў да дзяржаўнага злачынства. |
| 1669–1673 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім Міхала Вішнявецкага. |
| 1673 г. | – прынята рашэнне, па якому кожны трэці сейм Рэчы Паспалітай павінен быў збірацца ў Вялікім Княстве Літоўскім у г. Гродне. |
| 1674–1696 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім Яна Сабескага (у Польшчы – Ян III Сабескі). |
| 1676–1682 гг. | – гады праўлення ў Маскоўскай дзяржаве Фёдара Аляксеевіча Раманава. |
| 1682–1696 гг. | – праўленне ў Маскоўскай дзяржаве Івана V Аляксеевіча (Раманава). |
| 1686 г. | – падпісанне ў г. Маскве «Вечнага міра», які зацвярджаў умовы Андросаўскага перамір'я. |
| 30 сакавіка 1689 г. | – пакаранне на смерць Казіміра Лышчынскага за напісанне кнігі «Аб неіснаванні Бога». |
| 1696 г. | – пастанова ўсеагульнай канфедэрацыі саслоўяў Рэчы Паспалітай аб вядзенні справаводства ў Вялікім Княстве Літоўскім на польскай мове. |
| 1697–1706; 1709–1733 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім Аўгуста Моцнага (у Польшчы – Аўгуст II Моцны). З саксонскай дынастыі Вецінаў. |
| 1697 г. | – прыняцце пастановы «Ураўнаванне правоў», паводле якой шляхта Вялікага Княства Літоўскага ўраўноўвалася ў правах з польскай. |
| 1697–1702 гг. | – феадальная (дамовая) вайна ў ВКЛ. |
| 1699 г. | – Аўгуст II Моцны, кароль Рэчы Паспалітай і саксонскі курфюрст, падпісаў з Расіяй тайны Праабражэнскі дагавор. |
| 18 лістапада 1700 г. | – бітва пад г. Алькенікамі, паражэнне Сапегаў ад «рэспубліканцаў» на чале з Вішнявецкімі і Агінскімі. |

| | |
|---|---|
| 1700 г. | – колькасць насельніцтва Беларусі склала 2 млн. 200 тыс. чалавек. |
| 1700–1721 гг. | – Паўночная вайна паміж Паўночным саюзам (Расія, Данія, Саксонія, Рэч Паспалітая) і Швецыяй. |
| 1701 г. | – саксонскае войска Аўгуста II разбіта шведамі пад г. Рыгай. |
| красавік 1702 г. | – шведскія войскі занялі гарады Вільню і Гродна. |
| май 1702 г. | – шведскія войскі занялі г. Варшаву. |
| вясна 1703 г. | – стварэнне ў г. Вільні *Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ*, якая падтрымала Аўгуста II і абвясціла саюз з Расіяй. |
| ліпень 1704 г. | – *Варшаўская канфедэрацыя* выбрала каралём Рэчы Паспалітай пазнанскага ваяводу Станіслава Ляшчынскага. Выступалі за саюз са Швецыяй. |
| жнівень 1704 г. | – прыхільнікі Аўгуста II, аб'яднаныя ў *Сандамірскую канфедэрацыю*, падпісалі *Нарвенскі саюз* з Расіяй, па якому яна атрымала права весці ваенныя дзеянні на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Выступалі за вайну са Швецыяй. |
| 1704–1709, 1733 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім Станіслава Ляшчынскага, адначасова польскі кароль. |
| 1705 г. | – расійская армія А. Рапніна заняла г. Гродна. |
| лета 1705 г. | – у Полацкім Сафійскім саборы пры непасрэдным удзеле Пятра I было забіта некалькі манахаў базыльянскага ордэна. |
| люты-май 1706 г. | – шведы спалілі гарады Карэлічы і Мір, разрабавалі гарады Навагрудак, Слонім, Клецк, Слуцк, Пінск, Кобрын, пасля аблогі занялі г. Ляхавічы і г. Нясвіж. |
| 1706 г. | – Альтранштацкі мір паміж Карлам XII і Аўгустам II. Аўгуст II адмовіўся ад кароны Рэчы Паспалітай на карысць Станіслава Ляшчынскага і ад саюза з Расіяй, абавязаўся выплаціць вялікую кантрыбуцыю шведам. |

| | |
|---|---|
| 1707 г. | – сустрэча з Пятром I у г. Львове прыхільнікаў Сандамірскай і Віленскай канфедэрацый, якія пацвердзілі саюз Рэчы Паспалітай з Расіяй. |
| 3 ліпеня 1708 г. | – шведская армія Карла XII пад мястэчкам Галоўчын разбіла расійскі корпус А. Рапніна. |
| 7 ліпеня 1708 г. | – г. Магілёў заняты і разрабаваны шведскай арміяй Карла XII. |
| верасень 1708 г. | – г. Магілёў заняты расійскімі войскамі, зруйнаваны і спалены па загадзе Пятра I. |
| 28 верасня 1708 г. | – разгром расійскімі войскамі шведскага корпуса пад камандаваннем А. Левенгаўпта каля *вёскі Лясная* на Магілёўшчыне. |
| 28 чэрвеня 1709 г. | – паражэнне шведскай арміі Карла XII пад г. Палтавай. |
| 1710 г. | – сейм у г. Варшаве аднавіў Аўгуста II на прастоле і пацвердзіў «Вечны мір» 1686 г. |
| 1716 г. | – стварэнне *Віленскай канфедэрацыі.* Атрады канфедэратаў змагаліся з каралеўскімі і саксонскімі войскамі на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай. |
| 1717 г. | – колькасць насельніцтва Беларусі склала 1 млн. 500 тыс. чалавек. |
| 1 лютага 1717 г. | – першы «нямы сейм» у Рэчы Паспалітай (Варшаўскі). Практычна пагадзіўся з пратэктаратам Расіі над Рэччу Паспалітай. Кароль павінен быў вывесці з Рэчы Паспалітай саксонскае войска, а шляхта – распусціць канфедэрацыі. |
| 1717 г. | – пачатак дзейнасці Налібоцкай шкляной мануфактуры Ганны Радзівіл. |
| 1717–1795 гг. | – жыццё і дзейнасць Георгія Каніскага, праваслаўнага царкоўнага і грамадскага дзеяча, пісьменніка. |
| 1719 г. | – Аўстрыя, Саксонія, Прусія падрыхтавалі план падзелу Рэчы Паспалітай. Пётр I яго не падтрымаў. |

| | |
|---|---|
| 1720-я гг. | – пашырэнне на тэрыторыі Беларусі піярскіх школ (калегіумаў). |
| 1721 г. | – завяршэнне Паўночнай вайны, *Ніштацкі мір* паміж Расіяй і Швецыяй. Расія атрымала выхад да Балтыйскага мора. Рэч Паспалітую на перагаворы не запрасілі. |
| 1726 г. | – пачатак будаўніцтва Гродзенскага Новага замка – каралеўскай рэзідэнцыі і месца пасяджэння сеймаў Рэчы Паспалітай. |
| 1729 г. | – падпісанне міра паміж Швецыяй і Саксоніяй. |
| верасень 1733 г. | – абранне на Варшаўскім сейме каралём і вялікім князем Станіслава Ляшчынскага. Пасля ўвядзення ў г. Варшаву 70-тысячнага расійскага войска С. Ляшчынскі ўцёк у г. Гданьск. Расія прымусіла шляхту выбраць каралём і вялікім князем Фрыдрыха Аўгуста, сына Аўгуста Моцнага, які ўвайшоў у гісторыю Рэчы Паспалітай як Аўгуст III. |
| 1733 г. | – падпісанне міра паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай. |
| 1733–1739 гг. | – вайна за «Польскую спадчыну». |
| 1733–1763 гг. | – княжанне ў Вялікім Княстве Літоўскім Аўгуста III, адначасова польскі кароль. |
| 1730-я гг. | – афармленне архітэктурнага стылю «*віленскае барока*». Яго распрацаваў архітэктар Ян Глаўбіц. |
| 1736–1844 гг. | – дзейнасць Слуцкай мануфактуры шаўковых паясоў. Заснавальнік Міхал Казімір Радзівіл (Рыбанька). |
| 1737–1846 гг. | – дзейнасць Урэцкай люстэркавай мануфактуры, заснаванай Ганнай Радзівіл. |
| 1738 г. | – завяршэнне вайны за «Польскую спадчыну» – *Венскі мір* паміж Аўстрыяй і Францыяй, да якога ў 1739 г. далучыліся Расія і Рэч Паспалітая. |
| 1740–1744 гг. | – паўстанне сялян у Крычаўскім старостве пад кіраўніцтвам Васіля Вашчылы. |

| | |
|---|---|
| 1746–1817 гг. | – жыццё і дзейнасць Андрэя Тадэвуша Банавентура Касцюшкі. |

# VIII. Беларусь у другой палове XVIII ст.

| | |
|---|---|
| 1752 – 1867 гг. | – дзейнасць Нясвіжскай суконнай мануфактуры, заснаванай Міхалам Казімірам Радзівілам (Рыбанькам). |
| 1754–1756 гг. | – паўстанне сялян Камянецкай і Стрэшынскай воласцяў на Мазыршчыне. |
| 1760–1780-я гг. | – дзейнасць 21 каралеўскай мануфактуры ў г. Гродне, заснаваных Антоніем Тызенгаўзам. |
| 1761–1762 гг. | – праўленне ў Расійскай імперыі Пятра III (унука Пятра I). |
| 1761–1794 гг. | – жыццё і дзейнасць Якуба Ясінскага, кіраўніка паўстання 1794 г. у Літве і Беларусі. |
| 1762–1796 гг. | – праўленне ў Расійскай імперыі Кацярыны II (жонкі Пятра III). |
| 1764 г. | – сейм Рэчы Паспалітай ўстанавіў смяротнае пакаранне за змену каталіцкага веравызнання. |
| 1764–1795 гг. | – княжанне Станіслава Аўгуста Панятоўскага, апошняга вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага і караля Польшчы. |
| 1765 г. | – пачатак аграрнай рэформы Антонія Тызенгаўза ў каралеўскіх сталовых эканоміях. |
| 1765–1783 гг. | – будаўніцтва Агінскага канала, які злучыў басейн Нёмана і Дняпра. |
| 1766 г. | – увядзенне ў Рэчы Паспалітай адзіных мераў даўжыні, вагі, аб’ёму. |
| 1766 г. | – сейм Рэчы Паспалітай адмовіўся ўраўнаваць у правах дысідэнтаў з каталікамі. |
| 1767 г. | – утварэнне дысідэнцкіх канфедэрацый: праваслаўнай у г. Слуцку, пратэстанцкай у г. Торуні. |
| 1767 г. | – у г. Радаме ўтварылася прарасійская канфедэрацыя на чале з Каралем Станіславам Радзівілам (Пане Каханку). |

| | |
|---|---|
| 1768 г. | – Варшаўскі сейм выканаў патрабаванні Расіі і ўраўнаваў у правах праваслаўную і пратэстанцкую шляхту Рэчы Паспалітай з каталіцкай. |
| люты 1768 г. | – утварэнне антыдысідэнцкай Барскай канфедэрацыі. |
| верасень 1771 г. | – паражэнне канфедэрацкага войска на чале з Міхалам Казімірам Агінскім ад расійскага войска на чале з А. Суворавым каля мястэчка Сталавічы. |
| 1771 г. | – заснаванне Слонімскага тэатра Міхала Казіміра Агінскага. |

# IX. Беларусь на зыходзе феадалізму: канец XVIII – сярэдзіна XIX ст.

| | |
|---|---|
| 5 жніўня 1772 г. | – у г. Санкт-Пецярбургу падпісана канвенцыя аб першым падзеле Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй. Да Расійскай імперыі была далучана ўсходняя частка Беларусі. |
| 13 верасня 1772 г. | – шляхце было загадана падаць у губернскія гарады спісы з доказамі свайго дваранства, *першы разбор шляхты.* |
| 1772–1856 гг. | – існаванне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі *Беларускае генерал-губернатарства.* Складалася з ўсходніх губерняў Беларусі пасля далучэння яе тэрыторыі да Расійскай імперыі. |
| 1773–1794 гг. | – заснаванне і дзейнасць у Рэчы Паспалітай Адукацыйнай камісіі – першага ў Еўропе міністэрства народнай адукацыі. |
| 1773 г. | – расфарміраванне рымскім папам ордэна езуітаў. |
| люты 1774 г. | – даравальная грамата Кацярыны II на заснаванне Беларускай каталіцкай епархіі з цэнтрам у г. Магілёве. |

| | |
|---|---|
| 1775 г. | – з мэтай замацавання расійскага ўплыву на сейме Рэчы Паспалітай была створана *Пастаянная Рада*. |
| 1775 г. | – у г. Гродна закладзены батанічны сад – першы на тэрыторыі Беларусі. |
| 1775–1781 гг. | – заснаванне і дзейнасць у г. Гродна Вышэйшай медыцынскай акадэміі – першай медыцынскай навуковай установы на тэрыторыі Беларусі. |
| 1775–1784 гг. | – будаўніцтва Каралеўскага (Дняпроўска-Бугскага) канала, які злучыў р. Прыпяць з р. Заходні Буг. |
| май 1776 г. | – пачатак выдання «Газеты Гродзенскай» – першага перыядычнага выдання на тэрыторыі Беларусі. |
| верасень 1776 г. | – утварэнне Полацкай губерні. |
| 1776 г. | – пазбаўленне большасці гарадоў і мястэчак Беларусі магдэбургскага права (акрамя гарадоў Брэста, Ваўкавыска, Гродна, Ліды, Мазыра, Мінска, Навагрудка і Пінска). |
| 1778 г. | – заснаванне С. Г. Зорычам Шклоўскага шляхетнага вучылішча – першай расійскай ваеннай навучальнай установы на тэрыторыі Беларусі. |
| 1778–1800 гг. | – дзейнасць Шклоўскага прыгоннага тэатра графа С. Г. Зорыча. |
| 1779 г. | – Віленскі ўніверсітэт з 1779 г. да 1781 г. называўся Акадэміяй. |
| 1780 г. | – пачатак дзейнасці суконнай мануфатуры ва ўладанні Сапегаў Ружаны. |
| 1781 г. | – Віленскі ўніверсітэт стаў насіць назву Галоўная школа ВКЛ. |
| 1783–1941 гг. | – перыяд гаспадарчага выкарыстання Агінскага канала. |
| з 1784 г. | – перыяд гаспадарчага выкарыстання Дняпроўска-Бугскага канала. Рэканструяваны ў 1848 і 1940 гг. Выкарыстоўваецца для перавозкі на баржах разнастайных матэрыялаў. |

| | |
|---|---|
| 1785 г. | – пачатак будаўніцтва Гомельскага палаца – выдатнага помніка беларускага класіцызму. |
| 1788–1792 гг. | – Чатырохгадовы («Вялікі») сейм Рэчы Паспалітай. |
| 1790 г. | – беззямельная шляхта страціла права выбіраць на павятовых сейміках паслоў на агульнадзяржаўны сейм. |
| 1790 г. | – колькасць насельніцтва Беларусі склала 3 млн. 700 тыс. чалавек. |
| 3 мая 1791 г. | – прыняцце сеймам Канстытуцыі Рэчы Паспалітай (Урадавай Уставы). |
| кастрычнік 1791 г. | – прыняцце сеймам дакумента пад назвай *«Узаемнае заручэнне абодвух народаў»*, якім гарантавалася аднолькавая колькасць прадстаўнікоў Вялікага Княства Літоўскага і Кароны ва ўрадзе. |
| май-верасень 1792 г. | – стварэнне і дзейнасць Таргавіцкай канфедэрацыі, накіраванай супраць Канстытуцыі 3 мая. |
| 24 ліпеня 1792 г. | – Станіслаў Аўгуст Панятоўскі па патрабаванні Кацярыны II перайшоў на бок канфедэратаў. |
| красавік 1793 г. | – стварэнне Мінскага намесніцтва. |
| 1793 г. | – другі падзел Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй і Расіяй. Далучэнне цэнтральнай часткі Беларусі да Расійскай імперыі. |
| 17 чэрвеня – 23 лістапада 1793 г. | – другі «нямы сейм» у Рэчы Паспалітай (Гродзенскі) – надзвычайны, апошні сейм Рэчы Паспалітай. Скліканы для зацвярджэння руска-прускай канвенцыі ад 23 студзеня 1793 г. аб другім падзеле Рэчы Паспалітай. |
| 24 сакавіка – 16 лістапада 1794 г. | – нацыянальна-вызваленчае паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. |
| 23 красавіка 1794 г. | – паўстанцы ўзялі ўладу ў г. Вільні. |
| 30 красавіка 1794 г. | – *Найвышэйшая літоўская рада* прыняла зварот «Да земляробаў і люду вясковага». |

| | |
|---|---|
| 7 мая 1794 г. | – абвяшчэнне *Паланецкага ўніверсала,* які дазваляў сялянам атрымаць асабістую свабоду, пры ўмове, што яны разлічацца з землеўласнікамі і заплацяць дзяржаўныя падаткі. |
| 23 верасня 1794 г. | – падпісанне Кацярынай II ўказа аб увядзенні мяжы «яўрэйскай аселасці». |
| 17 верасня 1794 г. | – бітва каля *вёскі Крупчыцы* пад г. Кобрынам паўстанцкіх атрадаў пад кіраўніцтвам генерал-маёра К. Серакоўскага з расійскімі войскамі пад кіраўніцтвам А. Суворава. Паўстанцы былі вымушаны адступіць. |
| 10 кастрычніка 1794 г. | – бітва *пад Мацяёвіцамі*, паражэнне паўстанцаў. Т. Касцюшка трапіў у палон і быў вывезены ў Петрапаўлаўскую крэпасць г. Пецярбурга. |
| 4 лістапада 1794 г. | – расійскія войскі пад камандаваннем А. Суворава авалодалі прадмесцем г. Варшавы – Прагай. 6 лістапада 1794 г. г. Варшава капітулявала. |
| 1794 г. | – указ імператрыцы Кацярыны II аб пераводзе ўніятаў у праваслаўе. |
| 1794–1912 гг. | – існаванне Віленскага генерал-губернатарства, у склад якога ўваходзіла значная частка тэрыторыі Беларусі. |
| 1795 г. | – трэці падзел Рэчы Паспалітай паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй. Тэрыторыя Беларусі была поўнасцю ўключана ў склад Расійскай імперыі. |
| 5 лістапада 1795 г. | – адрачэнне апошняга караля польскага і вялікага князя літоўскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага ад трона. |
| снежань 1795 г. | – утварэнне Слонімскай губерні. |
| снежань 1796 г. | – утварэнне Беларускай і Літоўскай губерняў. |
| 1796–1797 гг. | – дзейнасць *Віленскай асацыяцыі* – тайнага патрыятычнага таварыства. |

| | |
|---|---|
| 1796–1801 гг. | – гады праўлення ў Расійскай імперыі Паўла І (сына Пятра ІІІ). |
| 1796–1803 гг. | – Галоўная Віленская школа – тагачасная назва Віленскага ўніверсітэта. |
| 1796–1840 гг. | – выданне газеты «Кур’ер Літоўскі» у г. Гродне (да 1797 г.) і ў г. Вільні. |
| 5 красавіка 1797 г. | – маніфест імператара Паўла І аб трохдзённай паншчыне. |
| 1797–1805 гг. | – будаўніцтва Бярэзінскага канала, які злучыў басейны рэк Дняпра і Заходняй Дзвіны. |

# ЗМЕСТ

Тэма 1. Уводзіны ў гісторыю Беларусі..........................................................3
Тэма 2. Першабытная эпоха на тэрыторыі Беларусі
(100–35 тыс. гадоў да н. э. – VIII ст. н. э.)...............................................7
Тэма 3. Раннефеадальныя дзяржаўныя ўтварэнні
на беларускіх землях (IX – першая палова XIII ст.) ...........................26
Тэма 4. Утварэнне і станаўленне Вялікага Княства Літоўскага
(другая палова XIII – XV ст.) ..................................................................46
Тэма 5. Беларусь у XVI – першай палове XVII ст. ...........................................74
Тэма 6. Беларусь у другой палове XVII – першай палове XVIII ст. .....88
Тэма 7. Беларусь у другой палове XVIII ст.................................................103

*Дадаткі*

I. Беларускія землі ў старажытныя часы. ..........................................122
II. Беларускія землі ў IV – IX стст.......................................................128
III. Беларускія землі ў канцы IX – сярэдзіне XIII ст. ..........................129
IV. Беларускія землі ў сярэдзіне XIII – XIV ст. ..................................138
V. Беларускія землі ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст.........................142
VI. Беларусь у сярэдзіне XVI – першай палове XVII ст.....................151
VII. Беларусь у другой палове XVII – першай палове XVIII ст........156
VIII. Беларусь у другой палове XVIII ст. .................................................164
IX. Беларусь на зыходзе феадалізму: канец XVIII –
сярэдзіна XIX ст.....................................................................................165

**Голубеў** В. Ф., Кітурка І. Ф.
Г62 Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / Валянцін Фёдаравіч Голубеў, Ірына Фёдараўна Кітурка. — Санкт-Пецярбург : «Неўскі прастор», 2014.— 170 с.
ISBN 978-5-94716-256-1

У вучэбным дапаможніку сцісла і паслядоўна выкладзены асноўныя моманты гісторыі Беларусі ад старажытнасці да падзелаў Рэчы Паспалітай, да ўключэння беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі. У канцы кожнай тэмы раскрываюцца асноўныя тэрміны, даецца храналогія падзей, вызначаюцца кантрольныя пытанні і заданні.

Дапаможнікам могуць карыстацца ўсе, хто цікавіцца гісторыяй сваёй краіны.

УДК 947.6(075)
ББК 63.3(4Беи)

Голубеў Валянцін Фёдаравіч
Кітурка Ірына Фёдараўна

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

*ад старажытнасці да канца XVIII ст.*

Дызайн вокладкі *А. Сычоў*
Вёрстка *Зм. Колас*

Падпісана да друку 20.10.2014. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк рызаграфічны.
Ул.-выд. арк. 7,67. Ум. друк. арк. 10,00.
Наклад 300 асобнікаў.

Выдавецтва ТАА «Неўскі прастор»
194100, г. Санкт-Пецярбург, пр. Марыса Тарэза, 6.

Надрукавана ў друкарні «Т-Сервіс», г. Масква.